Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛІСТАПАДА 2013 г. ЧАЦВЕР № 219 (27584) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Найвялікшая бяда для дзіцяці – стаць сіратой пры жывых бацьках…

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр МУХА, фінансавы аналітык:

«Праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год накіраваны на забеспячэнне ўстойлівага развіцця нацыянальнай эканомікі. Іншымі словамі, гаворка ідзе аб захаванні станоўчых тэмпаў эканамічнага росту пры адначасовым забеспячэнні фінансавай стабільнасці ў краіне. Пры гэтым рэалізацыя запланаваных мерапрыемстваў дасць магчымасць пераразмеркаваць рэсурсы (у тым ліку працоўныя рэсурсы) на карысць больш эфектыўных праектаў і вытворчасцяў, што будзе спрыяць павышэнню прадукцыйнасці працы і канкурэнтаздольнасці беларускіх кампаній на ўнутраным і знешнім рынках. У гэтым кантэксце варта станоўча ацэньваць запланаванае павелічэнне прытоку прамых замежных інвестыцый, паколькі прыход замежных інвестараў будзе спрыяць пашырэнню рынкаў збыту, укараненню новых тэхналогій і ў цэлым інтэграцыі беларускай эканомікі ў сусветную».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.11.2013 г.

Долар ЗША	9290,00	■
Еўра	12580,00	▲
Рас. руб.	283,50	▲
Укр. грыўня	1137,01	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 8°
Віцебск	+ 8°
Гомель	+ 10°
Гродна	+ 8°
Магілёў	+ 10°
Мінск	+ 10°

ISSN 1990 - 763X

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НЕЗАВОБЛАЧНАЯ МАРА

Жыхар вёскі Сакаўшчына Яўген РЫНДЗЕВІЧ стаў першым на Валожыншчыне, хто здзейсніў мару ўзняцца ў неба пры дапамозе мотапараплана.

Тры гады таму гэты вясковец праз інтэрнэт даведаўся, што ў Беларусі існуе федэрацыя, якая аб'ядноўвае захопленых небам людзей, дапамагае займець уласны лятальны апарат і авалодаць азамі лётнага майстэрства. У ёй сустрэў гэткіх, як сам, апантаных небам. Як добраму спецыялісту-механіку, яму не цяжка было давесці параплан да дасканаласці.

— Бачыць прыгажосць прыроды з вышыні — гэта непараўнальна з тым, што відаць нам з зямлі, — кажа валожынскі пілот. — А з парапланам зрабіць гэта вельмі проста.

ПАЧАЎСЯ АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ Ў АЗЕРБАЙДЖАН

Як паведамлялася, праграмай візіту запланаваны перагаворы кіраўніка беларускай дзяржавы з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым у фармаце сам-насам, а затым у пашыраным складзе.

Па выніках перагавораў прадугледжваецца падпісанне двухбаковых дакументаў аб супрацоўніцтве ў розных сферах.

Учора прэзідэнты Беларусі і Азербайджана Аляксандр Лукашэнка і Ільхам Аліеў прынялі ўдзел у цырымоніі адкрыцця новага будынка Пасольства Беларусі ў Азербайджане, перадае карэспандэнт **БЕЛТА**. Прэзідэнты агледзелі памяшканні новага будынка і высадзілі каля яго два аліўкавыя дрэвы. Кіраўнікі дзяржаў таксама наведалі экспазіцыю беларускай тэхнікі, якая збіраецца на Гянджынскім аўтамабільным заводзе.

СНД: УЗГАДНІЦЬ СУМЕСНУЮ ПРАМЫСЛОВУЮ ПАЛІТЫКУ

Міхаіл Мясніковіч лічыць неабходнай выпрацоўку ў краінах СНД узгодненай прамысловай палітыкі

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч лічыць, што ў СНД наспела неабходнасць выпрацоўкі і правядзення ўзгодненай прамысловай палітыкі. Такое меркаванне ён выказаў учора, выступаючы на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД у Санкт-Пецярбургу, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Міхаіл Мясніковіч падвёў папярэднія вынікі старшынства Беларусі ў Садружнасці. Паводле слоў прэм'ера, для рэспублікі СНД застаецца важнейшай рэгіянальнай арганізацыяй, якая мае вялізны патэнцыял супрацоўніцтва ў эканамічнай, інвестыцыйнай, навуковай і іншых галінах.

СТАР. 2

■ Прыватная арэнда

ТАННЕЙ УЖО НЕ БУДЗЕ?

Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць павелічэнне цэннікаў да першых дзён студзеня яшчэ на 20—50 долараў

Нагадаю, што ў апошняй дэкадзе жніўня і ў верасні ў Мінску назіраўся моцны студэнцкі ажыятаж, які практычна цалкам «вымыў» усё бюджэтнае арэндnае жыллё ў горадзе. Цэннікі тады «зашкальвалі». Асобныя кліенты разлічвалі, што ў лістападзе цэны крыху знізяцца, аднак гэтага практычна не адбылося... Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.

Выбару і цяпер няма

Аднак сёння сітуацыя крыху змянілася, бо з рынку знікла вялікая колькасць менавіта нервовых кліентаў, якім арэндныя кватэры неабходна было знайсці амаль імгненна. Так, попыт крыху зменшыўся, аднак і прапановы больш не стала. Справа цяпер нават не ў колькасці памяшканняў, якія прапануюцца, а ў адсутнасці танных стандартных кватэр. Кліенты і ў лістападзе працягваюць заказваць у агенцтвах невялікае па плошчы жыллё па кошце 350-400 долараў. Аднак на рынку цяпер жылых памяшканняў па такіх цэнах ужо няма.

СТАР. 3

НА СТАРЫХ МАШЫНАХ МОЖНА ЗАРАБІЦЬ

Жыццёвы шлях кожнага аўтамабіля пачынаецца выездам з салона. Але, як правіла, дзесяцігоддзямі ў аднаго і таго ж уладальніка жалезны конь служыць рэдка. Праз некаторы час яго прадаюць — раз, другі, трэці... Год ад года выдаткі на падтрыманне старой аўтамашыны растуць. У рэшце рэшт настае момант, калі чарговага пакупніка знайсці не атрымліваецца з розных прычын. І тады гаспадар вырашае пазбавіцца ад непатрэбнага аўто найбольш лёгкім шляхам — проста кінуць яго ў якім-небудзь зацішным двары...

Аднак машына, бяпрэчна, з'яўляецца крыніцай павышанай небяспекі, у тым ліку і для экалогіі. Паступова з яе пачынаюць выцякаць вадкасці, якія забруджваюць дарожнае пакрыццё і зямлю...

— Не так даўно я праехаўся па сталічных дварах, — гаворыць **генеральны дырэктар холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс» Міхаіл СУПРУНОВІЧ.** — І заўважыў, што аўтамабілі, на якіх відавочна не ездзілі ўжо працяглы час, іржавеюць на газонах, дзіцячых пляцоўках, тратуарах. Яны не толькі псуюць знешні выгляд тэрыторыі, але і замінаюць жыхарам. А хутка прыйдзе зіма, і такія «падснежнікі» пачнуць ускладняць працу ўборачнай тэхнікі.

СТАР. 4

СНД: УЗГАДНІЦЬ СУМЕСНУЮ ПРАМЫСЛОВУЮ ПАЛІТЫКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Пашырэнне ўзаемадзеяння дзяржаў СНД і павышэнне жыццёвага ўзроўню народаў нашых краін з'яўляюцца мэтай старшынства Рэспублікі Беларусь у Садружнасці ў 2013 годзе», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на некаторыя моманты, якія патрабуюць дадатковай увагі. Атрыманы за год старшынства ў СНД вопыт даў магчымасць Беларусі пановаму паглядзець на шэраг пытанняў. У прыватнасці, на думку кіраўніка беларускага ўрада, краінам СНД варта больш эфектыўна выкарыстоўваць інтэграцыйны патэнцыял, выходзіць на стварэнне сумесных вытворчасцяў. «Па сутнасці, я кажу пра наспелую неабходнасць выпрацоўкі і правядзення ў нашых краінах узгодненай, скаардынаванай прамысловай палітыкі, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Нараўне з работай па прыцягненні замежных інвестыцый у нацыянальныя эканомікі нам неабходна ўзмацніць работу па стварэнні камфортных умоў для прыцягнення ў розныя галіны фінансавых рэсурсаў, якія ёсць у нашых дзяржавах». У цэлым краіны — удзельніцы СНД павінны больш увагі надаваць абароне агульнага ўнутранага рынку, лічыць беларускі прэм'ер.

«Вырашэнне гэтых пытанняў дасць магчымасць умацаваць эканомікі краін Садружнасці», — рэзюмаваў Міхаіл Мясніковіч.

«ЗРЫВАЎ» БОЛЬШ НЕ ПРАДБАЧЫЦЦА

Здаецца, што зараз тэрыторыя адкрытага акцыянернага таварыства «Рэчыцадрэў» ператварылася ў вялікую новабудоўлю. Насамрэч, уздоўж ракі Днепр, дзе знаходзіцца прадпрыемства, тэрмінова ліквідуецца велізарная звалка, якая тут стваралася на працягу ўсяго папярэдняга існавання прадпрыемства — а гэта больш за 100 гадоў. Самазвалы рухаюцца, смецце дзе гарыць, дзе вывозіцца, працуюць грэйдары, экскаватары і іншая тэхніка. Добраўпарадкаваннем тэрыторыі адначасова занята больш за тысячу чалавек — прадстаўнікі самых розных прафесій. У выхадны дзень сюды прыйшло працаваць шмат моладзі — навучэнцаў рэчыцкіх устаноў адукацыі. Здаецца, «аўгіевы стайні» прадпрыемства толькі супольна і можна выграбці. Да прыбірання тэрыторыі далучыліся не толькі рэчыцкія мясцовыя ўлады, але і Гомельскі аблвыканкам.

Практычна ўсю тэрыторыю ААТ «Рэчыцадрэў» уздоўж ракі пешкі прайшлі члены міжведамаснай працоўнай групы па праверцы выканання праграмы мадэрнізацыі дрэваапрацоўчай галіны на чале са старшынёй Камітэта дзяржкантролю Беларусі Аляксандрам Якабсонам:

— Гэта першы выпадак, калі мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання масава і вялікімі сіламі, разам з прадпрыемствамі, якія мадэрнізуюцца, далучыліся да рэалізацыі гэтых праектаў. У большай ступені — гэта добраўпарадкаванне тэрыторыі. Тут прадэманстраваны добры падыход, і ўжо можна бачыць вынікі. Усё за гэтыя дні змянілася ў лепшы бок. Аказваецца, гэта не такі ўжо непад'ёмны кавалак працы — навесці парадак. Проста трэба за гэтую работу ўзяцца ўсім разам.

Кіраўнік рэспубліканскага кантрольнага ведамства падкрэсліў, што праца па навядзенні парадку павінна праводзіцца сістэмна. Гэтаму пытанню павінны больш увагі надаваць санітарныя і пажарныя службы, прыродаахоўныя ведамствы. Што тычыцца будаўніцтва новых аб'ектаў на прадпрыемствах дрэваапрацоўчай галіны Беларусі, ніякіх пераносаў тэрмінаў іх уводу больш не будзе, заявіў Аляксандр Якабсон на выязным пасяджэнні ў Рэчыцы пасля знаёмства з ходам рэалізацыі інвестпраектаў у ААТ «Гомельдрэў» і «Рэчыцадрэў»:

— Сітуацыя, як і паўсюль у рэспубліцы, — няроўная. Ёсць праблемы, ёсць адставанні. Члены рабочай групы на свае вочы пабачылі, і іх заверылі кіраўнікі: усё, што вызначана, будзе у поўнай меры рэалізавана. Абодва прадпрыемствы стратныя. У іх не хапае абаротных сродкаў, ім патрэбны грошы. Яны з'явяцца толькі тады, калі запрацуе вытворчасць. І таму яны самі імкнуцца пачаць працаваць. Я адзначыў, што трэба было нашаму камітэту дзяржкантролю раней «загнаць вожыка пад скуру», каб разгарнуць гэтую работу. Але ж зараз думаю, што на Гомельшчыне больш зрываў не будзе.

Такім чынам, у ААТ «Рэчыцадрэў» у снежні будзе ўведзена ў строй вытворчасць драўняна-стружкавай пліты. Гэта дазволіць пачаць выкарыстоўваць сучасную лінію па ламініраванні гэтай пліты, якая была зманціравана раней. Да сярэдзіны 2014 года пачне працаваць мадэрнізаваны ўчастак вытворчасці фанеры, а да канца года — завод смол. Старшыня КДК Аляксандр Якабсон падкрэсліў таксама, што інфармацыя, атрыманая падчас паездак міжведамаснай працоўнай групы, дае нагоду больш пільна вывучыць дзейнасць некаторых праектных і падрадных арганізацый:

— Мы комплексна паглядзім на іх працу і выйдзем з пазапланавай праверкай у некаторыя праектныя арганізацыі, каб на іх прыкладзе паказаць, дзе слабыя месцы і чаму яны могуць сабе дазволіць так працаваць. Праблем яшчэ вельмі шмат — паміж праекціроўшчыкамі і будаўнікамі, падрадчыкамі і заказчыкамі. Але ж гэта рабочыя пытанні, якія могуць быць ва ўстаноўленыя тэрміны вырашаны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЕКАБІНЕТНЫ МАНІТОРЫНГ

У Віцебску адбылася нарада міжведамаснай рабочай групы, створанай па даручэнні Прэзідэнта, якая займаецца маніторынгам за ходам рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на прадпрыемствах дрэваапрацоўкі. Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь, асабіста азнаёміўся з тым, як ідуць справы на ААТ «Віцебскдрэў».

Тут інвестыцыйны праект коштам 75 мільёнаў еўра рэалізуецца, пачынаючы з 2011 года. Вялікія грошы ўкладваюцца для засваення вытворчасці пліт сярэдняй, высокай шчыльнасці і ламініраваных падлогавых пакрыццяў. Згодна з планам, праект трэба было рэалізаваць на працягу 25-26 месяцаў. Але запуск новай вытворчасці неаднаразова пераносіўся.

Каля гадзіны Аляксандр Якабсон, а таксама асобы, якія былі запрошаны на нараду, аглядалі тэрыторыю прадпрыемства. У тым ліку хадзілі па шпалах чыгункі, неаднаразова патрапіўшы ў бруд. Гутарылі з рабочымі. Дарэчы, высокакваліфікаваныя спецыялісты на гэтым прадпрыемстве ў дэфіцыце.

— Працягваецца маніторынг мадэрнізацыі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў краіны. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што на прадпрыемствах выяўляецца шмат парушэнняў. У частцы навядзення парадку на віцебскім прадпрыемстве зроблена дастаткова шмат. Але да неабходнага ўзроўню яшчэ далёка. Хаця ёсць рацыянальнае зерне ў кіраўнікоў, і думаю, з гэтай задачай яны могуць справіцца. Што тычыцца рэалізацыі інавацыйнага праекта, будзе дадзена ацэнка дзеянням службовых асоб, — падвёў вынікі «экскурсіі» кіраўнік дзяржкантролю.

Але не можа не здзіўляць наступнае: чаму адзін з цэхаў гатовы да эксплуатацыі ўжо 1,5 года, абсталяванне набылі за валюту, але выпусцілі толькі пробную партыю прадукцыі?

— На жаль, гэта не адзінкавы факт, тое ж самае і на прадпрыемстве «Рэчыцадрэў», — дадаў Аляксандр Якабсон.

Дарэчы, кошт рэалізацыі праекта, у параўнанні з першапачатковым, падаражэў за гэты час амаль у два разы.

Высветлілася, што будаўнікі на «Віцебскдрэве» працавалі доўгі час толькі ў адну змену, усяго да трыццаці чалавек. Генеральны падрадчык — мясцовы будаўнічы трэст № 9 — быў у такім жа статусе яшчэ на прыкладна 50(!) новабудоўлях. Правяраючых турбуе і недахоп на прадпрыемстве кадраў: каму даверыць сучаснае абсталяванне? Паводле інфармацыі на пачатак лістапада, у штаце новай вытворчасці толькі 22% ад неабходнай колькасці работнікаў. Не хапае інжынерна-тэхнічных спецыялістаў і высокакваліфікаванага персаналу па абслугоўванні абсталявання. Будуць праблемы і са збытам новай прадукцыі, бо аналагічныя вытворчасці функцыянуюць у Расіі, Еўропе. Таму збыт павінен быць адпрацаваны як мага раней: заключаны дагаворы, вызначаны аб'ёмы паставак. Але сёння ёсць толькі папярэднія дамоўленасці, а патэнцыяльныя пакупнікі чакаюць узораў прадукцыі, якіх яшчэ няма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АНТЫКРЫЗІСНАЕ КІРАВАННЕ ДЛЯ МАДЭРНІЗАЦЫІ

«Антыкрызіснае кіраванне можа стаць асновай беларускай школы менеджменту», — упэўнены намеснік старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання спецыялістаў па антыкрызісным кіраванні і банкруцтве Ігар Ашуркевіч.

Днямі ў Мінску абмяркоўвалі ўдасканаленне працэдур антыкрызіснага кіравання і банкруцтва. Рабілі гэта не толькі знакамітыя эканамісты — прадстаўнікі Міністэрства эканомікі, Вышэйшага Гаспадарчага Суда, прафесуры Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце і прыватных кампаній, але і студэнты і магістранты беларускіх вышэйшых навучальных устаноў.

Падставай для дыскусіі стаў фінал і падвядзенне вынікаў конкурсу пісьмовых работ «Антыкрызіснае кіраванне і банкруцтва», які праводзіцца ў Мінску ўжо ў шосты раз. Студэнты ўсіх эканамічных і юрыдычных факультэтаў ВНУ Беларусі мелі магчымасць накіраваць свае работы на суд аўтарытэтнага журы, прайсці ў другі этап і пазмагацца за грашовыя прызы, падарункавыя сертыфікаты і стажыроўку ў Міністэрстве эканомікі і юрыдычнай групе «Саветнік».

На конкурс былі пададзены 32 работы, з якіх сем адабраны для фіналу: па адной з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны і Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.Куляшова, дзве з Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках і тры — з навучальных устаноў горада Мінска.

Нягледзячы на вузкую, здавалася б, спецыялізацыю конкурсу — банкруцтва і антыкрызіснае кіраванне, спектр тэм, якія распрацоўвалі яго ўдзельнікі, уражваў. Тут і пытанні рэйдарства, і рэцэпты павышэння эканамічнай эфектыўнасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, дыягностыка рызык банкруцтва і іншыя аспекты эканамічнага жыцця краіны. А пераможцам конкурсу наогул стала, па сутнасці, інавацыйная распрацоўка Антона Вагіна, магістранта Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Яго даследаванне тычылася ўвядзення ў Беларусі інстытута банкруцтва фізічных асоб. На працягу некалькіх гадоў малады чалавек удзельнічаў у конкурсе і вось, нарэшце, атрымаў заслужаную перамогу.

Другое месца заняла студэнтка Мінскага філіяла Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі Любоў Астравух, якая прадставіла працу «Механізмы абароны выплаты заработнай платы пры банкруцтве прадпрыемстваў». Трэцяе месца падзялілі студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Святлана Кунцэвіч з працай аб субсідыярнай адказнасці ўдзельнікаў і іншых асоб пры працэдуры банкруцтва і магістрант Гомельскага дзяржуніверсітэта Наталля Клімава, якая прапанавала свой погляд на ўдасканаленне дыягностыкі рызык банкруцтва прадпрыемстваў.

Варта адзначыць, што ў журы, якое ацэньвала навуковыя распрацоўкі, былі дырэктар Дэпартамента па санацыі і банкруцтве Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Міранічэнка, начальнік аддзела карпаратыўных адносін і банкруцтва Вышэйшага Гаспадарчага Суда Ірына Іванова і шэраг іншых выдатных спецыялістаў. Таму ў тым, што ў аснове адбору работ ляжаў дзяржаўны падыход, сумнявацца не прыходзіцца.

Тэматыка конкурсу даволі спецыфічная. Чаму антыкрызіснае кіраванне і банкруцтва такія актуальныя для сучаснай Беларусі і якую карысць эканоміцы краіны могуць прынесці антыкрызісныя кіраўнікі? Аб гэтым мы запыталіся ў **арганізатара конкурсу, намесніка старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання спецыялістаў па антыкрызісным кіраванні і банкруцтве, кіраўніка юрыдычнай групы «Саветнік» Ігара АШУРКЕВІЧА.**

— Ігар Мікалаевіч, адкуль такая ўвага да праблем эканамічнай неплацежаздольнасці? Няўжо ў беларускай эканоміцы ўсё так няпроста?

— Зусім не. Нягледзячы на «грознае» гучанне — пытанні антыкрызіснага кіравання і нават банкруцтва, гэта руціна эканамічнага жыцця ў любой, нават самай паспяховай, дзяржаве. Бо развіццё рынкавай эканомікі заснавана на здольнасці прадпрымальнікаў браць на сябе пэўныя рызыкі і на канкурэнцыі з іншымі суб'ектамі рынку. А гэта значыць, што хто-небудзь з іх пастаянна пралічваецца, прайграе ў канкурэнцыі, губляе долю на рынку і, як вынік, — губляе эканамічную плацежаздольнасць. У такім выпадку найлепшы выхад са становішча — прайсці праз працэдуру аздараўлення альбо, калі магчымасцяў выратаваць прадпрыемства няма, банкруцтва.

Сэнс гэтых працэдур у тым, каб максімальна абараніць крэдытораў кампаніі, забяспечыць усю магчымую і справядлівую кампенсацыю па даўгах прадпрыемства. Адначасова абараняецца і сам даўжнік, працоўны калектыў, яго кіраўніцтва, калі банкруцтва не звязана са злаўмыснымі намерамі апошняга.

— Чаму вы лічыце неабходным прыцягваць да гэтай складанай сферы менавіта маладых юрыстаў?

— Па-першае, таму, што сёння ў Беларусі ёсць востры дэфіцыт кваліфікаваных спецыялістаў такога профілю. Аднак іх падрыхтоўка пакуль не ажыццяўляецца ніводнай дзяржаўнай ВНУ краіны. Таму адзіны выхад са становішча — у працэсе вучобы прывабліваць адпаведнай праблематыкай будучых юрыстаў, арыентаваць іх на кар'еру антыкрызіснага кіраўніка.

Па-другое, у больш шырокім кантэксце трэба разумець, што перад краінай востра стаіць пытанне мадэрнізацыі эканомікі. І мы бачым, што яго рашэнне сутыкаецца з праблемай нізкай якасці кіравання на прадпрыемствах. Я ўпэўнены, што прафесіяналізацыя маладых спецыялістаў у такой складанай і практыка-арыентаванай вобласці, як антыкрызіснае кіраванне, дасць магчымасць вырашыць гэтую праблему.

— Як антыкрызіснае кіраванне звязана з пытаннямі мадэрнізацыі і кіравання інвестыцыямі?

— Самым непасрэдным чынам! Як правіла, дзейнасць антыкрызіснага кіраўніка суседнічае з інвестыцыйнай дзейнасцю. Менавіта так працуе наша кампанія. Вывучаючы канкрэтную практыку банкруцтваў і санацыі, малады чалавек з першых дзён пачынае разумець найбольш тыповыя памылкі менеджменту і чаго каштуе іх выпраўленне.

Таму я спадзяюся, што ў бліжэйшы час у Беларусі мы будзем назіраць павышаную ўвагу да антыкрызіснага кіравання. І гэта выявіцца не толькі ў пашырэнні кола ўдзельнікаў нашага конкурсу, але і ў прызнанні неабходнасці гэтай спецыяльнасці для нашай вышэйшай адукацыі. Менавіта антыкрызіснае кіраванне можа стаць асновай беларускай школы менеджменту.

Падрыхтаваў Юрый ЦАРЫК.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ НА МАНЕТАХ

Сёння Нацыянальны банк уводзіць у абарачэнне памятныя манеты «Слуцкія паясы. Меткі» і «Слуцкія паясы. Калекцыянаванне» серыі «Слуцкія паясы», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.

Сярод іх: сярэбраныя — наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 33,62 грама, дыяметрам 50 міліметраў, тыражом 7000 штук кожнага наймення; медна-нікелевыя — наміналам 1 рубель, масай 19,5 грама, дыяметрам 37 міліметраў, тыражом 7000 штук кожнага наймення.

Манеты адчаканены на Літоўскім манетным двары: сярэбраныя — якасцю «пруф» з тампадрукаваннем, медна-нікелевыя — «пруф-лайк».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

У БЕЛАРУСІ ЧАТЫРЫ ДОЎГАЖЫХАРЫ ПЕРААДОЛЕЛІ 113-ГАДОВЫ РУБЕЖ

Дзевяць беларусаў пераадолелі 110-гадовую мяжу, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела па справах ветэранаў і інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана Ермаковіч.

Яна адзначыла, што чатырох чалавек можна назваць супердоўгажыхарамі: яны нарадзіліся на пачатку мінулага стагоддзя — у 1900 годзе. Сярод гэтых 113-гадовых беларусаў — тры жанчыны і адзін мужчына. Паводле звестак на 1 кастрычніка гэтага года, стагадовы юбілей адсвяткавалі 558 жыхароў Беларусі. Сярод беларускіх доўгажыхароў упэўнена лідзіруюць жанчыны: 100-гадовую планку перасягнулі 483 жанчыны і 75 мужчын.

Алена ПРУС, БЕЛТА.

АДЗЕННЕ НОВАЕ ЦІ НЕ?

Вялікім попытам карыстаецца ў нас адзенне, якое прайшло ўцэнку на рынках і гандлёвых сетках Еўропы і ўвозіцца на тэрыторыю нашай дзяржавы з-за мяжы. Попыт нараджае прапанову, а разам з ім — жаданне нядобрасумленных прадаўцоў тавару атрымаць як мага больш прыбытку пры мінімальных выдатках. У сувязі з чым такое адзенне, за якое неабходна было б заплаціць даволі высокія мытныя пошліны, увозіцца рэалізатарамі як былое ва ўжыванні.

— Падчас мытнага кантролю было ўстаноўлена, што ў грузавым адсеку аўто знаходзіцца тавар «Новае адзенне (адзенне без прыкмет зносу)» агульнай вагой 500 кг, які не адпавядаў звесткам, заяўленым перавозчыкам. Мытнікамі выяўлена адзенне без прыкмет зносу — 150 кілаграмаў коштам больш як 270,8 мільёна рублёў. Тавар канфіскаваны. У дачыненні да людзей, якія здзейснілі правапарушэнне, пачаты адміністрацыйны працэс, — расказалі ў Віцебскай мытні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАКУЛЬ ЛЁД НЕ СТАЎ

Да ледаставу засталіся лічаныя тыдні. І гэты своеасаблівы цэйтнот літаральна штурхае аматараў лёгкай спажывы да астылых вадаёмаў. Натуральна, з браканьерскімі прыладамі.

Увечары 18 лістапада работнікамі Глыбоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету на вадасховішчы «Азярцы» Глыбоцкага раёна былі затрыманы двое жыхароў Наваполацка, якія пры дапамозе сетак спрабавалі здабываць рыбу.

У той жа дзень на апярэджанне інспектары спрацавалі і ў паляўнічых угоддзях Варапаеўскай паляўнічай дачы. Як паведаміў начальнік Глыбоцкай міжрайінспекцыі Аляксей Протас, за незаконнае паляванне былі затрыманы двое жыхароў Пастаўскага раёна. У аўтамашыне «Сітраен Ксантыя», якая належыць аднаму з затрыманых, выяўлены і канфіскаваны незарэгістраваная паляўнічая стрэльба, акумулятар і фара. Матэрыялы накіраваны ў раённы суд.

Ул. інф.

ТАННЕЙ УЖО НЕ БУДЗЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Павышаны попыт на кампактнае жыллё павялічыў мінімальны цэннік аднапакаёвых кватэр да 430—450 долараў, а ўвогуле кошт падобнага жылля дасягае ў многіх гаспадароў нават 500 долараў. Удакладняю, што па такім кошце сёння часам прапануюцца звычайныя кватэры ў стандартных панэльных дамах. Самы распаўсюджаны цэннік двухпакаёвых кватэр таксама вагаецца ў межах ад 450 да 500 долараў. Крыху лепшыя па якасці двухпакаёўкі ўжо з сур'ёзным рамонтам, сучаснай кухняй і пральнай машынай могуць прапаноўвацца часам і за 500—600 долараў. Масавы кошт прапановы трохпакаёвых кватэр вагаецца ў межах ад 700 да 1000 долараў. Бываюць выпадкі, калі на рынак трапляюць і трохпакаёўкі за 650 долараў, але іх звычайна адзінкі. Спадарыня Лукашэвіч адзначае, што сёння ліквідных бюджэтных кватэр катастрафічна не хапае.

Рынак арэндных кватэр для агенцтваў звузіўся

Наш эксперт канстатуе той факт, што ў апошнія месяцы ўсё меншая колькасць уладальнікаў свабоднага жылля звяртаецца па дапамогу ў спецыялізаваныя агенцтвы нерухомасці. Гаспадары такога жылля пачалі часцей шукаць кватарантаў самастойна — праз уласныя аб'явы ў глабальнай сетцы. Магчыма, што гэта звязана з нежаданнем уласнікаў плаціць падаткі дзяржаве. Другім фактарам можа быць той факт, што па «шэрым» алгарытме здаюцца такія кватэры, якія былі пабудаваны з выкарыстаннем ільготнага крэдыту. А вось такое жыллё афіцыйна рэгістравацца ў жыллёва-эксплуатацыйных службах цяпер ужо не можа.

У цяперашняй сітуацыі жорсткага дэфіцыту ўсіх відаў здымнага жылля ў самае складанае становішча трапілі маладыя сем'і з дзецьмі. Амаль усе гаспадары арэнднага жылля адмаўляюць гэтай катэгорыі кватарантаў.

Зразумела, што гэта проста незаконна, і мы такі алгарытм здачы не вітаем. Больш за тое, пры самастойным пошуку гаспадары жылля могуць трапіць у шэраг непрыемных сітуацый. Бывалі выпадкі, калі з кватэры знікалі дарагія бытавыя прыборы і мэбля. Часам у свае кватэры ўласнікі рэгіструюць замежнікаў, якіх потым выпісваюць толькі праз суд. А ў агенцтвах прафесіяналы дасканала растлумачаць кліентам усе нюансы беларускай прыватнай арэнды. Напрыклад, спецыялісты агенцтваў абавязкова парэкамендуюць гаспадарам дарагіх апартаментаў зрабіць дакладны вопіс кватэры і ўсяго, што ў ёй знаходзіцца. Пры здачы жылля грамадзянам з іншай краіны існуюць спецыфічныя тонкасці.

Павышаны попыт на кампактнае жыллё павялічыў мінімальны цэннік аднапакаёвых кватэр да 430—450 долараў, а ўвогуле кошт падобнага жылля дасягае ў многіх гаспадароў нават 500 долараў.

Прыватную арэнду чакае суцэльная стандартызацыя?

Аб чым тут ідзе гаворка? Аксана Лукашэвіч упэўнена, што ў сталіцы неабходна правесці стандартызацыю ўсіх відаў кватэр, якія здаюцца ў арэнду. Тады кожнае жылое памяшканне будзе мець свой дакладны сярэдні арэндны кошт. Такі арэндны кошт кватэры будзе залежаць ад планава-эканамічнай зоны жылля, ад «узросту» і тыпу дома, а таксама ад пэўных характарыстык непасрэдна жылога памяшкання. Паводле меркаванняў нашага эксперта, такі ўсярэднены стандарт неабходна ўвесці для ўсіх удзельнікаў рынку арэнды. Каб нават прыватныя кватэраздатчыкі ўспрымалі гэты стандарт не ў якасці рэкамендацыі, а на ўзроўні закона. У гэтым выпадку спажыўцы такой паслугі будуць дакладна ведаць прыкладны цэннік таго ці іншага жылля. Памер арэнднай платы стане больш стабільным і прагназуемым. Хутчэй за ўсё, лабіраваць укараненне падобнай сістэмы актыўна пачнуць падатковыя службы, якія змогуць з большай дакладнасцю адсочваць памеры даходаў грамадзян ад гэтай дзейнасці. А вось уладальнікам свабодных «квадратаў», мабыць, прыйдзецца крыху падкарэктаваць свае «апетыты».

Арэнда дакладна таннець не будзе

У цяперашняй сітуацыі жорсткага дэфіцыту ўсіх відаў здымнага жылля ў самае складанае становішча трапілі маладыя сем'і з дзецьмі. Амаль усе гаспадары арэнднага жылля адмаўляюць гэтай катэгорыі кватарантаў. Выключэнне робіцца толькі для вялікіх па плошчы шматпакаёвак з мінімальным наборам мэблі і бытавых прыбораў. Такія кватэры звычайна не маюць вялікага попыту ў большасці патэнцыяльных кватарантаў. Таму гаспадары вялікіх пустых шматпакаёвак згаджаюцца нават на пэўныя зніжкі. Аднак агульная тэндэнцыя на рынку прадугледжвае не памяншэнне ставак арэнды, а, хутчэй, стабілізацыю цэннікаў на сённяшнім узроўні, ці нават невялікага іх павелічэння. Аксана Лукашэвіч прагназуе магчымае падаражанне арэнды да новага года на ўзроўні 20—50 долараў у сегменце аднапакаёвых кватэр. А ў наступным годзе сітуацыя з арэндай можа нават пагоршыцца, бо ў маі Мінск прымае сусветнае першынство па хакеі, а значыць, і вялікую колькасць замежных турыстаў...

Сяргей КУРКАЧ.

**ОАО «Слуцкий льнозавод»
извещает акционеров о проведении
внеочередного общего собрания акционеров
ОАО «Слуцкий льнозавод»**

Дата и время проведения собрания: 2 декабря 2013 года в 10.00.
Место проведения: г. Слуцк Минской области, ул. Ленина, 300, актовый зал.
Повестка дня:
1. Увеличение уставного фонда Общества путем проведения закрытой подписки.
2. Внесение изменений в Устав Общества.
Регистрация участников собрания с 09.00 до 09.45.
Для регистрации акционеров необходимо иметь:
юридическим лицам: руководителям – служебное удостоверение (иной подтверждающий документ) и паспорт;
иному представителю — доверенность на представление юридического лица на собрании акционеров и паспорт;
физическим лицам: паспорт; представителям – доверенность, удостоверенную в установленном порядке, и паспорт.
Информация по вопросам повестки собрания предоставляется акционерам ОАО «Слуцкий льнозавод» по месту нахождения ОАО:. г. Слуцк, ул. Ленина, 300 с 8.00 до 17.00.

Телефон для справок (8-01795) 61655.

**Наблюдательный совет
ОАО «Слуцкий льнозавод»**

УНП 690657228

ШЫНЫ ДАСТАВЯЦЬ ЦЯГАМ ТЫДНЯ

Чытач з Мастоўскага раёна выказаў па «гарачай лініі» незадаволенасць тым, што на запраўках не прадаюцца патрэбныя яму зімовыя шыны вытворчасці «Белшыны» да аўтамабіля «Ніва». Магчымае супрацоўніцтва ў гэтым кірунку, напрыклад, з індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія вядуць такі гандаль праз інтэрнэт і могуць нават бясплатна даставіць тавар пакупніку, ён катэгарычна адмёў. Дзяржаўнай краме давер большы.

Калі мы датэлефанаваліся да вядучага спецыяліста гандлёвага аддзела прадпрыемства Беларуснафта — «Гроднааблнафтапрадукт» Віктара Вайцаховіча, нямала таго здзівілі сваім зваротам.

— Так, патрэбныя вашаму заяўніку зімовыя шыны R16 вытворчасці «Белшыны» да аўтамабіля «Ніва» — крыху большага памеру, чым, скажам, R14, таму яны не карыстаюцца павышаным попытам. З гэтай нагоды і трымаць іх на АЗС у вялікай колькасці няма сэнсу. Давайце праверым, што ёсць у наяўнасці зараз, — прапанаваў Віктар Аляксандравіч, звяртаючыся да камп'ютарнай базы.

Паводле далейшых слоў суразмоўцы, на момант нашага тэлефанавання на аўтазаправачнай станцыі ў Мастах якраз былі ў наяўнасці дзве зімовыя шыны R16.

— Магчыма, грамадзяніну былі патрэбныя чатыры? На любой нашай запраўцы, калі цяпер няма патрэбнага, можна пакінуць замову з указаннем канкрэтных тэхнічных параметраў. Гэта можна зрабіць і ў тых жа Мастах, і ў Шчучыне, а таксама ў Лідзе і Ваўкавыску, дзе ў нас па тры аўтазаправачныя станцыі ў кожным горадзе, — распавёў Віктар Вайцаховіч. — Максімум цягам тыдня пакупніку даставяць замоўлены тавар.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2014 года!

Індэкс/перыяд		1 месяц	3 месяцы	6 месяцаў
63850	(для індывідуальных падпісчыкаў)	47 500	142 500	285 000
63145	(для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	42 750	128 250	256 500
63858	(для ведамасных падпісчыкаў)	95 300	285 900	571 800
63239	(ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	85 800	257 400	514 800

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

УШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ ЗАГІНУЛЫХ НА ДАРОЗЕ

Аўтапрабег "Чорная хваля" прайшоў у Магілёве. Яго арганізатарамі сталі супрацоўнікі ўпраўлення ДАІ Магілёўскага аблвыканкама. Калона аўтамабіляў з чорнымі жалобнымі стужкамі рухалася па вуліцах горада і спынялася ў тых месцах, дзе ў аварыях загінулі людзі. Там прысутныя запальвалі лампадкі і пакідалі кветкі. Скончыўся аўтапрабег хвілінай маўчання.

Памяць загінулых у аўтакатастрофах ўшанавалі і ў магілёўскім політэхнічным каледжы. У жалобным спісе загінулых на дарозе ёсць і трое навучэнцаў гэтай установы. Сумесна з супрацоўнікамі ДАІ тут быў арганізаваны вечар памяці «Бяспека на дарогах — бяспека жыцця», дзе арганізатары акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці выконваць дарожныя правілы.

Настаяцель Свята-Траецкага храма аграгарадка Усход айцец Анатоль асвяціў найбольш аварыйны ўчастак аўтадарогі мяжа РФ — Віцебск — Гомель — мяжа Украіны каля пасёлка Мірны. Там штогод здараюцца аварыі, у якіх гінуць і атрымліваюць траўмы людзі.

— Правядзенне падобных мерапрыемстваў — гэта, з аднаго боку, магчымасць згадаць пра загінулых і пацярпелых, а з другога — звярнуцца да жывых з заклікам захаваць свае і чужыя жыцці, — падкрэсліў **начальнік ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Міхаіл НЕЎМЯРЖЫЦКІ.** — Нельга заставацца абыякавымі да парушэнняў закону дарог. Кожнаму трэба навучыцца шанаваць як сваё жыццё, так і жыццё навакольных! Кожны дзень, кожную хвіліну неабходна памятаць пра адказнасць за сваю будучыню і будучыню іншых людзей.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Повестку дня внеочередного собрания акционеров

ОАО «Белторгстрой»,

опубликованную в № 213 от 13.11.2013 г.,

ДОПОЛНИТЬ ПУНКТАМИ СЛЕДУЮЩЕГО СОДЕРЖАНИЯ:

- Об утверждении цены выкупа акций Общества у своих акционеров.
- Об утверждении проекта договора о присоединении Общества.

УНП 100633428.

■ Грошы

«НАВАГОДНІ» ДЭПАЗІТ ПАД 50%

Найбуйнейшы банк Беларусі з 20 лістапада ўводзіць новы тэрміновы ўклад «Навагодні» ў беларускіх рублях з тэрмінам захоўвання 3 месяцы, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Цікава, што памер працэнтнай стаўкі па ўкладзе з кожным наступным месяцам толькі павялічваецца. Так, за першы месяц захоўвання прапануецца 49% гадавых, за другі — 49,5%, за трэці месяц — 50,5% гадавых. Мінімальная сума першапачатковага ўзносу, якая з'яўляецца і сумай пастаяннага астатку ўкладу, акрэслена ў памеры 5 млн рублёў. Адным слушным плюсам гэтага дэпазіту з'яўляецца магчымасць да тэрміну вяртання ўкладу здзяйсняць расходныя аперацыі ў межах часткі астатку ўкладу, якая перавышае суму пастаяннага астатку ўкладу. Дазваляецца папаўненне ўкладу на працягу першых 2 месяцаў яго захоўвання.

Сяргей КУРКАЧ

НА СТАРЫХ МАШЫНАХ МОЖНА ЗАРАБІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кінутае аўто прымусова буксіруюць на штрафстаянку. Што, у сваю чаргу, стварае непатрэбныя канфлікты паміж ДАІ і кіроўцамі, адымае ў абодвух бакоў шмат часу і сіл... І гэта пры тым, што цяпер ёсць магчымасць здаць непатрэбны аўтамабіль на металалом, атрымаўшы грошы!

Аматары зарабіць на металаломе ёсць. Ды вось толькі часам ім замінае звычка пакідаць усё на апошні дзень. Спрацоўвае прынцып: «Не рабі сёння тое, што можна зрабіць заўтра». У канцы года звычайна і ствараюцца чэргі з ахвотных утылізаваць свой аўтамабіль. Хаця што перашкаджае зрабіць гэта зараз, без марнавання часу?

— Мы прымаем на ўтылізацыю абсалютна ўсе машыны, у тым ліку і ад фізічных асоб, — пераконвае намеснік генеральнага дырэктара па рэалізацыі аўтамабіляў холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс» Андрэй Праваторaў. — Сёлета да нас паступіла ўжо 108 аўто, а яшчэ 165 чакаюць сваёй чаргі. Больш за тое, мы прапаноўваем зніжку ў 18 мільёнаў рублёў на кожны куплены па ўтылізацыйнай праграме новы аўтамабіль. Няўжо ў кагосьці гэтыя грошы лішнія?

У нейкай ступені падштурхнуць кіроўцаў да здачы непатрэбнага аўтамабіля на металалом магло б увядзенне ўтылізацыйнага збору. Аднак тут трэба яшчэ дакладна вызначыцца. Проста браць дадатковыя грошы — гэта не самамэта. Напрыклад, Еўрапейскі саюз хоча абавязаць аўтамабільныя канцэрны ў якасці сыравіны выкарыстоўваць менавіта перапрацаваны металалом. Рэсурсы карысных выкапняў на планеце абмежаваныя, і многія з іх не ўзнаўляюцца...

— Аднак нешта прадказваць па будучыні ўтылізацыйнага збору ў Беларусі сёння яшчэ ранавата, — лічыць **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Белдругчармет» Сяргей ГЛАДКІ.** — Нават у Расіі, дзе ён запрацуе ўжо праз паўтара месяца, пакуль фактычна робяцца толькі першыя крокі. Давядзецца штосьці пазычыць і з заходняга вопыту. І нельга скідваць з рахунку людскі менталітэт. Гістарычна склалася так, што насельніцтва масава дастаўляла ў пункты прыёму другаснай сыравіны макулатуру, шклатару, але не аўтамабілі. Сёння ж у Беларусі зарэгістравана каля трох мільёнаў транспартных сродкаў, якія рана ці позна, але будуць заменены. І куды ж дзяваць столькі старых машын?

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

УП «КАНИМИС» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года № 505 в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс: +375173060802, +375173060781, режим работы: понедельник–пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

Ранее реализованные проекты: в настоящее время ведется строительство административного центра в квартале ул. К. Либкнехта и пер. Домашевский в г. Минске и два многоквартирных жилых дома в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева в г. Минске.

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору № 452-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а» от 21.12.2012 г. с Минским городским исполнительным комитетом.

Объект строительства – Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а.

МНОГОКВАРТИРНЫЙ ЖИЛОЙ ДОМ по пер. Инструментальному, 11а

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 12,2 мес., ввод в эксплуатацию – II квартал 2015 года.

Застройщиком получены:

- Решение Мингорисполкома от 22 августа 2013 года № 2081.
- Свидетельство (удостоверение) №500/973-2252 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на него, свидетельство (удостоверение) № 500/973-2253 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на него, расположенных по адресу: г. Минск, пер. Инструментальный, 11а.
- Экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 14.06.2013 года № 05-03/4269.
- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-206Ж-045/13 от 14.11.2013 г.

Договор строительного подряда № 09/09.2013 от 09.09.2013 г. с ООО «СК-12».

Жилой дом расположен в Первомайском районе г. Минска по пер. Инструментальному, 11а на 70 квартир – односекционный, двенадцатиэтажный, с подземным гаражом-стоянкой на 35 машино-мест, запроектирован с теплым чердаком, плоской кровлей, с двумя пассажирскими лифтами. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением поризованным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: Озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

В жилом доме запроектирован автоматизированный теплопункт.

Этажность – 12. Площадь жилого здания – 5583,60 кв.м. Общая площадь квартир – 4604,18 кв.м. Общая площадь гаража-стоянки – 1037,66 кв.м.

Всего в доме – 70 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**:

Однокомнатных общей площадью от 44,76 до 46,04 кв.м – 3 квартиры. Цена 1 кв.м – 15 514 300 бел. руб.

Двухкомнатных общей площадью от 65,35 до 65,84 кв.м – 3 квартиры. Цена 1 кв.м – 15 374 950 бел. руб.

Трехкомнатные общей площадью от 84,57 до 84,99 кв.м – 2 квартиры. Цена 1 кв.м – 15 291 340 бел. руб.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Стоимость машино-места – 255 814 046 бел. руб. – 10 машино-мест.

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиями заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» с 25.11.2013 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8 (017) 3060802, 8 (017) 3060781 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА: на право заключения договора аренды земельных участков в Оршанском районе; по продаже земельных участков в частную собственность в Оршанском районе

Лот №	Месторасположение и площадь земельного участка	Начальная цена продажи (руб.)	Условия заключения договора аренды	Инженерное обеспечение земельного участка	Сумма задатка (руб.)
1	аг. Смольяны, площадью 0,0105 га. Кадастровый номер 223686608601000327	34 393	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – для размещения объекта розничной торговли.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное водоотведение – нет, централизованное теплоснабжение – нет, электроснабжение – нет, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог международного и республиканского значения (расстояние не более 500 м по прямой) – нет.	3 500
2	д. Замосточье, площадью 0,2451 га. Кадастровый номер 223682702601000101	3 101 836	Целевое использование – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.	Централизованное газоснабжение – нет, централизованное водоснабжение – нет, централизованное теплоснабжение – нет, централизованное водоотведение – нет, участки примыкают к асфальтированным дорогам и улицам – нет.	310 200
3	ул. Зеленая, д. 22а, д. Андреевщина, площадью 0,1280 га. Кадастровый номер 223683900101000347	11 693 243	Целевое использование – для строительства и обслуживания жилого дома.	Централизованное газоснабжение – да, централизованное водоснабжение – да, централизованное водоотведение – нет, централизованное теплоснабжение – нет, участки находится в радиусе 500 метров от центра населенного пункта – нет, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, участки примыкают к асфальтированным дорогам и улицам – нет, участки находятся на хуторе и в труднодоступной местности – нет.	1 169 400

1. **Аукцион состоится в 11.00 20 декабря 2013 г. в г. Орше в здании ГП «Оршанский региональный центр поддержки предпринимательства» по ул. Ленина, 230 г. Орши.**

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагается документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет государственного предприятия «Оршанский региональный центр поддержки предпринимательства» № 3012500014634 в ЦБУ №202 ОАО «Белгазпромбанк», БИК 153001742, УНП 391134716, с отметкой банка, а также представляются: физическим лицам – документ (копия), удостоверяющий личность (паспорт), или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально, в случае если участник является представителем физического лица; юридическим лицам – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, либо нотариально удостоверенная доверенность, если участник является представителем юридического лица.

3. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

Лот № 1:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;
- не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколах о результатах аукционов, заключить с Оршанским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;
- в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев с даты вступления в силу протокола о результатах аукциона, обратиться в Оршанский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за осуществлением государственной регистрации прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение на проектно-изыскательские работы и разработать проект на строительство объекта;
- юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство);
- осуществить строительство объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Лот № 2:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за выкуп земельного участка в частную собственность; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка;
- осуществить в двухмесячный срок со дня вступления в силу протокола о результатах аукциона государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;
- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;
- приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

Лот № 3:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения;
- в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией прав на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение на проектно-изыскательские работы и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий один год;
- в течение одного года со дня государственной регистрации права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;
- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

4. **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 230 (государственное предприятие «Оршанский региональный центр поддержки предпринимательства») с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 17 декабря 2013 года включительно.**

Контактные телефоны: (8-0216) 21-93-06, (8-029) 217-05-11.

СВЯТЛАНА — ЛЕПШЫ ЎЧАСТКОВЫ

Летась я прыехала ў Пружанскі раён з намерам расказаць пра будні ўчастковых. А патрэбнага мне няма на месцы. «Ён бомбу сцеражэ», — сказалі мне. Аказалася, што на аддаленым полі пры вядзенні сельгаспрацаў адкапалі самую сапраўдную бомбу часоў вайны. Як і належыць, выклікалі сапёраў. А пакуль тыя прыедуць, трэба ж агарадзіць боепрыпас ад доступу выпадковых людзей і магчымага няшчасця. Хто гэтым зоймецца? Вядома, участковы.

Мікалай Мельчанка віншуе з перамогай Святлану Веліган.

Фота з сайта Брэсцкага УУС.

Участковы, як сельскі, так і гарадскі, у пэўнай ступені «ўніверсальны салдат». Ён павінен вельмі многае ўмець. Гэта яшчэ раз прадэманстраваў рэспубліканскі агляд-конкурс на званне «Лепшы ўчастковы інспектар міліцыі» і «Лепшы інспектар па справах непаўналетніх», які праходзіў у Брэсце. Ад кожнага рэгіёна на спаборніцтвы прыехала па шэсць чалавек: тры ўчастковыя інспектары і тры інспектары па справах непаўналетніх. Падчас конкурсу трэба было вызначыць, хто з іх лепшы ў страявой, медыцынскай, агнявой спецыяльнай падрыхтоўцы, крыміналістыцы. Экзамен па крыміналістыцы ўяўляў сабой тэст з сарака пытанняў. Вядома, тут без добрай тэарэтычнай базы нельга было справіцца. Але і практычны вопыт дапамагаў канкурсантам. Ім падчас штодзённай работы не раз даводзілася аглядаць месца здарэння, заўважаць самыя, на першы погляд, неістотныя дробязі. Вельмі часта бывае, што на месца здарэння ўчастковы прыбывае першым. І яму проста неабходна быць кваліфікаваным спецыялістам.

Па словах **намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалая МЕЛЬЧАНКІ,** 9-ы рэспубліканскі агляд-конкурс паказаў годныя вынікі. У камандным заліку сярод участковых інспектараў міліцыі першае месца заняў Мінск, на другой пазіцыі — Віцебск, на трэцяй — Мінская вобласць. Вынікі спаборніцтваў участковых інспектараў па справах непаўналетніх не вельмі адрозніваюцца: на першым месцы — Мінск, на другім — Віцебск, а трэцяе падзялілі Брэсцкая і Мінская вобласці. А ў асабістым заліку лепшай стала ўчастковы Ленінскага РАУС Мінска Святлана ВЕЛІГАН. Першае месца сярод участковых інспектараў па справах непаўналетніх заняў капітан міліцыі з Першамайскага раёна Мінска Васіль ДЗЕМІДОВІЧ. Пераможцам уручылі ключы ад новых службовых аўтамабіляў.

Павіншаваць удзельнікаў конкурсу з перамогай прыбыў і **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанід ЦУПРЫК.** Лепшым брэсцкім міліцыянерам ён уручыў граматы аблвыканкама, а таксама ключы ад дзвюх службовых кватэр.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Добрая навіна

БУСЕЛ ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў БЯЛЫНІЧАХ

Адным сучасным радзільным аддзяленнем на Магілёўшчыне стала больш

Аза, жыхарка Круглага, чакае дзіця, і тое, што ёй давядзецца нараджаць яго ў новым аддзяленні Бялыніцкай раённай бальніцы, лічыць добрым знакам.

— Мне тут вельмі падабаецца, — кажа яна. — І да дому бліжэй. У мяне гэта ўжо трэцяе дзіця. Сына і дачку нараджала ў Магілёве. Там нядрэнна, але, ведаеце, тут — значна лепш. Умовы вельмі добрыя.

Палата, дзе знаходзіцца Аза, разлічана на двух чалавек. Прасторна, утульна, уся мэбля новая. «Каго чакаеце?» — пытаюся ў яе. «Урачы кажуць — дзяўчынку», — шчасліва ўсміхаецца яна.

Для раёна, дзе ўзровень нараджальнасці — адзін з самых высокіх у вобласці, падзея і на самрэч значная. Таму ўдзел у ёй прымалі раённыя і абласныя кіраўнікі на чале з губернатарам Пятром Руднікам. На свята таксама завіталі будаўнікі і спонсары.

Чатыры гады таму пачаўся рамонт аддзяленняў бальніцы. Прыйшоў час «навесці марафет» і ў радзільным аддзяленні, якое вельмі запатрабавана. Яно абслугоўвае не толькі бялыніцкіх, але і круглянскіх парадзіх.

Тут нараджаецца ў год каля 400 немаўлят.

— Дзякуй нашым будаўнікам з ПМК-241, якія рамантавалі гэтае аддзяленне, — распавядае **галоўны ўрач бальніцы Віктар ПЯНЬКОЎСКІ. —** Набыта новае сучаснае медыцынскае і гаспадарчае абсталяванне. Адна- і двухмесныя палаты маюць асобныя санвузлы, добрыя душавыя кабіны. Набыта дыягнастычнае і лячэбнае абсталяванне для дзяцей і матуль. Будучыя маці ўвесь час цікавіліся, калі ж нарэшце адкрыецца аддзяленне. Ім хочацца раджаць бліжэй да дому, дзе, вядома, і сцены дапамагаюць.

Дарэчы, аддзяленне абслугоўваюць 14 урачоў, медсясцёр і акушэрак. І ўсе яны — высокапрафесійныя кадры. Яны працавалі тут яшчэ да капрамонту, а зараз вярнуліся на ранейшыя месцы.

— Настрой вельмі добры: створаны ўмовы і для нашых работнікаў, і для жанчын — ім больш не спатрэбіцца ездзіць раджаць у Магілёў, — не ўтойвае радасці **загадчыца аддзялення Ірына ГАДУНОВА.** — Умовы і абсталяванне дазваляюць прымаць роды на высокім узроўні.

Аддзяленне сапраўды не пазнаць: на падлозе — зручная кафля, на вокнах — шклопакеты, якія надзейна абараняюць ад скразнякоў. Атрымана і шмат сучаснага медыцынскага абсталявання — апарат для запісу сэрцабіцця плода, дыхальная апаратура для немаўлят, новыя пеленальныя сталы, маленькія матрацы з падагрэвам для нованароджаных... Грошы на гэтыя і іншыя рэчы — усяго 260 мільёнаў рублёў — ахвяраваў Нацбанк РБ і, у прыватнасці, яго галоўнае ўпраўленне па Магілёўскай вобласці.

— Тое, што гэтае радзільнае аддзяленне менавіта міжраённае, вельмі важна. Калі ў цэлым па краіне летась на 1 тысячу жыхароў нарадзілася 12,2 немаўляткі, на Магілёўшчыне — 11,8, то ў Бялыніцкім раёне — 13,4! Каб гэтыя лічбы раслі, ствараюцца ўсе ўмовы, — адзначыў **губернатар Пётр РУДНІК.**

Каб радзільнае аддзяленне ў Бялыніцкай бальніцы працавала на радасць будучым парадзіхам, яго асвяціў настаяцель храма ў гонар Бялыніцкай Божай Маці айцец Аляксандр. Дарэчы, ікон у новым аддзяленні шмат. У радзільным зале, напрыклад, знаходзіцца вялікая ікона Божай Маці — яна дапамагае пры родах. Жанчыны кажуць, што, калі адчуваеш падтрымку Нябеснай Маці, настрой паляпшаецца.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Падзея

ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА НАШЧАДКАЎ ПЕРАМОГІ

Неўзабаве студыі ваенных мастакоў споўніцца 10 гадоў. І найлепшы падарунак падрыхтавалі сабе самі творцы. У мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася іх сумесная выстава «Нашчадкі Перамогі», прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Вайна — галоўная тэма іх твораў. Сам лёс быццам падказаў яе для творчасці: усе мастакі студыі — дзеці вайны. Таму не дзіва, што ледзь не на кожным палатне — увасабленне воінскага подзвігу, ухваленне патрыятызму, своеасаблівы гімн Айчыне. Сімвалічна, што выстава праводзіцца менавіта тут, у мастацкай галерэі вялікага чалавека, выдатнага мастака, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, Героя Беларусі Міхаіла Андрэевіча Савіцкага, які пры жыцці зрабіў вялікі ўнёсак у станаўленне і развіццё студыі ваенных мастакоў.

— Сёння наша «чарада» засталася без важака, але мы «ляцім» далей, — зазначыў **кіраўнік студыі ваенных мастакоў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Мікалай АПІЁК.** — Хто, калі не мы? Тыя, хто ў дзяцінстве чулі раскаты гарматных выстралаў, бачылі, як немцы забівалі і катавалі нашых землякоў, але мы былі сведкамі і таго, як савецкая армія гнала гэтых вылюдкаў з беларускай зямлі. Толькі пры вызваленні сяла Баева, што ў маім Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці, загінула 1360 воінаў... Дык хто, калі не мы, данясе да сучасных пакаленняў тое, што пражыта старэйшымі і захавана ў народнай памяці?

За гады свайго існавання студыя ваенных мастакоў паспела заваяваць аўтарытэт. Праведзена больш за 30 мастацкіх выстаў. Арганізаваны персанальныя экспазіцыі ўдзельнікаў студыі: народных мастакоў Беларусі Івана Міско і Георгія Паплаўскага, заслужаных дзеячаў мастацтваў краіны Мікалая Апіёка, Леаніда Дударэнкі, Уладзіміра Церабуна, Уладзіміра Уродніча, мастакоў Уладзіміра Гардзіенкі і Георгія Лойкі.

І ўспамінаецца вайна, і слёзы на вачах блішчаць...

— Захаванне пераемнасці ваенна-патрыятычнай тэмы ў мастацтве — бадай, адна з галоўных нашых заслуг, — перакананы **заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Уладзімір УРОДНІЧ.** — Справа ў тым, што наша пакаленне і пакаленне сучаснасці шанавала і шануе тэму Вялікай Айчыннай вайны. І так павінна быць: будаваць заўтрашні дзень, не ведаючы пра ўчарашні, нельга. Сучаснік — чалавек, які, перш за ўсё, паважае тое, што зроблена яго бацькамі і дзядамі. Тварыць на гэтую тэму — мой маральны абавязак, спроба адказаць нібыта на зварот майго бацькі-партызана, які загінуў у 19 гадоў. Сёння на маіх мальбертах у майстэрні стаіць эскіз, які павінен адлюстраваць контрудар нашых войскаў на пачатку вайны ў раёне Жлобіна і Рагачова. Гэта было магутнае супраціўленне гітлераўцам на нашай зямлі, пра якое, на жаль, мала хто ведае.

Як прызнаўся **народны мастак Беларусі Іван МІСКО,** дзесяць гадоў — зусім мала, гэта толькі пачатак. Мінулая вайна прайшла літаральна на вачах Івана Яўхімавіча. Перажытае і ўбачанае назаўсёды засталося ў памяці падлетка. Невыпадкова гэтай тэме прысвяціў дыпломную працу, шматлікія творы, якія пасля сталі шэдэўрамі беларускага мастацтва. Узгадаць толькі помнік у гонар маці-патрыёткі Настассі Купрыянавай у Жодзіне. «Ваенная тэма была, ёсць і застанецца ў творчасці тых, каго яна датычылася. Пакуль жывуць ветэраны, яна будзе актуальнай. А далей — пажывём, пабачым. Я думаю, што ўсё яшчэ напярадзе», — дадаў мастак.

Герой работы і яе аўтар: Мікалай АПІЁК расказвае, як яму працавалася з генерал-лейтэнант Ільёй ВЯЛЬДЖАНАВЫМ.

А пакуль тое, што ўжо ёсць. «На магілёўскім напрамку», «Лета 44-га», «Партызанскія сцежкі», «... Ваша меркаванне, таварыш Жукаў...» — творы-ўвасабленні трагедыі беларускага народа, яго самаахвярнасці і воінскага подзвігу. Са шматлікіх партрэтаў глядзяць славутыя палкаводцы, адважныя вайскоўцы, сапраўдныя патрыёты. Не абмінаюць мастакі студыі і тэму сучаснасці. Чым жыве сённяшняя армія і як праходзяць службу вайскоўцы нашых дзён, добра паказана ў жывапісных палотнах «На палігоне», «Аператыўнае вучэнне», «Спецназ», «Шчыт Айчыны»...

— Дзесяць гадоў... Многа гэта ці мала? Вядома, гэта невялікі прамежак часу. А колькі за гэты час мастакамі студыі зроблена! — падкрэсліў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА.** — Паглядзіце на іх карціны і скульптуры. Колькі ў іх святла і цяпла, мужнасці і гонару, самаахвярнасці! У гэтых творах бычым: нам ёсць што абараняць — нашу зямлю, нам ёсць каму яе абараняць — беларускаму народу, мы ведаем, як яе абараняць. Патрыёт Айчыны — не толькі чалавек у ваеннай форме, патрыятызм — стан душы. Вось што хацелі данесці да нас праз свае творы мастакі. І ў іх гэта атрымалася.

...На календары мастакоў студыі ўсплывала і сумная дата: споўнілася тры гады, як пайшоў з жыцця Міхаіл Андрэевіч Савіцкі. На жаль, і сёння на магіле Героя Беларусі няма помніка. У той час згадваецца, як якраз пасля яго смерці быў аб'яўлены конкурс на лепшае скульптурнае рашэнне гэтай задачы. У тым ліку, і сярод мастакоў студыі. Спадзяёмся, што гэта толькі справа часу.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

НАВАТ МЁРТВЫМ БАЛІЦЬ

Палеская трагедыя: як гэта было

Аляксандр ЯСЬКО, юрыст па адукацыі, даўно жыве ў Гродне, але ўжо больш за 40 гадоў даследуе падзеі Вялікай Айчыннай вайны на сваёй малой радзіме ў Старобінскім (цяпер Салігорскім) раёне. Яго родная вёска Пузічы 15 лютага 1943 года была цалкам спалена фашыстамі, загінула 780 чалавек. Увогуле падчас карных аперацый «Хорнунг» і «Ніксэ» нацысты знішчылі больш за 15 тысяч мірных жыхароў. Аб гэтым — кніга «Баліць нават мёртвым. Палеская трагедыя», якая створана на падставе архіўных дакументаў і ўспамінаў землякоў аўтара.

Карэспандэнт «Звязды» прачытаў кнігу і пабываў на яе прэзентацыі, якая прайшла на гістарычным факультэце ГрДУ імя Янкі Купалы.

Аўтар кнігі гутарыць з Міхаілам Лаўрэнцьевічам МАЛАШАМ. Жнівень 2012 г.

— Аляксандр Фёдаравіч, чаму пасля многіх гадоў даследчай працы, шматлікіх артыкулаў у газетах вырашылі зноў звярнуцца ў архівы і сустрэцца са сведкамі нацысцкага тэрору, якія засталіся ў жывых?

— Як казаў адзін з класікаў, калі можаш не пісаць — лепш не пішы. Аднак сітуацыя склалася такая, што я не мог не пісаць, абавязаны быў. Бо ідзе актыўная фальсіфікацыя гісторыі, асабліва напярэдадні 70-годдзя заканчэння Другой сусветнай вайны. Я дзве кнігі прачытаў менавіта з гэтай «оперы» (а іх, можа, тысячы выдаюцца) і, хоць і не гісторык, не літаратар, але вырашыў узяцца за гістарычныя дакументы, супаставіць іх са сведчаннямі відавочцаў.

З адной кнігай азнаёміўся ў інтэрнэце. Яна — пра жанчын Берліна ў 1945 годзе. Маўляў, як толькі савецкія войскі ўвайшлі ў сталіцу рэйха, то яны забылі пра вайну, а толькі і рабілі, што гвалцілі ўсіх, ад дзяўчынак да 90-гадовых — на вуліцах, у пад'ездах, парках, нават на дахах дамоў. Разлік, пэўна, на тое, што не стане пакалення ветэранаў, якое яшчэ ведае праўду, а моладзь прачытае і скажа: «Пачакайце, а нашы ж таксама, як і гітлераўцы, злачынствамі займаліся». Так, не «белыя-пушыстыя» былі. Я нават дапускаю, што, магчыма, былі адзінкавыя факты згвалтаванняў. Але хто ж тады рэйхстаг браў, калі ўсе здзекаваліся з жанчын?!

Мой бацька закончыў вайну ў Берліне. Ён расказваў, што там менш чым аддзяленнем не хадзілі. Бо хто ж хацеў памяраць напярэдадні Дня Перамогі? У пацвярджэнне гэтаму ў маёй кнізе ёсць сведчанне аднаго з удзельнікаў вайны, майго сваяка. Больш за тое, ад бацькі я ведаў пра загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, як павінны былі паводзіць сябе савецкія воіны на тэрыторыі Германіі. Гэты загад і, на яго падставе, загады камандуючых франтамі Жукава і Ракасоўскага былі аб'яўлены пад Кёнігсбергам, а з усіх салдат узялі распіску. Мне ўдалося азнаёміцца з гэтым загадам Сталіна ад 19 студзеня 1945 года. Там чорным па белым напісана, што не толькі згвалтаванне — уступленне ў палавую сувязь з жанчынай на тэрыторыі Германіі (дабравольна гэта ці не) караецца смерцю.

А ў загадзе войскам 2-га Беларускага фронту ад 21 студзеня 1945 года, пад якім распісаўся ў тым ліку і мой бацька, К. К. Ракасоўскі патрабуе: «Накіраваць пачуццё нянавісці людзей на знішчэнне ворага на полі бою і строга, аж да расстрэлу, караць за марадзёрства, гвалт, грабяжы, бессэнсоўныя падпалы і разбурэнні». Забаранялася заходзіць без дазволу ваеннага каменданта ў жылыя будынкі, можна было карыстацца толькі надворнымі памяшканнямі. Хто бохан хлеба ў немца забярэ — расстрэл.

Былі ў гітлераўскай арміі такія загады? Не было іх.

З усёй армады шматмільённых нямецкіх полчышчаў, што акупіравалі нашу Радзіму, не было ніводнага падраздзялення, якое не заплямiла б сябе злачынствамі супраць мірнага насельніцтва.

Трапіла мне ў рукі і другая кніга. Нямецкі аўтар піша, што як толькі з'явіліся германскія войскі на тэрыторыі Савецкага Саюза, то стаялі чэргі ахвотных запісацца ў паліцыю. Але такі, маўляў, патрабавальны быў адбор, што бралі толькі кожнага дзясятага. Я не ведаю, дзе гэтыя чэргі стаялі, але з маёй роднай вёскі, у якой перад вайной было 1200 жыхароў, пайшлі ў паліцыю толькі пяцёра. Двое з іх, рэпрэсіраваных па так званай разнарадцы, былі пакрыўджаны на савецкую ўладу. А яшчэ траім было ўсё роўна ў каго — абы страляць. Дык і яны, атрымаўшы вінтоўкі, уцяклі ў партызаны да Васіля Захаравіча Каржа.

Піша гэты аўтар і пра дзяцей вайны. Быццам і спачувае ім: немцы толькі кроў з іх бралі, а трапяць да партызан, дык тыя, маўляў, дзяцей адразу расстрэльвалі. Не патрэбны быў лішні рот, а па-другое, партызаны апасаліся дэмаскіроўкі свайго знаходжання.

Дзе, калі, у якім партызанскім атрадзе адбываліся гэтыя забойствы дзяцей? Калі я пішу, то прыводжу архіўныя дакументы, даты, населеныя пункты, сведкаў, няма ніводнага выдуманага прозвішча. Тут жа нічога гэтага не знойдзеце. Але пасыл зроблены — можа, нехта і паверыць.

Дарэчы, у гэтай жа кнізе «гісторык» апісвае, як немцы вучылі сялян гаспадарнічаць. Можа, дзесьці такое і было. Але на нашай тэрыторыі мала хто застаўся жыць, убачыўшы жывога фашыста. Толькі ў адным хляве ў маёй роднай вёсцы спалілі 770 чалавек, сярод якіх дзясяткі грудных дзяцей. Спынілі сваё існаванне цэлыя сваяцкія кланы, роды — Волчакі, Грыцкевічы, Яфімовічы, Сергіені, Піліпцэвічы, Сенюкі, Сітко, Сярчэні, Фількевічы, Шпалоны, Ярковічы, Яфімавы. Па колькасці ахвяр — гэта 10 Хатыняў! А ўсяго падчас карных аперацый «Хорнунг» і «Ніксэ» («Люты» і «Русалка»), пра якія пішу ў кнізе, знішчана, па рознай інфармацыі, ад 15 да 20 тысяч мірных жыхароў. Прыкладна за тыдзень!

— У сваёй кнізе вы абвяргаеце даволі распаўсюджаныя сцвярджэнні, што знішчэнне жыхароў вёсак было звязана выключна з пагрозай гітлераўцам з боку партызан. А таксама прыводзіце факты, што гэтыя злачынствы на сумленні не толькі спецыялізаваных карных падраздзяленняў, але і рэгулярных часцей вермахта...

— Гэтая публікацыя не з'яўляецца навуковым гістарычным даследаваннем. У першую чаргу яна прысвечана памяці ахвяр фашысцкага тэрору. Не хачу навязваць свае меркаванні ў ацэнцы прыведзеных фактаў і архіўных дакументаў. Кожны чытач мае права зрабіць свае, іншыя высновы. Але, дэтальна прааналізаваўшы толькі дзве, найбольш маштабныя і жорсткія карныя аперацыі «Хорнунг» і «Ніксэ», лічу, што ні па якім рэгламенце і статусе іх нельга аднесці да разраду баявых. Яшчэ на стадыі прыняцця рашэння аб іх правядзенні нацысцкае камандаванне і не думала аб баявой аперацыі па знішчэнні партызанскіх атрадаў у гэтай мясцовасці. Карнікі ў многіх выпадках і не збіраліся лезці пад кулі партызан, у лес нават не сунуліся. Яны мэтанакіравана ішлі знішчаць мірнае насельніцтва, рэалізуючы галоўную злачынную дактрыну фашызму — расчышчаць жыццёвую прастору для вялікай і непаўторнай нацыі.

Пазнаёмімся з *«Данясеннем аб баях і зводкай абагульненага вопыту баявых дзеянняў аперацыі «Ніксэ» за подпісам афіцэра сувязі, маёра ахоўнай паліцыі Меўса: «23. 2. 43 г. — выступленне на ўсход ад ракі Случ у раён выходнага становішча для наступу на хутар Плацішча — хутар Колк. Паколькі тут не аказалася ўказаных населеных пунктаў і зімовая дарога на Даманавічы непрыгодная для язды, то батальён, згодна з загадам, прадоўжыў марш у напрамку Ананчыцаў. У 14.00 увайшлі ў Ананчыцы, дзе адбылося аб'яднанне са 111/10 батальёнам, які знаходзіўся там ужо з 12 гадзін...»*.

Пытанне для роздуму: калі планавалася блакіраваць менавіта партызанскія атрады і ваяваць з імі, а не знішчаць мірных жыхароў, то што за дзіўная стратэгія і тактыка? Спачатку думалі вынішчыць партызан у Даманавічах, але перашкодзіла дрэнная дарога? Перадумалі і пайшлі па лепшай дарозе — паліць Ананчыцы. А як жа разведка, месцазнаходжанне партызанскіх атрадаў? Аб гэтым у данясеннях гітлераўцаў не гаворыцца. Ці, можа, самі партызаны перанеслі сустрэчу з Даманавічаў у Ананчыцы, каб эсэсаўцам было лягчэй дабрацца да месца «рысталішча»?

Я сустрэўся з самай пажылой жыхаркай Ананчыцаў Палінай Трафімаўнай Міхнавец. Паводле яе ўспамінаў, не ўсе жыхары вёскі паверылі партызанам, якія казалі, што немцы будуць забіваць усіх без разбору. Катэгарычна адмовіўся хавацца ў лесе, напрыклад, Цімафей Міхнавец. Маўляў, навошта я там, стары і сляпы? Ды і якая ад мяне пагроза немцам... Яго і ўсіх, каго адлавілі ў вёсцы і за ваколіцай, загналі ў школу і спалілі. Зіна Міхнавец была яшчэ слабай, ад родаў не адышла, адмовілася выходзіць з хаты. Дык яе там і спалілі, разам з немаўлём, якое яшчэ і назваць не паспелі... У той дзень у Ананчыцах карнікі знішчылі 96 чалавек — толькі старых, нямоглых і інвалідаў. Ды яшчэ іх сваякоў.

А цяпер пра тое, што, маўляў, у масавых забойствах мірных грамадзян вінаваты каманды СС і паліцэйскія падраздзяленні, а франтавыя часці вермахта тут ні пры чым. Так разважаюць альбо абсалютныя невукі, якія не ведаюць ніводнага дакумента ваеннага перыяду, альбо асобы, пазбаўленыя пачуцця ўласнай годнасці, — каб дагадзіць цяперашнім неанацыстам. З усёй армады шматмільённых нямецкіх полчышчаў, што акупіравалі нашу Радзіму, не было ніводнага падраздзялення, якое не заплямiла б сябе злачынствамі супраць мірнага насельніцтва. У пацвярджэнне — **дакумент з Нацыянальнага архіва Беларусі, загад па 293-й дывізіі вермахта: *«Падрыхтоўка разбурэння населеных пунктаў павінна праводзіцца так, каб: а) да аб'явы аб гэтым у цывільнага насельніцтва не ўзнікала ніякіх падазрэнняў; б) разбурэнне павінна пачацца адразу, адным ударам, у прызначаны час, у адпаведны дзень; в) у населеных пунктах строга сачыць за тым, каб ніхто з цывільных асоб не пакінуў гэты пункт, асабліва з моманту аб'явы аб разбурэнні»***. Наколькі мне ўдалося высветліць, 293-я дывізія вермахта не была спецыяльным карным фарміраваннем.

— У кнізе робіцца спроба вызначыць матэрыяльныя страты Беларусі толькі ад адной аперацыі карнікаў...

Абеліск у памяць аб жыхарах вёскі Пузічы, расстраляных і спаленых фашыстамі.

— У мяне ёсць адпаведныя паказчыкі, каб прыблізна ўявіць сабе тыповую, з 5 членаў сям'і, сялянскую гаспадарку ў вёсках, ператвораных у папялішчы ў выніку карнай аперацыі «Хорнунг».

Рыхтуючы кнігу, я доўга ламаў галаву, як усё гэта ацаніць, ды яшчэ па стане на 1943 год. Абіваў парогі розных фінансавых устаноў, дзе на мяне глядзелі як на іншапланецяніна. І толькі нідзе не атрымаўшы дапамогі, сцяміў, што для чытача і не патрэбна ацэнка на ваенны час. Нагляднасць дае ацэнка ў «зялёных», і менавіта на сённяшні дзень. Дык вось, у сённяшніх цэнах сярэдні кошт сялянскага падворка, знішчанага гітлераўцамі (дом, хлявы, жывёла, прыпасы ежы), складае 30,5 тысячы долараў. А ўвогуле па спаленых і разрабаваных падворках

Карнікі ў многіх выпадках і не збіраліся лезці пад кулі партызан, у лес нават не сунуліся. Яны мэтанакіравана ішлі знішчаць мірнае насельніцтва, рэалізуючы галоўную злачынную дактрыну фашызму — расчышчаць жыццёвую прастору для вялікай і непаўторнай нацыі.

падчас карнай аперацыі «Хорнунг» — 80 мільёнаў долараў.

Трэба вызначыць і страхавыя сумы кошту жыцця. На жаль, нейкай параўнальнай крыніцы звестак мне адшукаць не ўдалося... Бяром за аснову выплаты кампенсацый у Расіі ахвярам авіякатастроф — у сярэднім атрымліваецца 30 тысяч долараў. Памнажаем на 13 тысяч жыхароў, забітых і спаленых у выніку аперацыі «Хорнунг», і гэтая крывавая, бесчалавечная бухгалтэрыя дае лічбу ў 39 мільёнаў долараў. Разам з коштам знішчаных і разрабаваных сялянскіх падворкаў гэта складае 119 мільёнаў долараў! Такія страты за тыдзень вайны толькі ад адной карнай аперацыі! Прычым без уліку грамадскіх будынкаў, сцёртых з зямлі храмаў, школ, бальніц, аптэк, клубаў, бібліятэк, вытворчых памяшканняў, малочных заводаў... Зразумела, кошт кожнага з гэтых будынкаў у разы перавышае кошт любога сялянскага падворка. Таму агульную суму матэрыяльных страт можна падвойваць, а то і патройваць. А такіх аперацый па Беларусі за тры гады было праведзена каля 150!

А як аценіць страты маіх землякоў, якія яшчэ і ў пачатку 1950-х гадоў жылі ў зямлянках, галадалі, не атрымаўшы ні ад сваёй, ні ад германскай дзяржавы ні капеечкі? Пачынаючы жыць з нуля ў выпаленай пустыні, без усякага плана Маршала... Дарэчы, па сёння жыхары спаленых вёсак афіцыйна ні нашым, ні нямецкім бокам не прызнаны ахвярамі фашызму.

Думаю, што і цяпер яшчэ не позна ставіць перад Германіяй пытанні кампенсацый. Беларусь па сёння не можа выйсці на даваенны ўзровень насельніцтва, звыш трох мільёнаў нашых жыхароў знішчылі фашысты. Урад штогод выдаткоўвае з бюджэту салідны кавалак на стымуляванне дзетараджэння, аднаўленне колькасці насельніцтва. Чаму не запатрабаваць гэтыя выплаты ад Германіі? Хаця б на тэрмін, пакуль народзяцца і стануць прадукцыйнай сілай гэтыя тры мільёны нашых суграмадзян.

❐❐❐

Сам я, кажа Аляксандр Яско, ніколі не змог бы знайсці сродкі на выданне кнігі. Дапамог прадпрымальнік, зямляк Сяргей Рамановіч, які таксама палічыў гэта справай жыцця. Ён прачытаў пра аперацыю «Хорнунг» і папрасіў дапоўніць рукапіс матэрыяламі пра аперацыю «Ніксэ», што праводзілася ў яго родных мясцінах.

— На нашай з аўтарам кнігі малой радзіме ў агні вайны толькі кожны чацвёрты застаўся ў жывых, а ў большасці палескіх вёсак партызанскай зоны выжыў толькі адзін з дзесяці, — кажа ***Сяргей РАМАНОВІЧ, генеральны дырэктар вытворчага прадпрыемства «Ніва» Салігорскага раёна****. — Вёска Скоўшын, дзе я нарадзіўся і вырас, таксама была разрабавана і датла спалена фашыстамі. Але гэтая кніга — не проста даніна памяці загінулых. Больш за ўсё патрэбна яна нашым сучаснікам і нашчадкам. Бо той, хто не шануе памяць сваіх продкаў, не ведае, не цэніць, не паважае гісторыю свайго народа, рызыкуе перажыць па-новаму самыя жудасныя яе перыяды. Таму мной зроблена ўсё магчымае, каб кніга «Баліць нават мёртвым» выйшла ў свет.*

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота з архіва Аляксандра ЯСЬКО.

Сямейная газета

Выпуск № 3 (3)

Рашучае «не» двайным стандартам

«Та-та! Та-тач-ка! — разносіцца пад вокнамі нечы захоплены крык. — Разгайдай мяне на арэлях высока-высока, а то мама баіцца!». — «Добра, разгайдаю, — згаджаецца бацька, — толькі трымайся мацней. А маме не скажам, каб не хвалявалася».

Многія нават не ведаюць, што ў лістападзе ёсць цэлыя два дні мужчын — Сусветны дзень мужчын, заснаваны паводле прапановы Міхаіла Гарбачова ў першую суботу лістапада, і Міжнародны мужчынскі дзень, які ў шэрагу краін адзначаюць 19 лістапада.

Атрымліваецца суцэльная несправядлівасць. Заморскія бацькі, значыць, уздымаюць самаацэнку дзякуючы гэтым святам, а нашым што дастаецца? Новы хіт далёка не новай эстраднай «зоркі» «О, Божа, які мужчына, я хачу ад цябе сына!»?

Жонкі рашуча бяруць з нязграбных рук маладых бацькоў немаўлят: «Ты ж не ўмееш, дай я!» А потым здзіўляюцца, чаму таты самаліквідаваліся ад выхавання дзяцей, і наогул інстытут бацькоўства не відаць з-пад плінтуса. Маці прывязваюць сыноў да спадніцы нябачнымі, але трывалымі ніткамі гіперапекі і ўсё ніяк не ўцямяць, чаму іх крывіначка шчыльна засела ва ўзросце і стане інфанта. Кіраўнікі і саслужыўцы глядзяць на татаў, якія вырашаюць скарыстаць законнае права сысці ў дэкрэт, без перабольшання, як на сініх васьміногаў з сузор'я Плеяд... У які паваротны момант гісторыі нарадзіўся і ўмацаваўся гэты дзіўны двайны стандарт: тата ў доме галоўны, але ў справах сям'і і выхавання дзяцей — збоку прыпёку? Нарэшце, чаму саміх мужчын такі падыход задавальняе?! Чаму многія з іх гатовы браць на сябе бацькоўскія абавязкі толькі на словах?

Зрэшты, не буду абагульняць — не ўсе, далёка не ўсе. Падчас падрыхтоўкі сённяшняга выпуску «Сямейнай газеты», які мы вырашылі прысвяціць бацькам, давялося сустрэцца і пагутарыць з татамі, адрознымі па «стажы», статусе і ўзросце. Але ўсіх іх аб'ядноўвае неабыякавасць, адказнасць за сваіх дзяцей, жаданне быць для іх найлепшым бацькам і гатоўнасць працаваць дзеля гэтага, колькі спатрэбіцца. А значыць, усё не безнадзейна. Асабіста я ў гэта веру.

— Ведаеш, які самы вялікі камплімент я атрымаў ад дзяцей? — спытаўся аднойчы добры знаёмы, бацька дзвюх ужо дарослых дзяўчат. — Яны ўрачыста паабяцалі адна адной, што будуць шукаць жаніхоў, падобных да мяне…

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ Праверана часам

Бацька шасці дзяцей Андрэй ІВАНОЎ:

«ШТО РАЗБУРАЕ ЛЮБУЮ СЯМ'Ю? УЗАЕМНЫЯ ПАПРОКІ»

Сям'я Івановых — і традыцыйная, і незвычайная адначасова. Пачаць з таго, што бацька Андрэй, маючы вялізны досвед кіраўніка высокага ўзроўню, адмовіўся ад прэстыжных пасад дзеля ўласнай справы. Цяпер паспяхова сумяшчае мноства кірункаў: бізнес-трэнер, коўч, лектар, кансультант па цвярозасці пры ААН, аўтар больш чым 50 адукацыйных праектаў для бізнесу ў Беларусі, Расіі і ва Украіне, працуе ў Інстытуце бізнесу і менеджмент-тэхналогій БДУ. Мама Ірына таксама зрабіла няпросты выбар: яна працуе... мамай, 24 гадзіны ў суткі, без выхадных і водпускаў. А ў сям'і падрастаюць не двое, ні нават не трое, а — шасцёра дзяцей: тры хлопцы — Веляслаў, Златазар і Гардзей, і тры дзяўчыны — Дарына, Рада і Мілана.

Пакуль Ірына чакае са школы старэйшых дзяцей і даглядае малодшага Гардзея, якому ўсяго 9 месяцаў, Андрэй Іваноў адказвае на мае пытанні за абаіх — хто ў сям'і галоўны, як захапіць дзяцей уласным прыкладам і як зберагчы цеплыню пачуццяў, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці.

ТАНДЭМ, ЯКІ ВЯЗЕ ВАСЬМЯРЫХ

— Мець вялікую сям'ю — насамрэч, аб'ектыўнае жаданне, якое закладзена ў падсвядомасці чалавека, перш за ўсё жанчыны, бо мацярынскі інстынкт закладзены прыродай, а бацькоўскі — выпрацоўваецца з цягам часу. Уся справа ў фарміраванні грамадствам правільнай мадэлі паводзін. Гэта, ведаеце, як з агуркамі: пакладзі іх у добры расол — смачныя будуць, у дрэнны — дрэнныя, не з'ясі. А ў сучасную мадэль паводзін беларусаў, на жаль, неяк не ўкладваюцца сямейныя каштоўнасці. Многія людзі шчыра не разумеюць: шчасце заключаецца зусім не ў тым, каб памяняць красовер сярэдняга класа на больш прэстыжны. Для іх красовер робіцца не сродкам — з'ездзіць адпачыць, а мэтай і спосабам дэманстрацыі пэўнага поспеху.

Я не ведаў, што ў мяне будзе шасцёра дзяцей — проста мы з жонкай не перашкаджалі працэсу і, мабыць, не прагаворваючы гэтага ўголас, насамрэч хацелі менавіта вялікую сям'ю.

— Цяпер часцей даводзіцца чуць пра планаванне сям'і, прадумванне на пяць крокаў наперад, каб даць дзецям усё патрэбнае і «не пладзіць галечу»...

— Лічу гэта глупствам. Мы ж не пра матэматыку гаворым — які рацыянальны падыход? Тут многія рэчы трэба прымаць на веру, інтуітыўна адчуваць — не толькі сябе, але і адно аднаго. Я бачу, што многія бацькі сёння «шпігуюць» сваіх дзяцей усякімі моднымі штучкамі — развіваючыя секцыі з трох гадоў, англійская мова з двух... Хоць самае галоўнае зусім іншае: фарміраванне душэўнасці, чалавечнасці ў маленькім чалавеку, каб ён меў здольнасць адгукацца на патрэбы іншага. Гэта ўсё фарміруецца не надта складана: праз працу — узгадайце геніяльнага педагога Макаранку, праз паслядоўны асабісты прыклад... Многія чамусьці нацэлены выхоўваць дзяцей так, каб тыя «чагосьці дабіліся», сталі вышэй за іншых, сталі над кімсьці, — гадуюць эгацэнтрыкаў. Выхаваныя такім чынам маладыя людзі, ствараючы сям'ю, якраз і пачынаюць прыкідваць, ці могуць яны сабе «дазволіць» дзіця. Гэта дэструктыўны шлях. Як толькі пачалі сумнявацца, ставіць матэрыяльнае вышэй за духоўнае — нічога не атрымаецца.

— Улічваючы ваш «сібірскі характар» і доўгі перыяд працы топ-менеджарам, не мае сэнсу ўдакладняць, хто ў вашай сям'і галоўны?

— Першы тандэм, які стварыў Бог, — гэта мужчына і жанчына, і саборны інтэлект заўжды мацнейшы за індывідуальны. З цягам часу я пачаў гэта разумець. Таму ў сям'і прыняцце рашэнняў пераважна на мне, але цяпер я ўсё часцей раюся з жонкай. Бо недааценьваць жаночае, інтуітыўнае бачанне тых ці іншых падзей, адштурхоўваць яго «на той простай падставе, што я мужчына», — лічу няправільным. Культуру стаўлення адно да аднаго з павагай, разуменнем і любоўю наогул стараемся культываваць.

— Інакш кажучы, у вас патрыярхальны падыход: мужчына — здабытчык і стваральнік умоў, а жанчына — захавальніца сямейнага ачага, якая «абжывае» сямейную прастору, напаўняе дэталямі. Няўжо ніколі не абмяркоўвалі з Ірынай яе рэалізацыю ў прафесіі, па-за межамі сям'і?

— Больш пачалі гаварыць аб гэтым хіба зараз, пасля 17 гадоў знаёмства. Я прынцыпова ніколі не ставіў і не пастаўлю пытанне аб тым, што мы, муж і жонка, бацька і маці, абавязаны «ўкалваць» удваіх. Іншая справа, калі дзеці вырастаюць і хочацца раскрыць у сабе новыя таленты. Таму абмяркоўваем, каб праз некаторы час паўдзельнічаць у сумесных праектах, цікавых для нас абаіх. Нядаўна Ірыне паступіла прапанова стаць старшынёй аднаго бацькоўскага клуба. Магчыма, гэта выльецца ў перадачу іншым бацькам свайго вопыту — статус маці 6 дзяцей ужо дазваляе. Але пакуль што мама патрэбна дзецям як паветра.

АД МАЛОГА ДА ВЯЛІКАГА

— Дзеці? Яны ўсе розныя. Ведаеце, кажуць, што дзеці — нашы люстэркі. Прынамсі, на сабе я гэта адчуў. Напрыклад, старэйшая дачка, якой напрыканцы лістапада споўніцца 15 гадоў, нагадвае мне сябе самога, толькі 15-гадовай даўніны. Яна спрабуе сябе ў фотадызайне, зацікавілася сеткавым маркетынгам — словам, праяўляе ініцыятыву і шукае сваё месца ў будучыні. Часам задае вельмі сур'ёзныя пытанні, на якія я заўжды стараюся адказаць шчыра, дакладна, аргументавана, на зразумелай падлетку мове...

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ»)

■ Сям'я — сям'і

Важкая, ды не цяжкая

Ужо больш за 400 тон рэчаў сабрана падчас дабрачыннай акцыі «Сям'я — сям'і». Яна ўзяла старт у Мінску 1 кастрычніка і будзе доўжыцца да канца года.

Сталічныя жыхары актыўна перадаюць дабротныя, але ўжо не патрэбныя ім рэчы ў раённыя тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якія, у сваю чаргу, перадаюць малазабяспечаным, шматдзетным сем'ям, а таксама тым, што выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Як адзначае старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама Жанна Рамановіч, па просьбах абодвух бакоў заўважна пашырыўся асартымент рэчаў, якія прымаюцца: гэта не толькі адзенне, але і мэбля (у тым ліку дзіцячыя ложкі), і бытавая тэхніка. Супрацоўнікі цэнтраў чакаюць усіх ахвотных далучыцца да акцыі ў будныя дні з 9 да 18 гадзін, тлумачаць правілы прыёму рэчаў, а пры неабходнасці могуць і самі прыехаць да грамадзян дадому, каб забраць дабрачынную дапамогу.

■ Мужчынскія справы

ЗДОЛЕЎ СТАЦЬ ТАТАМ? ЗАСТАВАЙСЯ ІМ!

Дзень бацькі ў нашай краіне — свята не афіцыйнае, але хто сказаў, што гэта перашкаджае яго адзначаць? І зусім ужо не абавязкова для гэтага чакаць ініцыятывы «зверху».

У Брэсце, напрыклад, свята для татаў паспяхова ладзіцца ўжо некалькі гадоў. «Сёлета мы правялі яго на базе тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Маскоўскага раёна, зрабілі канцэртную праграму і тэатральную пастаноўку, прыцягнулі да ўдзелу цэлы шэраг арганізацый, спартыўных комплексаў, — распавядае брастаўчанін **Алег ГОЛАС, кіраўнік моладзевага грамадскага аб'яднання «Спадчына»,** якое і было заснавальнікам «Клуба любячых бацькоў Берасцейшчыны». — У першую чаргу ўшаноўвалі бацькоў, якія ў адзіночку выхоўваюць дзяцей — на жаль, іх у нашым рэгіёне з кожным годам усё больш (толькі ў нашым раёне іх каля 100). Таксама сёлета віншавалі каля раддома тых, хто стаў бацькам, уручалі ім віншавальныя граматы і памяткі аб правах і абавязках бацькоў… Словам, спрабуем пакрысе інстытут бацькоўства не тое што ўзняць, хутчэй, рэанімаваць».

Ёсць у гэтага руху пэўныя праблемы, але звязаны яны найперш з цяжкасцю на пад'ём саміх бацькоў, з тым, што многія з татаў-адзіночак саромеюцца свайго статусу і неахвотна ідуць на кантакт, хіба толькі калі трэба абараніць свае правы, скажам, у судзе. Але, калі ёсць імпэт і вялікае жаданне зрабіць сваё жыццё цікавейшым, нішто не перашкодзіць гэтаму, упэўнены Алег. Прынамсі, ён сам мае досвед, што значыць быць татам-адзіночкам, а цяпер паспяхова спалучае працу і актыўную валанцёрскую дзейнасць з выхаваннем дзяцей, малодшаму з якіх усяго некалькі месяцаў. «У кожным тату насамрэч закладзена гэта — браць на сябе адказнасць, клапаціцца аб дзецях і паказваць ім прыклад. Трэба толькі крыху падштурхнуць бацькоў, каб яны прачнуліся і не плылі па цячэнні, а дзейнічалі. Магчыма, калі нам удасца ўсталяваць помнік бацьку ў Брэсце, гэта і будзе тым самым штуршком?» — разважае Алег Голас.

На тых жа грамадскіх пачатках і пры ўдзеле актыўных татаў дзейнічае клуб бацькоў «Я тата» ў Гомелі, тата-школы ў Бабруйску і ў Мінску. Далучайцеся, таты з іншых гарадоў і мястэчак, рабіцеся найлепшымі для сваіх дзяцей — усё ў вашых руках!

■ Болевая кропка

ДОМ, ДЗЕ ВЯРТАЮЦЬ НАДЗЕЮ

Няма для дзіцяці большай бяды, як аказацца сіратой. Здараецца, што бацькі гінуць з-за нясчасных выпадкаў. Гэта можна назваць па-рознаму: рок, фатум… Але куды часцей дзеці становяцца сіротамі сацыяльнымі. Гэта значыць, што бацькі ў іх жывыя, ды толькі ўласнае дзіця іх не цікавіць зусім.

Даволі часта ў грамадстве блытаюць паміж сабой прытулак і дзіцячы дом. Але розніца паміж гэтымі ўстановамі каласальная. У інтэрнаце дзеці жывуць пастаянна, пакуль ім не споўніцца 18 гадоў. У прытулку яны могуць знаходзіцца не больш за шэсць месяцаў. Трапляюць дзеці сюды па пастанове камісіі па справах непаўналетніх пры раённай адміністрацыі. Калі праводзіць аналогію, то прытулак у нейкім сэнсе нагадвае перасадачную станцыю, адкуль для дзіцяці адкрываюцца некалькі шляхоў. Часцей за ўсё малыя вяртаюцца да сваіх біялагічных бацькоў, якія працвярэзіліся і знайшлі хоць нейкую пастаянную працу. Але значная іх частка адпраўляецца пад апеку, у прыёмную сям'ю ці дзіцячы дом.

Зараз у прытулку пры сацыяльна-педагагічным цэнтры Заводскага раёна сталіцы часова пражываюць 22 дзіцяці. З пачатку года сцены ўстановы пакінулі 37 непаўналетніх дзяцей. Дваццаць з іх вярнуліся ў свае біялагічныя сем'і. Адзінаццаць знайшлі новыя прыёмныя сем'і. І толькі чацвёра малых адправіліся ў дом-інтэрнат.

Разам з намеснікам дырэктара прытулку Таццянай Пілецкай выпраўляемся ў невялікую экскурсію. Як ні дзіўна, але ў разгар дня тут панує цішыня. Дзеці з рукзакамі пачынаюць з'яўляцца праз лічаныя хвіліны. Іх позіркі на незнаёмага чалавека дзіцячымі назваць нельга. У вачах як быццам застылі цені ад перажытых болю ды крыўды і ўжо дарослая мудрасць…

— Нашы выхаванцы ходзяць у звычайную агульнаадукацыйную школу. Іх туды адводзяць і прыводзяць назад выхавацелі. Што адметна, аднакласнікі ставяцца да нашых дзяцей без якойсьці пагарды. Наадварот, стараюцца хоць нечым дапамагчы: прынясуць цацку ці непатрэбную вопратку…

— Прытулак існуе, каб дапамагчы не толькі дзецям, але і іх бацькам, — гаворыць дырэктар Алена Багамолава. — Тое, што з сям'і на пэўны час прымусова забралі дзіця, — гэта вынік асацыяльных паводзін дарослых. Мне вядомы выпадкі, калі лепшай агітацыяй да перамены ладу жыцця бацькоў былі іх візіты да змешчаных у прытулак дзяцей. Яны ж бачаць няўзброеным вокам розніцу ва ўмовах для пражывання і развіцця малога дома і тут. Пасля гэтага завязваюць з «зялёным змеем» і ўладкоўваюцца на працу. Хацелася б толькі, каб такіх бацькоў, якія сапраўды выправіліся, станавілася больш…

«Наша задача — не забраць, а вярнуць»

Дзеці трапляюць у прытулак толькі тады, калі існуе непасрэдная пагроза іх жыццю і здароўю: хранічная антысанітарыя ў кватэрах, якія ператвараюцца ў прытоны, беспрасветнае п'янства бацькоў, ад убачаных цацак, бо дома ледзь не адзінымі іх забаўкамі былі пустыя бутэлькі з-пад спіртнога.

У гульнявым пакоі пануе поўны парадак. Паабапал сцен стаяць вялізныя канапы, на падлозе, засланай мяккімі дыванамі, — безліч самых розных цацак, каля сценкі — два тэлевізары з DVD-прайгравальнікамі. Побач ляжыць стос дыскаў. Чаго тут толькі няма — і развіваючыя праграмы, і мультфільмы на любы густ, і кніжкі… Далей — гульнявы пакой, прызначаны ўжо для падлеткаў. Тут на палічцы прыкметна больш вучэбнай літаратуры.

— Як правіла, у цяжкі для сям'і час тапіць праблемы ў спіртным пачынаюць мужчыны. Маці ж узвальвае на свае плечы цяжар падпрацовак. Гэта сацыяльна небяспечнае становішча, але дзіця не мае патрэбы ў дзяржаўнай абароне: мінімальныя патрэбы яго ў вопратцы і харчаванні ўсё ж будуць забяспечаны. Чым раней выяўляецца такая праблемная сям'я, тым больш у нас шанцаў дапамагчы ёй рэабілітавацца. У прытулку для гэтага працуюць спецыялісты — сацыяльныя педагогі і псіхолагі. Яны суправаджаюць гэтыя сем'і. Мы ж працуем не для таго, каб дзяцей забраць, а для таго, каб іх вярнуць.

…У сталовай ужо ўсё падрыхтавана да абеду. Асобна стаяць сталы для дашкалят і падлеткаў. Нават крэслы да іх падабраны з улікам росту. Адметна, што дзеці ставяцца да хлеба як да святыні. Яны ніколі не кінуць недаедак у сметніцу, а з'ядуць нават крошкі. Спярша дзеці нават употай выносяць са сталовай кавалкі хлеба і хаваюць іх. Але педагогі настойліва пераконваюць малых: яго хопіць на ўсіх. Многія ўпершыню бачаць тут такія звыклыя для нас бананы, апельсіны…

— Дзеці трапляюць у прытулак вельмі худымі, — працягвае Таццяна Пілецкая. — Бацькі шмат грошай спускаюць на выпіўку, а вось аб тым, як накарміць дзяцей, не дбаюць зусім. Малы або знаходзіць нешта ядомае сам, або яму штосьці даюць употай чуллівыя суседзі. Але зразумела, што такое выпадковае сілкаванне паўнавартасным назваць нельга. Тут жа дзеці атрымліваюць санаторную порцыю. Ад таго, як яны

Спярша дзеці нават употай выносяць са сталовай кавалкі хлеба і хаваюць іх. Але педагогі настойліва пераконваюць малых: яго хопіць на ўсіх. Многія ўпершыню бачаць тут такія звыклыя для нас бананы, апельсіны...

Напрыканцы мінулага года ў Беларусі было амаль 24 тысячы сірот. Тры чвэрці з іх — сіроты сацыяльныя. 14 тысяч дзяцей у краіне летась пражывалі ў сацыяльна небяспечных умовах.

пастаянныя здзекі… Уявіце сабе: чатырохгадовыя дзеці не ўмеюць карыстацца лыжкай і відэльцам. Многія толькі ў прыюце апранулі на сябе ўпершыню за доўгі час нешта прыстойнае замест падабраных са звалак рызманоў. Чыстая пасцельная бялізна таксама для многіх у навінку. Вочы ў дзетак разбягаюцца шых прагулкі адбываюцца два разы на дзень, для больш сталых — адзін. Спаць яны кладуцца а дзявятай вечара. Невялікае паслабленне ёсць толькі ў суботу.

Калі назад дарогі няма

Безумоўна, дзеці сумуюць без маці і таты, якія, дарэчы, могуць наведваць іх хоць штодня. Супрацоўнікі прытулку не ствараюць ніякіх штучных перашкод. Наадварот, частата гэтых візітаў наўпрост уплывае на далейшы лёс дзіцяці. Малыя самі мараць аб тым, каб маці кінула піць, каб вярнуцца ў родны кут. Але кагосьці чапляе чорным крылом бяда: пазбавіцца бацькоўскай пяшчоты пры жывых бацьку і маці.

— Адзінаццацігадовы М. праз паўгода знаходжання ў прытулку не хацеў вяртацца ў сваю колішнюю сям'ю. Ён бачыў: там ніякіх, няхай сабе і дробных, перспектыў няма ўвогуле, — успамінае намеснік дырэктара Таццяна Лукомская. — Мне прыгадваюцца выпадкі, калі пасля змяшчэння дзетак у прытулак бацькі паводзілі сябе так, як быццам нічога і не змянілася. Яны ніколі не прыходзілі нават праведаць сыноў і дачок. Складваецца ўражанне, што гэтыя людзі проста забыліся, што ў іх ёсць малыя дзеці, што ім патрэбны догляд і клопат… Як можна быць такімі бяздушнымі?

Быў у нас трынаццацігадовы падлетак, які трапіў сюды з-за беспрабуднага п'янства бацькоў. Гэта быў прыроджаны лідар! Ён імкнуўся вырашаць усе канфлікты паміж малымі. Дзеці яго слухаліся. У сваю ранейшую сям'ю ён не мог вярнуцца (бацькоў пазбавілі адпаведных правоў), ды і не надта гэтага хацеў. На ўсынаўленне не трапіў — падлеткаў неахвотна бяруць у прыёмныя сем'і з-за іх узросту. І нічога іншага не заставалася, як толькі накіраваць яго ў інтэрнат. Страшная праблема: і новых бацькоў не знайшлося, і ранейшыя за розум не ўзяліся…

Дзесяцігадовая дзяўчынка А. сутыкнулася з непрыкрытым цынізмам з боку бацькоў, якія пакутавалі на алкагалізм, ужо ў прытулку. Яны проста падаліся ва ўцёкі, каб не працаваць і не плаціць штомесяц на ўтрыманне дачкі адзін мільён рублёў. Проста дзікунства… Прага свабоды дзеянняў у скажоным выглядзе цалкам задушыла бацькоўскія пачуцці.

***

Аб выпадках, калі дзіця апынулася ў цяжкай сітуацыі, у прытулак можа паведаміць кожны чалавек. Неўзабаве наступяць зімовыя халады, а малыя з праблемных сем'яў да іх, як правіла, не падрыхтаваны. У іх няма цёплай вопраткі, яны не накормлены. Вядома, чымсьці дапамогуць неабыякавыя да чужой бяды суседзі. Аднак трымаюць гэта ў таямніцы. Некаторыя людзі памылкова лічаць такія зваротыі… «стукацтвам». Ды вось толькі такая канфармісцкая «палітыка» прыводзіць урэшце рэшт да таго, што сітуацыя выходзіць з-пад кантролю. Алкагалізм бацькоў прагрэсіруе, і кропка невяртання набліжаецца ўсё хутчэй…

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Надзеі БУЖАН

ЯКІЯ ЯКАСЦІ ПАВІНЕН ВЫХОЎВАЦЬ У ДЗЕЦЯХ БАЦЬКА?

Аляксандр ЛАСТОЎСКІ, начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, малады бацька:

— Па-першае, натуральна, дабрадзейнасць. Я маю на ўвазе самае першае, базавае ўсведамленне, што такое «добра» і «дрэнна», чым адрозніваюцца дабро і зло, што можна і нельга. Па вялікім рахунку, сюды адносяцца ўсе 10 біблейскіх запаведзяў, пераказаныя зразумелай дзецям мовай. Па-другое, менавіта бацька павінен выхаваць паважлівае стаўленне да іншых людзей — да старэйшых, да жанчын, да слабейшых за цябе і г.д. Па-трэцяе, інтэлект, здольнасць мысліць нестандартна, шукаць розныя шляхі вырашэння праблемы — усё гэта да таты. Ну і, безумоўна, уменне пастаяць за сябе, адстаяць сваё меркаванне, не даць здзейсніцца несправядлівасці, абараніць слабага перад моцным... На словах усё выходзіць лёгка і правільна, але справа ў тым, што ўсе гэтыя словы кожнаму бацьку трэба падмацоўваць учынкамі. Нават калі дзіця яшчэ вельмі маленькае, яшчэ не гаворыць і не разумее некаторых слоў, яно добра бачыць, як тата ставіцца да мамы, як размаўляе з бабуляй і дзядулем. Таму ліслівасць і двайныя стандарты тут не пройдуць.

Сучасныя дзеці наогул вельмі хутка пераймаюць ад бацькоў тыя ці іншыя ўменні. Мой сын, якому ўсяго год і 6 месяцаў, ужо з лёгкасцю можа разблакіраваць планшэт ці паставіць яго на зарадку... Мяне гэта нават крыху засмучае.

Аксана ВЕЧАР, тэлевядучая, мама дваіх дачок:

— Як вы разумееце, я магу казаць толькі пра выхаванне дачок. Мне здаецца, тата павінен з самага юнага ўзросту навучыць дзяўчат адчуванню жаноцкасці. Каб яны выразна ўсведамлялі, што ў пэўных момантах трэба пабыць слабымі, бездапаможнымі і ведаць, што заўжды ёсць моцнае плячо, на якое можна абаперціся. Мабыць, у наш час казаць пра тое, што варта быць слабымі, не модна, але па жыцці гэта рана ці позна прыдасца. Я мяркую па сваіх паненках: яны з боку бацькі адчуваюць бясконцую пяшчоту і падтрымку, а гэта дарагога каштуе. Спадзяюся, і ў спадарожнікі жыцця яны абяруць такіх самых па характары хлопцаў, якім заўжды можна будзе давяраць у складаных сітуацыях.

Ці трэба вучыць «дабру з кулакамі», каб маглі пастаяць за сябе? Не ведаю. Напрыклад, мая старэйшая дачка і без таго настолькі баявітая, катэгарычная да хлапцоў: «З імі нецікава, яны ж усе дурні!». Так што, мабыць, наадварот, нам трэба будзе даводзіць, што з узростам мужчыны змяняюцца, сталеюць і робяцца лепшымі і гожымі *(смяецца)*.

ПРАЯВІ ТАЛЕНТ!

Беларускі дзіцячы фонд аб'яўляе аб пачатку новага творчага рэспубліканскага конкурсу для дзяцей-сірот і дзяцей-інвалідаў.

У конкурсе па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве «Куфэрак дзіцячых радасцяў» могуць браць удзел дзеці ад 10 да 18 гадоў. Галоўным падарункам стане ўдзел у выставе адной са сталічных галерэй. 15 самых крэатыўных канкурсантаў Дзіцячы фонд запросіць у сталіцу ў дні вясновых канікулаў для ўдзелу ў майстар-класах, сустрэчах з майстрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Конкурс працягнецца да 1 сакавіка 2014 года.

З умовамі можна азнаёміцца на сайце www.bcf.by.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ШТО РАЗБУРАЕ ЛЮБУЮ СЯМ'Ю? УЗАЕМНЫЯ ПАПРОКІ»

Каб не выхаваць хама, які прызвычаіцца «браць горлам» ці будзе збіваць усіх, хто яму не даспадобы, маральны аспект трэба ставіць перадусім. І з самага пачатку тлумачыць, што добра, а што дрэнна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Сярэднія дзеці, якім 6, 8 і 10 гадоў, дэманструюць нейкі пераходны момант — і я сам адчувальна мяняюся побач з імі. Гледзячы на малодшага, якому яшчэ няма годзіка, бачу, як ён адчувае агульны настрой, кантактуе з намі — рухамі, жэстамі... У свой час мне гэтага не хапала. Са старэйшым братам была розніца ў 7 гадоў, і з-за гэтага адчуваў сябе як быццам самотным. У вялікай сям'і зусім інакш. Яны сварацца, могуць нават пабіцца, паспрачацца за ноўтбук — усе ж такі дзеці... Але пры тым яны ж найлепш сябруюць і знаходзяць агульную мову, а калі ўсе разам гуляюць ці забаўляюць малога — наймілейшай для сэрца карціны проста няма!

— У іх вельмі прыгожыя і незвычайныя імёны...

— Хацелася выказаць сувязь з адвечным жыццём, з мінулым і будучым, з нашымі каранямі. Імя наогул вельмі сур'ёзна ўплывае на жыццё кожнага чалавека, таму мы з жонкай загадзя абіралі і абмяркоўвалі варыянты, як назваць кожнага з дзяцей. ...Малодшага сына Ірына нарадзіла ў 42 гады. Гэта быў выбух, феерверк эмоцый не толькі ў нас, але і ва ўсіх людзей, якія мяне ведаюць. У інстытуце гаворкі хадзілі з паўгода. І пачуццё гонару за сябе самога, за маю жонку (дарэчы, адзначаную ордэнам Маці), за тое, што нам абаім не сорамна жыць, мы ўвасобілі ў імені Гардзей.

— Якія якасці ў сваіх дзецях вы імкняцеся развіць, а якія — трымаць пад кантролем?

— На мой погляд, трэба толькі паказаць дзецям шляхі выхаду ў дарослась, а яны ўжо самі павінны выбраць, па якім шляху ісці. Каб не выхаваць хама, які прызвычаіцца «браць горлам» ці будзе збіваць усіх, хто яму не даспадобы, маральны аспект трэба ставіць перадусім. І з самага пачатку тлумачыць, што добра, а што дрэнна. Далей ужо — усё, што тычыцца творчых схільнасцяў і фізічных навыкаў. Мае дзеці займаюцца танцамі, гімнастыкай, спяваюць, іграюць на розных музычных інструментах. Старэйшыя сыны, якім 12 і 13 гадоў, захапіліся стрыт-воркаўтам (масавыя фізічныя практыкаванні на вулічных спартпляцоўках. — **Аўт.**), бралі ўдзел у адкрыцці гарадской пляцоўкі і засвоілі ўжо вельмі складаныя элементы. Мяне гэта ўсцешвае — значыць, яны вырастуць моцнымі. А калі будуць, як мы іх вучым, найперш актыўна карыстацца «шэрым рэчывам», то і разумнымі, здольнымі стварыць камфортныя ўмовы ўжо для ўласных

У нас таксама былі ў жыцці вельмі напружаныя перыяды, калі мы з жонкай вельмі акуратна, абачліва падбіралі кожнае слова, каб толькі не сарвацца і не сказаць штосьці непапраўнае, аб чым потым пашкадуем.

вялікіх сем'яў. Я не стамляюся паўтараць ім, што галоўнае — у кожнага ў галаве. Вада камень точыць: адзін раз дзіця паслухае, усміхнецца і пойдзе гуляць, другі, трэці, дзясяты... І пакрысе стане выкарыстоўваць бацькоўскія парады. Тым больш, мы з жонкай стараемся падмацоўваць усе словы ўласным прыкладам. Наконт абмежаванняў. Катэгарычна пад забаронай у нас алкаголь і цыгарэты, недапушчальныя амаральныя паводзіны. Калі ж дзеці робяць памылкі, якія даюць пэўны вопыт (скажам, бяруцца за незнаёмую справу без падрыхтоўкі), такія выпрабаванні сіл толькі загартоўваюць.

Датрываць да шчасця

— Якой бы моцнай і дружнай ні была сям'я, усё адно ў ёй бываюць крызісы. З вашага вопыту — што дапамагае іх пераадольваць і ісці далей усім разам?

— Сапраўды, сям'і без крызісаў не бывае. Кожны такі крызіс — гэта пэўнае выпрабаванне на сталасць. Калі канфлікт — гэта выключна сутыкненне інтарэсаў двух эгацэнтрыкаў з пазіцыі «альбо па-мойму, альбо — усё», то сям'я, на жаль, не вытрывае. Калі ж разумець сям'ю як неад'емную частку свайго жыцця, за якую трэба змагацца, ты гэтае выпрабаванне пройдзеш. Што разбурае любую сямю? Папрок. Калі жонка ці муж кажа: «Гэта ўсё з-за цябе» — адваротны адлік пайшоў. А патрэбна, наадварот, жаданне адчуць і дапамагчы адно аднаму... У нас таксама былі ў жыцці вельмі напружаныя перыяды, калі мы з жонкай вельмі акуратна, абачліва падбіралі кожнае слова, каб толькі не сарвацца і не сказаць штосьці непапраўнае, аб чым потым пашкадуем. Але нават тады я ўсведамляў, што не маю права папракнуць чымсьці жонку ці дзяцей. Проста ёсць сітуацыя, і трэба не шукаць у ёй вінаватага, не раніць кагосьці, а выпраўляць яе, каб захаваць самае галоўнае і дарагое — сям'ю. Дарэчы, тое ж самае справядліва і ў вырашэнні дзяржаўнага пытання дэмаграфіі. Пакуль усе зацікаўленыя структуры не будуць дзейнічаць згладжана, не навучацца весці дыялог без перацягвання коўдры кожная ў свой бок — пытанне дэмаграфічнай бяспекі будзе вырашацца фрагментарна.

— Вялікай сям'і цяжка сабрацца разам з-за розных графікаў вучобы, працы. І ўсё ж, што вы абавязкова імкняцеся рабіць усе разам?

— Наогул, вечарамі стараемся так ці інакш з кожным абмеркаваць яго справы і падзяліцца ўражаннямі, як прайшоў дзень. Але, па шчырасці, самыя дарагія для мяне моманты — калі ўсе супакойваюцца, кладуцца спаць і ў доме пануе такая асаблівая цішыня, ажно да звону ў вушах — калі асабліва цэніш, які ты насамрэч шчаслівы.

...Выбрацца адпачываць увасьмярых — гэта вялікі клопат найперш для жонкі, але, як мінімум летам, мы выязджаем усе разам за горад, на сядзібу, а там ужо кожнаму знойдзецца занятак для душы. Таксама праводзім разам водпуск — праўда, ездзім толькі па Беларусі. Самае ўлюбёнае сямейнае свята — натуральна, Новы год. Мы ўспамінаем, што добрага адбылося за мінулы год, і абмяркоўваем, што хочам зрабіць у наступным, — на тое і чароўная ноч, каб загадваць жаданні...

— На ваш погляд, шчаслівая сям'я — гэта...

— Гэта вялікая сям'я. Якая пераадолела свае крызісы і пры гэтым засталася моцнай. Якая не замыкаецца ў самой сабе і здольная аддаваць, дзяліцца сваім шчасцем з іншымі.

Фота з архіву ІВАНОВЫХ.

КАЛІ ТАТА — ЗА МАМУ...

Памятаеце старую дзіцячую песеньку, у якой сцвярджалася: маўляў, тата можа ўсё, што заўгодна, толькі мамай не можа быць?Падпалкоўнік Дзмітрый Круглік на ўласным вопыце ведае: калі вельмі спатрэбіцца, тата можа ўсё. Амаль усё. Хутка 4 гады, як ён выхоўвае сына Мікіту адзін.

— Толькі ў нас, вайскоўцаў, няма такога паняцця — «тата-адзіночка», — папраўляе мяне Дзмітрый з пазіцыі прафесійнага юрыста. — Паводле закона, я «бацька-ваеннаслужачы, які выхоўвае дзіця без маці».

У Мікітавай мамы выявілі анкалагічнае захворванне. На жаль, выявілі вельмі позна. «Толькі нядаўна сыну сказаў, што мама памерла. Яна, як ніхто, умела любіць. Яе на ўсіх хапала: на сваіх бацькоў, на Віялету (гэта ўжо дарослая яе дачка ад першага шлюбу), на нас з Мікіткам ды яшчэ на сваіх вучняў — яна была настаўніцай ад Бога…».

Пра ўвагу і строгасць

— Не магу сказаць, каб я застаўся з малым дзіцем зусім ужо адзін, — распавядае Дзмітрый. — Адразу пасля пахавання падтрымалі бацькі жонкі, якія забралі Мікітку да сябе ў Палтаўскую вобласць. Ён там правёў паўгода, пакуль не прыйшоў час ісці ў дзіцячы садок. Дый цяпер кожнае лета, з мая па жнівень, праводзіць там — на свежым паветры, атрымлівае здаровае харчаванне, новыя ўражанні. Цесць і цешча наогул вельмі малога любяць, і я са спакойнай душой магу пакінуць на іх Мікіту. Тым больш, маёй маці ўжо няма, з бацькам бачымся даволі рэдка, а сястра жыве далёка, у Калінінградзе. Ёсць, праўда, яшчэ хросны тата ў Маскве. З ім часта бачымся: то мы да яго, то ён у Мінск прыязджае, заўжды з гасцінцамі для Мікіты, фінансава дапамагае. Дробязь не дробязь, а ніколі гэтыя грошы не лішнія. Хросная маці пра нас не забываецца, і іншыя жончыны сяброўкі. З добрымі людзьмі нам пашанцавала. Але іх насамрэч няшмат. Стараюся звяртацца па дапамогу да тых людзей, каго гэта не напружвае, каму потым не адчуваеш сябе абавязаным. Найлепш разумеюць «садкоўскія» і бытавыя пытанні жанчыны.

— Кажуць, вайскоўцы — строгія бацькі.

— Асабіста я — вельмі строгі. Мне няма калі разняволвацца. Раніцай камандным голасам кажу: «Пад'ём!» Хутка-хутка збіраемся — і бягом у садок. Выконваем заведзены парадак: прыйшоў — распраніся, вопратку кладзі і вешай на месца, а не абы-як. Толькі потым можаш ісці гуляць. Кожны вечар — кантрасны душ, спаць — у прахалодным пакоі. Я адчуваю, што жаночай увагі, цеплыні малому, безумоўна, не хапае. Але дзесьці я прачытаў, што дзіця робіць поспехі, калі яго любіць і ўхваляе хоць бы адзін з бацькоў.

Пра падводныя камяні

Садок у ваенным гарадку ва Уручча (мікрараён сталіцы) усяго адзін. Уласна, Мікіта і цяпер туды ходзіць — бацька вырашыў не спяшацца аддаваць малога ў школу ў 6 гадоў. Хоць з гэтым і ўзнікаюць пэўныя цяжкасці. «Афіцыйна садок працуе да 7 вечара, а ў 6 большасць дзяцей бацькі ўжо забіраюць. Я ўсё здзіўляюся, як у іх так атрымліваецца, — распавядае Дзмітрый. — Даводзілася адпрошвацца з працы, каб сэканоміць хоць 5, 10 хвілін. Вялізны дзякуй усім тым, хто не на словах, а на справе зразумеў маю патрэбу і пачаў адпускаць на паўгадзіны раней».

Хапае пытанняў і з бальнічнымі. Хто б што ні казаў, а малыя хварэюць, і чым часцей, тым з меншай ахвотай працадаўцы «адпускаюць» бацькоў. Асабліва — бацьку. «Я адчуваю часам такое стаўленне: маўляў, ты ж мужчына, неяк справішся!» Спраўлюся, калі гаворка ідзе пра мяне, а калі ў малога тэмпература 39 і яго нават няма з кім пакінуць, каб збегаць у аптэку? Адзін жа баіцца застацца ў кватэры — гэта мая памылка, бо аднойчы думаў, што паспею падчас яго дзённага сну завяршыць свае справы па-за межамі дома, а Мікіта прачнуўся і неверагодна спалохаўся… Цяпер добра, што можа выручыць Віялета ці ёсць дома хто-небудзь з суседак».

Многія праблемы, што паўстаюць перад бацькам-адзіночкам, таты ў поўных сем'ях нават не ўяўляюць.

— Я, мякка кажучы, далёка не шэф-повар. І калі ў будні Мікіту кормяць у садку, а на мне толькі вячэра, то кожныя выхадныя ламаю галаву, што б гэткае прыгатаваць. Мыю, прасую, прыбіраю — без пытанняў, а з харчаваннем часта выручаюць недарагія кавярні з дамашняй кухняй. Зноў жа, вельмі дапамагае Віялета, якой ад мамы перадалося ўменне гатаваць. Яна можа паклікаць нас у госці ці забраць да сябе Мікіту на выхадныя, звадзіць у тэатр, нават пакінуць начаваць, калі трэба. Дый падчас камандзіровак яна падстрахоўвае мяне. Вельмі брата любіць.

Пра светлае

— Аднойчы на дзіцячым ранішніку я іграў ролю салдата. З казкі «Крэсіва» па Андэрсену, памятаеце? Мяне папрасілі нашыць на форму лампасы. Але я вайсковую форму вельмі паважаю і пудзілам быць не хацеў. Падышоў да камандзіра роты ганаровай варты, папрасіў форму на некалькі гадзін. Карабін, праўда, не далі *(смяецца)*. Але дзецям і бацькам вельмі спадабалася. Можа, у перспектыве ў нас будуць праводзіцца ранішнікі да 23 лютага і іншыя таты таксама сябе праявяць?

— Колькі ў сына дома цацачных пісталетаў?

— Так адразу цяжка падлічыць. Аднак калі да нас прыходзілі выхавацелі правяраць гатоўнасць да школы, сказалі: «Мікіта, у цябе цацак больш, чым у каго іншага!». У яго свой пакой, дый зала таксама адведзена пад гульнявую — пакуль я на кухні ваджаюся, ён у зале на дыване куляецца.

— Мы шмат чаму вучым дзяцей, але і яны, нават маленькія, часам і самі даюць нам карысныя ўрокі. Чаму вас навучыў Мікіта?

— Прывучыў трымаць слова, нягледзячы ні на якія абставіны. Я стараюся не абяцаць таго, у чым не ўпэўнены, бо ён можа шмат чаго не запомніць, што я прасіў. Але тое, што яму паабяцалі, памятае выдатна. І другі момант: калі штосьці патрабуеш, будзь ласкавы, рабі гэта і сам. Выхаваць можна толькі асабістым прыкладам.

***

— Хачу сказаць усім татам, — напрыканцы размовы Дзмітрый становіцца вельмі сур'ёзным. — Шануйце і беражыце сваіх жанчын! Безумоўна, роля бацькі ў сям'і вельмі важная: на яго прыкладзе дзеці вучацца будаваць стасункі з жанчынамі. Але роля мамы — бясцэнная. Гэта разумееш, напэўна, толькі застаўшыся без яе. Я бясконца ўдзячны сваёй жонцы за ўсё тое, што яна рабіла для нас. А разумнікі, якія мяркуюць, быццам жанчына ў дэкрэце «балдзее», проста не ўяўляюць, што кожная мама паспявае зрабіць, пакуль дзіця спіць. Увесь жа астатні час яно патрабуе 100-працэнтнай увагі. «Як я цябе разумею», — выдаў неяк саслужывец. Пытаюся: «І колькі часу ты быў са сваімі дзецьмі сам-насам — дзень, два, тыдзень?». Аказалася — 4 гадзіны! І сказана гэта было такім тонам, быццам ордэн заслужыў. Што ж ты здолеў зразумець аб тым, ці лёгка з дзецьмі?

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

P.S. *Паводле перапісу 2009 года, у Беларусі каля 12 тысяч сем'яў — таты з дзецьмі да 18 гадоў.*

■ Увага: конкурс!

ФОТАЗДЫМАК З ГІСТОРЫЯЙ

Наступная ўдзельніца «сямейнага» конкурсу — *Ірына Ермаковіч з вёскі Азяраўцы Браслаўскага раёна* — даверыла «Звяздзе» вельмі дарагія для сябе здымкі:

«Маці мая, нябожчыца, Надзея Усцінаўна, імі вельмі даражыла. І як толькі змагла захаваць? Фатаграфіі даваенныя, а вёску Мілашы, дзе жыла мама, карнікі спалілі ў кастрычніку 1943-га… Значыць, гэтыя здымкі маці здолела зберагчы ў «вандзэлачку» — і калі іх сям'ю везлі ў Германію ў «таварняку», і калі пехатой вярталася на радзіму з Усходняй Прусіі.

Партрэтныя фотакарткі таго часу, на жаль, у мяне не захаваліся. А вось гэтыя, калектыўныя, мне яшчэ ў дзяцінстве вельмі падабаліся — можа, таму і зберагла. Пагадзіцеся, зірнеш — быццам кадры з даваеннага фільма глядзіш… Хто на фота? Ды вясковая моладзь. Праўда, мужчыны ўжо даволі сталага ўзросту, а дзяўчаты маладзейшыя. Умелі працаваць, умелі і адпачываць — шчыра, ад душы, але, разам з тым, неяк сціпла, прыстойна.

Дарэчы, здымак зроблены ў Латвіі, але гэта менавіта нашы, беларускія, хлопцы і дзяўчаты. Час быў нялёгкі, сем'і пераважна вялікія, таму старэйшыя дзеці часта выязджалі на наёмную працу ў памежную Латвію — каб дапамагчы бацькам паставіць на ногі малодшых дзяцей, а што-кольвечы і для сябе прыдбаць, справіць касцюм, сукенку, а, можа, нават і веласіпед набыць… У маёй бабулі Мар'яны, дарэчы, было 11 дзяцей, таму мая маці (1913 года нараджэння) і яе старэйшы брат Мікалай (1911 г. н.) таксама вымушаны былі працаваць па найме — служыць, як мама казала. Працавалі ў асноўным улетку. Гэты здымак датаваны 12 чэрвеня 1936 года — на адвароце захавалася дата і надпіс алоўкам на польскай мове: «Moi koledzy I kolezhanki». Падпісваў фота мамін брат, ён хадзіў у польскую школу, добра засвоіў грамату. А вось маці мая так і засталася непісьменнай, вельмі шкадавала пазней, але ж тады трэба было малодшых братоў няньчыць…

На фота — у цэнтры, побач з прыгожай дзяўчынай каля патэфона — мамін брат, дзядзька Мікалай. Ён заўсёды быў першым: і ў працы, і ў танцах, надзейным быў сябрам, адказным чалавекам.

…Іграў гармонік, кружыліся пары, завязваліся сімпатыі. Не ведае яшчэ гэтая моладзь, што чакае іх праз 5 гадоў, калі вайна перакрэсліць усё і раскідае іх па свеце. Не ведае і Мікалай, што праз 60 гадоў пра яго напішуць у кнізе Памяці: «Прапаў без вестак у кастрычніку 1944 года…». Магчыма, гэта быў апошні здымак Мікалая? Ён даслаў яго сваякам у Беларусь у тым жа, далёкім 1936 годзе. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, пакуль не вядомая мне».

***

Шаноўныя чытачы! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце на рэдакцыйную пошту альбо электронную скрыню info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.

Увага! Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фатаграфій абавязкова вяртаюцца аўтарам.

■ Пытанне псіхолагу

На пытанні чытачоў адказвае кіраўнік аддзела прыкладной педагагічнай псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг з 16-гадовым досведам кансультавання Алена ОСІПАВА.

«ВОДПУСК» У ДЭКРЭТНЫМ ВОДПУСКУ

«У апошні час лаўлю сябе на тым, што імгненна раздражняюся і «закіпаю» ў адказ на істэрыкі сына. Прытым на добры розум усё разумею: і што ў яго такі ўзрост, калі хочацца ўсё самому (напэўна, ужо крызіс 3 гадоў падбіраецца), і што ён правярае межы забароненага, і што часам капрызіць проста таму, што стаміўся… Але лагічныя доказы не спрацоўваюць, і спакойна рэагаваць на чарговы выбрык у мяне атрымліваецца ў лепшым выпадку пару хвілін, а потым і сама зрываюся. Пазней робіцца вельмі соромна, засмучаюся, што я дрэнная маці…»

Ірына Сініца, г. Мінск.

Ірына! Вы добрая маці, і гэта відавочна хоць бы з той прычыны, што вы перажываеце, як адаб'ецца на дзіцяці ваш эмацыянальны стан, ведаеце псіхалагічныя заканамернасці дзіцячага развіцця. Дэкрэтны водпуск — гэта такая праца: з раніцы да вечара з начным дзяжурствам, без выхадных і адпачынку, і, мяркуючы па ўсім, вы на гэтай працы ўжо амаль 3 гады. А ваш стан — гэта сігнал аб тым, што вашы фізічныя, псіхічныя і эмацыянальныя магчымасці спустошаны. І трэба знайсці якуюсьці магчымасць адпачываць ад дзіцяці і выкройваць час для сябе. Ваш сын ужо дастаткова вялікі, і абсалютна бяспечна хоць бы на кароткі час пакідаць яго пад нагляд бабулі і дзядулі альбо мужа. Падумайце, напэўна ж, знойдзецца такі занятак, які даваў бы вам магчымасць пераключыць сваю ўвагу на іншую дзейнасць і прыносіў бы задавальненне. Гэта можа быць наведванне якіх-небудзь курсаў, рэгулярныя сустрэчы з сяброўкамі. Выкарыстоўвайце час для назапашвання ведаў на будучыню, стаўце сабе новыя мэты — напрыклад, вывучыце замежную мову, авалодайце новай камп'ютарнай праграмай. І абавязкова клапаціцеся пра ўласнае здароўе! Калі ад фізічнай нагрузкі стаў непакоіць пазваночнік — набывайце абанемент у басейн ці запішыцеся на масаж. І вы пераканаецеся, што нават нядоўгія адлучкі з дому дапамогуць вам разняволіцца і зменяць ваш эмацыянальны стан у лепшы бок.

СВОЙ ДОМ — СВАЕ ПРАВІЛЫ

«Некалькі месяцаў таму ў нас нарадзіўся сын. Але, на жаль, з гэтага часу нам з жонкай стала вельмі складана кантактаваць з маёй мамай. Яна ўсё і заўжды ведае лепш: як карміць, чым лячыць, якія прышчэпкі рабіць або не рабіць, як апранаць на прагулкі. Прычым гэтыя парады дае вельмі настойліва, з пазіцыі «я траіх вырасціла». Колькі мы з жонкай ні даводзім, што цяпер зусім іншы час, і памперсы зусім не зло, і медыцына не стаіць на месцы, у мамы адзін адказ: сённяшняя моладзь разленавалася і нічога рабіць не хоча, а вось «у яе час» жанчыны і працавалі, і дзяцей расцілі, і бялізну рукамі мылі… Шчыра кажучы, гэта падобна да рэўнасці, як быццам маме крыўдна, што нам сёння жывецца лягчэй, чым было бацькам і дзядулям-бабулям.

Крыху выратоўвае тое, што мы пасля вяселля дамагліся, каб жыць асобна, і большасць пытанняў прывыклі вырашаць самастойна. Аднак як нам усё ж пераканаць маму ў тым, што мы з жонкай ужо дарослыя і самастойныя людзі, што гэта перадусім НАША дзіця і наша адказнасць?».

Улад.

Улад, гэта сапраўды ВАША дзіця і ваша адказнасць! А з вашым сыходам ад бабулі ў яе, верагодней за ўсё, з'явіўся вольны час і засталася патрэба вучыць, апякаць, выхоўваць, гэта значыць быць мамай. І цяпер яна робіць усё, каб не губляць свайго ўплыву на вас. На мой погляд, дарослі і самастойны чалавек не спрачаецца са сваёй ужо не маладой мамай пра карысць ці шкоду падгузнікаў, не пераконвае яе ў зручнасці пральнай машыны, не крыўдуе на яе за бясконцы кантроль, а спакойна, раз за разам абвяшчае аб тым, як і паводле якіх правілаў у яго сям'і даглядаюць дзіця, у які час ён будзе рады яе ў сябе бачыць і якія пакупкі ці падарункі лічыць непрымальнымі. А яшчэ трэба набрацца цярпення, каб маці прыняла, што яе сын жыве сваёй сям'ёй і сам прымае рашэнні, якія датычацца яе функцыянавання.

***

Паважаныя чытачы, калі ў вашай сям'і ўзнікла складаная сітуацыя, канфлікт, у якім не ўдаецца разабрацца самастойна,— калі ласка, спытайце парады ў нашага спецыяліста. Чакаем вашых лістоў на паштовы адрас рэдакцыі альбо электронную скрынку info@zvyazda.minsk.by з паметкай: «Сямейная газета. Пытанне псіхолагу».

■ Асабістае

ВУЧЫЦЕСЯ Ў ДЗЯЦЕЙ...

Я шматдзетны тата, ужо не малады — недзе там за 45. Старэйшай дачцэ хутка 17, а малодшаму сыну крыху больш за 5. Шыкоўны, я вам скажу, узрост. Дык вось, ёсць у майго малога спадчынніка прыемная звычка сустракаць мяне ўвечары адразу каля дзвярэй. «Прыляціць» мой цудоўны чалавечак, абдыме, усміхнецца, пралапоча нешта дзіцячае ў вуха — і ўсё, ты разумееш, што дома поўны парадак. Так было заўсёды, а днямі падчас нашых абдымкаў ён зазірнуў мне проста ў вочы і выдаў: «Ты самы лепшы тата на свеце, і я так цябе люблю!»

Я паўгадзіны хадзіў па хаце як зачараваны, бо ў галаве гучалі словы сына аб тым, што я лепшы тата і мяне любяць… На душы было так светла і крыху сумна, бо дарагі мой чалавечак быў тут побач, а мае бацькі далёка ад мяне — у другім горадзе…

Я патэлефанаваў на малую радзіму ў Ляхавічы. На другім канцы провада маці расказвала аб мясцовых навінах, што ў лесе шмат грыбоў, а ўвесь вольны час майго бацькі, Андрэя Барысавіча, «з'ядае» клопат аб трусах. І тут я сказаў матулі, што вельмі, вельмі моцна яе люблю. Яна яшчэ некалькі хвілін нешта апавядала, а потым раптам спынілася і ціха сур'ёзна спыталася: «Сынок, у цябе нешта здарылася?» У мяне было ўсё добра, але мама яшчэ доўга цікавілася маім здароўем, здароўем маіх дзетак, іх поспехамі ў школе і ці не пасварыўся я з жонкай… Родная мая супакоілася толькі тады, калі я расказаў ёй аб нашых абдымках з сынам. Яна так шчасліва ўздыхнула і прамовіла: «Сапраўдным чалавекам расце наш унук, а ты, сынок, ужо вырас…» А потым я сэрцам адчуў, што мама амаль бязгучна заплакала. Я разумею, што гэта не былі слёзы гора, болю ці адчаю,— не, яны былі зусім іншымі. Аднак усё адно было неяк няёмка… За тое, што я сказаў такія важныя словы сваёй маме толькі зараз.

Сяргей КУРКАЧ.

P.S. *Летам, калі мы з сынам былі ў Ляхавічах, малы «згубіўся» сярод кустоў парэчак. Мы ўсе былі побач, але ён пачаў клікаць самага старэйшага — майго тату. Адразу пачулася: «Дзед, дзеду, дзядуля!» Потым інтанацыя стала больш сур'ёзнай, калі дзеда ён стаў звать як я: «Бацька, тата, ты дзе?» Апошнім варыянтам было суровае: «Андрэй! Андрэй Барысавіч!», як звычайна заве за стол дзядулю мая мама. Наша сямейства доўга рагатала, калі дзед адшукаўся за суседнім кустом. Мой тата тады адзначыў, што яму падабаўся менавіта першы варыянт, калі ўнук зваў свайго любімага дзеда…*

■ Наш рэйтынг

ФІЛЬМЫ, ЯКІЯ ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ РАЗАМ З ДЗЕЦЬМІ

Антон СІДАРЭНКА, кінакрытык:

1. **«Айбаліт-66»,** рэж. Ралан Быкаў, 1966 г. Тэатр і кіно зліваюцца ў гэтай стужцы ў неверагодным танцы. Парадаксальны гумар і незвычайныя музычныя нумары дазваляюць казаць аб гэтым фільме, як аб безумоўным шэдэўры савецкага дзіцячага кіно.

2. **«Горад майстроў»,** рэж. Уладзімір Бычкоў, 1965. Яркая і павучальная гісторыя пра барацьбу жыхароў казачнага горада з іншаземнымі захопнікамі. Адна з вяршыняў «Беларусьфільма» 1960-х.

3. **«Таварыства мёртвых паэтаў»,** рэж. Пітэр Уір, 1989 г. Героі гэтай карціны намагаюцца зразумець, што ў жыцці галоўнае і як яго трэба пражыць, каб потым не было крыўдна.

4. **«Вам і не снілася»,** рэж. Ілья Фрэз, 1980 г. Лірычны аповед пра Рамэа і Джульету савецкіх школьных часоў. Песня з фільма стала своеасаблівым гімнам рамантычнага кахання.

5. **«Блакітная птушка»,** рэж. Джордж К'юкар, 1977 г. Цудоўная калядная казка з музыкай і філасофскай думкай. Шукаць сваю чароўную птушку шчасця весялей менавіта пасля гэтага кіно.

6. У якасці бонусу — **«Бясконцая гісторыя»,** рэж. Вольфганг Петэрсен, 1987 г. Захапляльная, але вольная экранізацыя кніжкі нямецкага казачніка Міхаэля Эндэ. Дагэтуль выступае годнай канкурэнцыяй і «Залюстроўю», і «Гары Потэру».

МЕСЦЫ, ЯКІЯ ТРЭБА НАВЕДАЦЬ СЯМ'ЁЙ

Іна КУСТАВА, кіраўнік ГА садзейнічання развіццю прыватнага прадпрымальніцтва «Адзінства»:

1. **Гомельскі палацава-паркавы ансамбль** — музей пад адкрытым небам, у які ўваходзяць палац Румянцавых і Паскевічаў, капліца і пахавальня княжаскай сям'і Паскевічаў, «Зімовы сад», аглядная вежа, склепы-лядоўні, тэрыторыя ўнікальнага парку і набярэжная ракі Сож.

2. **Юравічы Калінкавіцкага раёна:** езуіцкі калегіум з манументальным касцёлам, заснаваным ордэнам манахаў-бернардзінцаў у XVIII стагоддзі, і цудадзейнай іконай Божай Маці Юравіцкай (Міласэрнай).

3. **Тураў Жыткавіцкага раёна,** дзе жыў і працаваў вялікі асветнік XII стагоддзя Кірыла Тураўскі, з царквой Усіх Святых і Барысаглебскімі могілкамі, дзе «растуць» знакамітыя крыжы, якія лечаць хворых.

4. **Ветка** з яе знакамітым музеем народнай творчасці, дзе захоўваюцца ўнікальныя старадрукаваныя кнігі, рукапісы, іконы, старажытная і сучасная разьба па дрэве, ліццё, шыццё золатам, жэмчугам, пацеркамі, вышыванкі і шмат чаго яшчэ.

5. **Тэматычны гасцінічна-рэстаранны комплекс «Ранча»,** якога яшчэ няма ў ніводным даведніку з тае прычыны, што з'явіўся на свет усяго 2 месяцы таму. Комплекс знаходзіцца за 22 км ад Гомеля ў сасновым бары, на беразе возера Старык, злучанага з Сожам. Выпрабавана на сабе: свежае паветра плюс адмыслова створаная атмасфера Дзікага Захаду, тэматычныя забаўляльныя праграмы абудзяць у кожным «сапраўднага каўбоя» і натхняць на новыя прыгоды!

У народзе кажуць: «ДОРАГА НЕ ТАК ТАТАВА ХАТА, ЯК САМ ТАТА».

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СПАБОРНІЦТВА ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЯЎ

Яго калісьці слухалі ў Парыжы і Берліне, Мюнхене і Кракаве, Вільні і Варшаве, Кіеве і Мінску... Ён мог стаць паспяховым юрыстам, але музыка ў ім перамагла. І цяпер мы ведаем: Міхаіл Ельскі — гэта вядомы беларускі скрыпач XIX стагоддзя, які выступаў у Еўропе (выконваў творы Баха, Вівальдзі, Паганіні і іншых), сам стаў аўтарам каля 100 твораў. Ён наогул быў апантаны музыкай настолькі, што прыслухоўваўся да гукаў роднай зямлі, запісваў, што чуў ад людзей, вынікам чаго стала праца «Народныя танцы Менскай губерні». І чыё імя яшчэ трэба было даваць конкурсу, які адбываецца ў Мінску і прыцягвае ўвагу маладых музыкантаў — скрыпачоў, альтыстаў, віяланчэлістаў, кантрабасістаў з розных краін свету?

Старшыня арганізацыйнага камітэта III Міжнароднага конкурсу выканаўцаў на струнных смычковых інструментах імя Міхаіла Ельскага, намеснік міністра культуры Беларусі Васіль Чэрнік адзначыў, што цягам дзевяці дзён Мінск быў культурнай сталіцай Еўропы, калі тут праходзіў адзін з вядомых музычных конкурсаў, у якім сёлета прынялі ўдзел больш за 70 выканаўцаў з 11 краін свету.

Уладзімір РЫЛАТКА, старшыня журы ў намінацыі «Альт»:

— Свята музыкі адбылося. Трэба падзякаваць Міністэрству культуры за тое, што конкурс захоўваецца, мае свае традыцыі і падабаецца гасцям. Да нас з задавальненнем прыязджаюць і маладыя музыканты, і майстры сцэны. Тут сапраўды царства музыкі, за што вялікі дзякуй Беларускай дзяржаўнай філармоніі: у гэтых сценах маладыя людзі пражылі больш за тыдзень. Па аднадушнай ацэнцы конкурс «пасталеў»: сюды прыехалі музыканты, якія ўжо ўсё ўмеюць. Гэта было не сутыкненне нейкіх тэхнічных магчымасцяў і інтэрпрэтацый — гэта было спаборніцтва індывідуальнасцяў. Натуральна, журы павінна было валодаць чулым сэрцам, пранікнёнай думкай, каб вылучыць лепшых. Але ў нашым журы працавалі выдатныя музыканты, цудоўныя педагогі, чулыя, сардэчныя людзі. Мы перажывалі за кожнага выканаўцу, чый конкурс скончыўся на першым туры. Я часам бачыў, што на вачах членаў журы раптам з'яўлялася сляза — так глыбока закранала выкананне музыкі. Хацелася б, каб тая любоў да музыкі, якая ёсць, імкненне дасягнуць вяршынь, вяла нашых канкурсантаў далей. Беларуская сцэна для іх адкрыта — можна прыязджаць да нас выступаць.

Але ці не важнейшым вынікам конкурсу з'яўляецца тое, што ён прыцягвае ўвагу да маладых беларускіх музыкантаў, наогул дае стымул развівацца і ўдасканальваць сваё майстэрства. Адна справа — ездзіць на міжнародныя конкурсы за мяжу, але ж асаблівая адказнасць — удзельнічаць у сваім, на радзіме, выступаючы перад роднай публікай. Яна таксама перажывала за тых, хто выступаў на сцэне. А ў выніковым канцэрце, у якім пераможцы ігралі разам з Нацыянальным акадэмічным сімфанічным аркестрам Беларусі і аркестрам Белтэлерадыёкампаніі, яны заслужылі бурныя авацыі ад удзячнай публікі.

Сярод тых, каго публіка вітала вельмі горача, віяланчэліст Міхаіл Радунскі, які перамог у сваёй намінацыі (за што атрымае 4 тысячы долараў). Мала таго, ён быў яшчэ адзначаны спецыяльнай прэміяй Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (10 мільёнаў рублёў) як лепшы беларускі выканаўца з ліку студэнтаў акадэміі. Студэнт 2-га курса аркестравага факультэта, які навучаецца па спецыяльнасці «Віяланчэль», стаў лаўрэатам 1-й прэміі. Вельмі ўсхваляваны малады чалавек, нават пасля ўзнагароджання быў засяроджаны і заклапочаны тым, што яму адкрываць вынікову канцэрт.

МІХАІЛ РАДУНСКІ:

— Конкурс для мяне асабіста быў складаны — найперш псіхалагічна. Таму што прыехалі цудоўныя музыканты, з якімі было цікава спаборнічаць, цікава было іх слухаць. Як размеркаваліся месцы, я лічу, у нейкай ступені — фармальнасць. Таму што ўсе канкурсанты таленавітыя, як мне здаецца. Гэта мой першы конкурс такога ўзроўню, раней я баяўся ўдзельнічаць. Таму для мяне гэта быў сур'ёзны крок. У маёй групе было 28 віяланчэлістаў. З іх толькі 6 прайшлі ў фінал. Быў даволі жорсткі адбор, таму мне было складана і маральна, і фізічна — вынесці ўсе туры на максімуме сваіх магчымасцяў.

— Што будзеце выконваць на конкурсе, самі вырашалі ці разам з выкладчыкам?

— Я прапаноўваў, мае інтарэсы супадалі з меркаваннем выкладчыка. У фінале мы вырашылі выконваць Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам e-moll Элгара. З беларускіх кампазітараў аддаў перавагу Галіне Гарэлавай, таму што вельмі люблю яе творы. Я нават не раздумваў, ведаў першапачаткова, што буду выконваць менавіта яе твор. Калі вывучаў буклет, то звярнуў увагу, што больш за палову ўдзельнікаў-віяланчэлістаў ігралі яе п'есы. Таму што яны вельмі паказальныя ў плане віртуознасці, і кожны музыкант можа цудоўна паднесці іх, знайсці нешта сваё ў выкананні. Я лічу, што гэта быў добры выбар.

Вось чым яшчэ адметны мінскі міжнародны конкурс: згодна з яго ўмовамі, музыканты павінны выконваць твор беларускага кампазітара. Прычым можна пачуць творы і самога Міхаіла Ельскага, які пісаў п'есы для віртуознага выканання на скрыпцы, а можна пазнаёміцца з творчасцю сучасных беларускіх кампазітараў. Маладыя музыканты іх іграюць, а публіка дзякуючы ім можа паслухаць. Такім чынам конкурс дае магчымасць лепш зразумець беларускую музыку і тых, хто яе стварае і ўсвядоміць, якіх музыкантаў мы маем у сваёй краіне. Што і патрабавалася даказаць.

Дзяніс ГАНЧАР:

«Гран-пры — гэта адказнасць»

Для Дзяніса Ганчара з Расіі гэта быў не першы міжнародны конкурс, у якім ён браў удзел. Былі ўжо і высокія першыя месцы. Але Гран-пры (і прэмію ў памеры 5000 долараў ЗША) як лепшы выканаўца конкурсу ён атрымаў упершыню. Быў вельмі ўсхваляваны і не ўтойваў радасці:

— Атрымліваецца, што тут адно Гран-пры на ўсе намінацыі. Натуральна, яго вельмі пачэсна атрымаць. Але гэты давер трэба апраўдаць, высока трымаць планку далей. Павінна быць якасная ігра, каб усе разумелі, што нездарма мне прысудзілі гэтую прэмію, што я яе заслужыў. Справа ў тым, што лепшага музыканта выбіралі сярод усіх. На трэцім туры сядзелі ўсе члены журы з усіх чатырох намінацый. Паслухаўшы, яны зрабілі свой выбар.

— У вас для конкурсаў ёсць гатовая праграма?

— Ва ўсіх музыкантаў такія творы павінны быць у абойме. Яны вывучаюцца ў школах, у кансерваторыях. У любым выпадку штосьці такое ігралі, акрамя абавязковых твораў. Вось атрымліваецца, што не проста абавязковыя творы ў конкурсы прызначаюцца, а каб паглядзець, як чалавек можа зрабіць гэтую праграму. Я для фіналу абраў Канцэрт для альта з аркестрам Бэлы Бартака.

— На конкурсах музыканты спаборнічаюць найперш у тэхнічных магчымасцях?

— Спаборнічаюць не толькі ў тэхніцы. Абсалютна на ўсё глядзяць падчас конкурсу, і на тое, з якім пачуццём іграеш. Складанасць у конкурсе заключаецца ў тым, што гэта не канцэрт. На канцэрце можаш нейкую вольнасць зрабіць: захацеў — дзесьці адцягнуў, тэмп іншы ўзяў. На конкурсе за гэтыя рамкі выходзіць нельга. Трэба іграць так, як было напісана кампазітарам. З-за гэтага цяжка іграць на конкурсах, таму што зусім іншая атмасфера, тут барацьба — трэба паказаць усе свае лепшыя якасці. І не толькі тэхніку. Мы ж музыку выконваем, а не голыя ноты, якія напісаны на аркушы паперы. Мы павінны ўкласці ў яе нейкія свае веды, душу. Гэта як верш расказаць: можна проста вымаўляць словы, а можна з пачуццём і інтанацыяй. У нас тое ж самае — інтанацыя прысутнічае. Гэтыя фарбы трэба ўмець паказваць.

— Вы атрымалі яшчэ і спецыяльны дыплом за выкананне твора беларускага аўтара, які трэба выконваць згодна з умовамі мінскага конкурсу. Як выбіралі, што будзеце іграць?

— Калі шчыра, мы ў апошні дзень адпраўлялі дакументы. Я не ведаў яшчэ, ці ехаць мне ў Мінск. Але паглядзеў, што ў мяне не супадае час конкурсу з ніякімі выступленнямі, што можна паўдзельнічаць. Мы запаўнялі гэтыя дакументы літаральна ў машыне, перад поштай. І праз тэлефон глядзелі творы. Мая каханая пытаецца: «Які беларускі твор будзеш выконваць?» А я не ведаю, нават нот не бачыў. Кажу: «Давай вось гэта — «Рэгби» Галіны Гарэлавай. Назва спадабалася. Я выбраў твор сам, а потым мы сталі яго рабіць з маім піяністам. Запісу нідзе ніякага не было. Насамрэч, калі б раней ведаў, што паеду, то, можа, глядзеў бы, выбіраў бы даўжэй. Але абсалютна не шкадую: мне гэты твор спадабаўся. Гэта добры твор, каб выконваць «на біс». П'еса кароценькая, але вясёлая, яркая. Працавалі над ёй, каб дадаць фарбаў, каб гучала не сумна, а «смачна». Калі далі прэмію, то, напэўна, атрымалася.

— Ці дапамагае ўдзел у конкурсах лепш зразумець свой інструмент?

— Я думаю, так. Мы ўсё жыццё вучымся, няма мяжы, у музыцы тым больш. Увесь час удасканальваешся. І гэта можна рабіць і ў 80 гадоў. Майстэрства прыходзіць з вопытам. І конкурс — гэта вялізны вопыт для музыканта. Пасля таго, як заваёўваеш на конкурсе нейкія месцы, потым больш упэўнена сябе адчуваеш. Таму што тут выкладваешся цалкам.

Інструмент, з якім я існую, не зусім стары — пачатку XX стагоддзя, 1903 года, зроблены французскім майстрам. Ён мне вельмі падыходзіць, на ім зручна іграць. Я яго разумею, адчуваю. Магу з ім спрацавацца. Дагэтуль я шмат інструментаў памяняў, пакуль на гэтым альце спыніўся. Але, натуральна, у мяне ёсць мара...

ЛАЎРЭАТЫ III МІЖНАРОДНАГА КОНКУРСУ ВЫКАНАЎЦАЎ НА СТРУННЫХ СМЫЧКОВЫХ ІНСТРУМЕНТАХ ІМЯ МІХАІЛА ЕЛЬСКАГА:

Скрыпка

1-я прэмія — Марыя Влашчоўска (Польшча)

2-я прэмія — Эліна Назарава (Расія)

3-я прэмія — Павел Бацян (Беларусь)

Альт

1-я прэмія — Аляксандра Тэльманава (Расія)

2-я прэмія — Мікалай Чарнуха (Беларусь), Наталя Анішчук (Украіна)

3-я прэмія — Аляксандра Іванова (Беларусь), Іван Агафонаў (Расія)

Віяланчэль

1-я прэмія — Міхаіл Радунскі (Беларусь)

2-я прэмія — Леў Сіўкоў (Расія)

3-я прэмія — Уладзіслаў Трухан (Беларусь), Пенка Петкава (Балгарыя)

Кантрабас

1-я прэмія — Віктар Ашмарын (Украіна)

2-я прэмія — Аляксей Ствол (Беларусь)

3-я прэмія — Артур Лісянкоў (Беларусь)

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Спазнай Беларусь!

ДЛЯ ТУРЫСТА — ШЛЯХОЎ ТРЫСТА

Для многіх людзей добры адпускны сезон азначае паездку за мяжу. Але пры гэтым мы чамусьці забываемся пра тое, што прыемна адпачыць можна і ў Беларусі, дакрануўшыся тым самым і да часткі айчыннай гісторыі. Праўда, многія нашы маляўнічыя ды багатыя на падзеі мінулага мясціны так і застаюцца мала вядомымі. Каб выправіць гэтую хібу, па ініцыятыве Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнага агенцтва па турызме штогод праводзіцца рэспубліканскі конкурс «Спазнай Беларусь!». Падведзены вынікі чарговых спаборніцтваў.

— Гісторыя конкурсу налічвае ўжо адзінаццаць гадоў. За гэты час праз яго прайшло больш за тысячу ўдзельнікаў, — гаворыць **намеснік міністра спорту і турызму Часлаў ШУЛЬГА**. — Дзякуючы гэтым спаборніцтвам мы заадно шукаем тых рупліўцаў, якія шчыруюць на ніве айчыннага турызму. Тут хацелася б адзначыць намінацыю, сугучную з назвай самога конкурсу — «Я спазнаю Беларусь». Паўдзельнічаць у ёй можа кожны чалавек. Дастаткова сфатаграфавацца на фоне помнікаў, славутых мясцін і пасля даслаць здымкі па электроннай пошце. Перамагаюць тыя, хто зрабіў больш за ўсіх удалых кадраў.

Такім чынам, лепшым падарожнікам па Беларусі сёлета стаў фатограф-аматар Канстанцін Ілюковіч. Ён даслаў на конкурс каля 250 здымкаў.

— Турызм — маё хобі, — гаворыць Канстанцін Ілюковіч. — У нейкай ступені гэтаму спрыяе тое, што я працую менеджарам, дзякуючы чаму пастаянна езджу па Беларусі. А да гістарычнага турызму далучыўся вельмі проста. Аказалася, што побач з нашай крамай знаходзіцца шмат гістарычных помнікаў. Вось так пакрысе і ўцягнуўся ў працэс... Нават калі еду ў камандзіроўку ў якісьці беларускі горад, то заўжды імкнуся знаходзіць пасля вырашэння ўсіх пытанняў час на пошук знакавых мясцін. А яшчэ вельмі люблю падарожнічаць па краіне падчас водпуску разам з сям'ёй. Шкада толькі, што рэгламент конкурсу прадугледжваў даволі сціслыя тэрміны — каля паўтара месяца. Бо на карце памяці фотаапарата засталося яшчэ больш здымкаў, якія я зрабіў ужо пасля...

А вось у катэгорыі «Экскурсавод года» спаборнічалі ўжо не аматары, а прафесійныя гіды. Яе лаўрэатам стала віцябчанка Алена Паднябеснава.

Вельмі жорсткі адбор вёўся ў намінацыі, дзе адзначалася лепшае развіццё ўязнога і выязнога турызму. Яно і не дзіўна, бо на кон пастаўлены не толькі валютны прыбытак, які прыносяць замежныя госці, але і рэпутацыя краіны. Тут не было роўных Гомельскаму палацава-паркаваму ансамблю. Не забыліся арганізатары спаборніцтваў і пра аграэкатурызм, які пакуль што з'яўляецца вельмі маладой галіной. Лепшым аб'ектам была прызнана аграэкасядзіба «На Зарэчнай вуліцы» Кобрынскага раёна. А найлепшы ўнёсак у развіццё беларускага турызму зрабіў сёлета Глыбоцкі райвыканкам.

Сярод арганізацый, якія спаборнічалі ў дзевяці намінацыях, можна было адшукаць гасцініцы, санаторыі, музеі, паркі, агенцтвы... І ўрэшце, не так і важна, якое выніковае месца яны занялі. Важна, што яны дапамагаюць адкрываць Беларусь. І не толькі замежным, але і сваім айчынным турыстам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

БЕЛАРУСБАНК

Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 30 октября 2013 года начисление поощрительного процентного дохода по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- **«Сберегательный»** – в размере **18%** годовых;
- **«Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере **17%** годовых;
- **«Премиально-накопительный «Детский»** – в размере **21%** годовых;
- **«Классик плюс»** – в размере **19,7%** годовых,
- **Накопительный** – в размере **19%** годовых.

Начисление поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 30.10.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 27.11.2013 (включительно).

Присоединение к остатку вклада поощрительного процентного дохода производится 28.11.2013.

При этом поощрительный процентный доход не выплачивается:

- в случае если в период с 30.10.2013 по 27.11.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период 2013 г.) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода, или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;
- в случае если на 30.10.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Классик плюс», срок возврата которых наступил до 30.10.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного процентного дохода производится с 28.11.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1 является получение вкладчиком поощрительного процентного дохода.

3. Со дня опубликования настоящей публичной оферты, публичная оферта от 29.10.2013, опубликованная в газетах «Советская Белоруссия» (№ 204), «Народная газета» (№ 202), «Белорусская нива» (№ 195), «Рэспубліка»(№ 203) и «Звязда» (№ 204), считается отозванной.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов).

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоквартирный жилой дом по генплану № 3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республики Беларусь, 220053, г. Минск, пер. Червякова, д. 21А, пом. 3, каб. 4, 6. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства были построены следующие объекты:

в 2010 году

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске;

в 2011 году:

жилой дом № 37А по ул. Бумажкова в г. Минске, жилой дом № 10 по ул. Нововиленская в г. Минске;

в 2012 году:

жилой дом № 31А по ул. Карвата в г. Минске;

в 2013 году:

жилой дом № 44 по ул. Янковского в г. Минске;

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – строительство объекта «Многоквартирный жилой дом по генплану № 3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий».

Начало строительства – апрель 2013 года, окончание строительства – ноябрь 2016 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 1304-15/12 от 11.02.2013 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета № 459 от 28.02.2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении дополнения в решение горисполкома»;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права временного пользования сроком до 01 января 2017 года №-500/147-8043, 500/726-11363, 500/726-11364 в отношении земельных участков с кадастровыми номерами 500000000007006468, 500000000007006469, 500000000007006532 площадью 0.5014 га, 1.1576 га, 0.0868 га, соответственно, и расположенных по адресу г. Минск, пр-т Победителей в границах жилого района Лебяжий;
- разрешения на производство строительно-монтажных работ Инспекции Департамента по надзору и контроля за строительством по г. Минску от №- 2-209Ж-002/13 от 19.04.2013 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор генерального строительного подряда от 17 апреля 2013 №-17-04-2013/ПЗ.

Объект «Многоквартирный жилой дом по генплану № 3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий»» расположен вдоль проспекта Победителей в увязке с планировкой жилого района «Лебяжий». Дом состоит из 2-уровнего подземного гаража стоянки, встроенных помещений и жилой части. На уровне 2-го этажа проходит пешеходная платформа (Стилобат), которая является объединяющим архитектурным элементом всей линии застройки.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка – декоративная рельефная штукатурка с покраской фасадными красками, облицовка плиткой из вибропрессованного бетона. Оконные блоки – стеклопакеты ПВХ.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность, входят помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки поступают в общую собственность Дольщиков.

Стоимость строительства помещений, не входящих в состав общего имущества комплекса: встроенно-пристроенная часть объекта строительства, встроенно-пристроенные нежилые помещения общественного назначения, расположенные в подвале и на первом этаже жилой части объекта строительства и объекты, которые служат для использования этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения, в т.ч. помещения КУУТ, венткамеры, ПНС), не включаются в стоимость 1 кв. метра стоимости жилого дома и не передаются дольщикам в качестве имущества совместного домовладения.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагается для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц, индивидуальных предпринимателей 1 (одно) помещение общественного назначения общей площадью 349,44 кв. метров стоимостью 2 400 долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей.

Ознакомление дольщиков с планировкой помещения, предлагаемого для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, пер.Червякова, д. 21А, каб. 12. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

24.12.2013 г. в 10.00 в здании Гродненского районного исполнительного комитета (г. Гродно, ул. Горького, 51) состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, бел. руб.	Инфраструктура и условия инженерного развития земельных участков
1	2	3	4	5	6	7
1	422084506801000420 Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, м-н «Коробчицы», У-654	0,1449	Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	17 799 748	7 000 000	Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона водных объектов – 0,1449 га. Возможность подключения централизованного газоснабжения
2	422084506801000421 Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, м-н «Коробчицы», У-655	0,1451	Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	17 824 316	7 000 000	Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона водных объектов – 0,1451 га. Возможность подключения централизованного газоснабжения
3	422084506801000422 Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, м-н «Коробчицы», У-656	0,1451	Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	17 824 316	7 000 000	Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона водных объектов – 0,1451 га. Возможность подключения централизованного газоснабжения
4	422084506801000423 Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, м-н «Коробчицы», У-657	0,1452	Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	17 836 600	7 000 000	Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона водных объектов – 0,1452 га. Возможность подключения централизованного газоснабжения
5	422084506801000424 Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, м-н «Коробчицы», У-658	0,1451	Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	17 824 316	7 000 000	Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона водных объектов – 0,1451 га. Возможность подключения централизованного газоснабжения
6	422084506801000425 Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, м-н «Коробчицы», У-659	0,1447	Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	17 775 180	7 000 000	Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона водных объектов – 0,1447 га. Возможность подключения централизованного газоснабжения

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 17 декабря 2013 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: аг. Коптевка, ул. Победы, 60 документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона (для земельного участка У-654 – 1 779 950 белорусских рублей, для земельного участка У-655 – 1 782 450 белорусских рублей, для земельного участка У-656 – 1 782 450 белорусских рублей, для земельного участка У-657 – 1 783 650 белорусских рублей, для земельного участка У-658 – 1 782 450 белорусских рублей, для земельного участка У-659 – 1 777 500 белорусских рублей, на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Коптевский сельисполком, № 3600514050103 в филиал № 400 «АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500563252, с отметкой банка о его исполнении;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

При подачи документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактный телефон**: (8-0152) 915 242.**

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на пять процентов, обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня принятия утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания его несостоявшимся, внести плату за земельный участок на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Коптевский сельисполком, № 3600514050103 в филиал № 400 «АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500563252, а также возместить затраты на организацию и проведения аукциона, в том числе расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (суммы, указанные в графе 6, подлежат корректировке исходя из фактических затрат) на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Коптевский сельисполком, № 3600514050103 в филиал № 400 «АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04616, УНН 500563252;

осуществить в двухмесячный срок, со дня получения выписки из решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, государственной регистрации права на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Гродно, ул. Захарова, 27);

после государственной регистрации права на земельный участок, до начала строительства жилого дома, получить техническую документацию на его строительство;

приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома;

снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки после получения разрешительной документации на строительство жилого дома и использовать его для благоустройства участка;

шаг аукциона 10% от предыдущей цены, называемой аукционистом.

■ Словы на ўспамін

РАФАЭЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Памяці мастака Аляксея Кузьміча

Зусім нядаўна пайшоў з жыцця мастак Аляксей Кузьміч. Пасля сябе ён пакінуў святланосную творчасць, якая выклікае сотні пытанняў аб жыцці ў вечнасці і смерці пры жыцці, аб сапраўднай прыгажосці і скарбах дабрыні, аб міласэрнасці і, як проціегласць, — аб здзеках д'ябла. Але галоўная яго тэма, выбраная аднойчы і на ўсё жыццё, — гэта зямныя Мадонны. Аляксей Васільевіч стварыў звыш сямісот палотнаў, у якіх нястомна шукаў ідэал беларускай жанчыны. Пошукі мастака сягалі то ў сівую даўніну («Ефрасіння Полацкая», «Манахіня», «Плач Рагнеды»), то ён звяртаўся да вобразаў слынных беларусак (партрэты народных артыстак СССР Галіны Макаравай, Стэфаніі Станюты), то маляваў безыменных беларусак, маладых і пажылых, ад якіх не адвесці вачэй («Мінская Мадонна», «Даная», «Таня», «Наташа», «Дзяўчына і кветкі», «Старасць»), ён услаўляў жанчыну, яе прыгажосць, яе ахвярнасць на Зямлі, яе высакародную Боскую місію сярод людзей. Урэшце, раскрываў свету чароўны вобраз жанчыны-беларускі, а праз яе апавядаў і пра саму краіну Беларусь.

Ідучы дарогай Святла і Чысціні да ўзвышанага і зямнога, жывапісец бачыў і зло, і распусту, і заганы, якімі д'ябал хоча ўзарваць Сусвет. Можа, таму на святых ліках зямных Кузьмічовых Мадоннаў і з'яўляюцца трывога, занепакоенасць, слёзы. Мастака хвалявала, што маладыя маці гадуюць дзяцей з пастаяннай бояззю за іх лёс і жыццё.

Здаецца, я блізкі да моманту ісціны: сярод Мадоннаў Кузьміча ёсць адна, ад якой нельга адвесці вачэй. Гэта яго мама Аляксандра. Яе ў маладосці звалі Русалкай. Жыла на хутары, сярод жывой прыроды. Яе не палохаліся дзікія птушкі, яе любілі лясныя звяркі. Сярод лугавых кветак яна сама — найлепшая краска.

На сынавым палатне мы бачым мудрую, сталую жанчыну, але ў ёй захавана даўнейшая статнасць і мілавіднасць. Яна нарадзіла дванаццаць дзяцей. А калі вярнуўся з вайны яе каханы муж Васіль, на радасцях вынасіла яшчэ сынка Аляксея (ці як у іх вёсцы Махро кажуць, Ляксейку). Апошненькі стаў надзеяй Мамы, асабліва пасля таго, як на яе руках памёр з асколкамі ў целе муж Васіль. З трывогай за лёс і здароўе свайго Аляксейкі дажывала зямныя гады Аляксандра Максімаўна. На карціне адразу прыкмячаюцца спрацаваныя рукі сялянкі і пранікліявыя вочы маці. Яна як бы пільна ўзіраецца ў кожнага, хто хоча з ёй пазнаёміцца і просіць-моліць усіх: «Людзі, беражыце майго Аляксейку, не крыўдзіце ранімага, не крываўце яго чуллівую душу, не злоўжывайце яго адкрытасцю, дабрынёй і шчодрасцю».

Мальбу, просьбу маці як бы перахапіла, пераняла ў сямейную спадчыну жонка Аляксея, мінская прыгажуня Інэса. Яе, нябесную і святую, шукаў мастак доўга і пакутна. Ды вось жа сустрэў нечакана на сталічнай вуліцы і не змог адарваць вачэй. Зразумеў, што ўрэшце знайшоў сваю адзіную, жаданую і чаканую, выбраную і пасланую яму самім Госпадам. Вось яна, Інэса Іосіфаўна, і стала яго Мадоннай, яго крыламі і натхненнем, эталонам прыгажосці, самай узорнай, вернай жонкай, пяшчотнай цярплівіцай-мамай з вечнай трывогай за лёс і здароўе сваіх дзяцей. Яе вочы, яе прывабны твар, яе залатую капу валасоў і загадкавую ўсмешку мы пазнаем у мастацкіх працах Аляксея Кузьміча («Мадонна ў аблоках», «Мая Мадонна», «Калыханка», «Мацярынства», «Юныя Мадонны», «Ціхая радасць», «Сям'я», «Мадонна ў светлым», «Мадонна з анёламі», «Чысціня», «Шчырасць», «Маё натхненне...»).

Наўмысна стаўлю шматкроп'е, бо немагчыма пералічыць усе карціны, у якіх мастак зноў і зноў звяртаецца да непаўторнага невычэрпнага вобразу сваёй Мадонны. Здаецца, яна прыйшла да жывапісца з далёкага Рэнесансу, уся ў залатым святле, натхняючы яго на радасці і мукі, на творчы подзвіг у імя Вечнасці.

Кожны дзень у сваёй майстэрні, што ў Траецкім прадмесці ў Мінску, Аляксей Кузьміч біўся над разгадкай тайны прыгажосці, мудрасці і святасці беларускай Мадонны. Падбіраў такія фарбы, каб перадалі духоўнае багацце жанчыны, няўлоўнае святло самога Госпада. «Да гэтага імкнуўся, — прызнаўся Аляксей Васільевіч, — але да канца раскрыць сакрэт красы Мадонны немагчыма. Над гэтым мучыліся геніі да мяне, будуць у нястомным пошуку і нашчадкі, бо сапраўдная прыгажосць — гэта само жыццё, а ключ ад яго — у Бога. Я імкнуўся толькі асвятліць людзям дарогу да Яго Храма».

Аляксей Кузьміч ужо шмат гадоў пісаў свае дзённікі, адкрыта і шчыра спавядаўся перад сваім сумленнем, перад сваёй Мадоннай, прызнаваўся ў любові да сваёй радзімы — Беларусі. Яго мастацкія палотны і літаратурная споведзь даўно ўжо просяцца ў незвычайны музей Беларусі — Галерэю Мадоннаў Кузьміча. Гэта запаветная мара мастака. Хай жа наступіць час здзяйснення мар святланоснага жывапісца Аляксея Кузьміча!

Вось пра што думалася, калі адпявалі вялікага Мастака, песняра Мадоннаў, Аляксея Васільевіча Кузьміча ў Петрапаўлаўскай царкве. У яго, веру, наступнае новае жыццё — ва ўдзячнай Памяці нашчадкаў і, найперш, у зямных Мадоннах.

Уладзімір ЛІПСКІ

КІРА МУРАТАВА

Яна яшчэ з савецкіх часоў давала зразумець, што значыць асоба аўтара ў кіно. І, нягледзячы ні на што, заўсёды здымае толькі сваё кіно: тое, што прыдумала і што бачыць сама. І ўмее зрабіць кіно нават з таго, што звычайна ў кіно… застаецца за кадрам. Адна з шаноўных гасцей «Лістапада» прадстаўляла ў Мінску свой новы фільм «Вечнае вяртанне».

Як прыдумаць невялічкую навелу, але зрабіць з яе паўнавартасны фільм? Гэта прадэманстравала Кіра Муратава, якая на «Лістападзе» ў конкурснай праграме са сваёй стужкай удзельнічала не першы раз. Але новы фільм «Вечнае вяртанне» — прыклад не толькі рэжысёрскага таленту, умення на адной сцэне пабудаваць карціну, але і ўзор кемлівасці і вынаходніцтва. Сюжэт просты. Мужчына прыходзіць да жанчыны, з якой яны некалі разам вучыліся, па параду. Каго выбраць: жонку альбо палюбоўніцу? І на гэтай адной сцэне фактычна заснаваны ўвесь фільм. Але як заснаваны! Рэжысёр дала магчымасць сыграць гэтую сцэну некалькім парам артыстаў і прадставіла гэты працэс у якасці кінапроб. У выніку напрыканцы з'яўляецца магчымы прадзюсар фільма, якому і дэманструюць магчымасці ўсіх кандыдатаў на ролі… Для любога рэжысёра момант выбару артыстаў — складаны: ад некага даводзіцца адмаўляцца. Вось тут цалкам рэалізаваная магчымасць не адмаўляцца ні ад якіх артыстаў і даць права ўсім паказацца як перад прадзюсарам, так і перад намі, гледачамі. Сама Кіра Георгіеўна сустрэчам з гледачамі рада і шмат чаго пра сваю творчасць гатова была распавесці.

ПРА СЮЖЭТ

— Спачатку я напісала навелу. Мяне цікавіў характар чалавека, які прыходзіць параіцца, але ніколі не ідзе ўслед за тваімі парадамі. Я напісала такую сцэну — адну. Потым я напісала, што ён прыходзіць другі раз. Потым трэці, чацвёрты. Потым я падумала: гэта кароткаметражка, але трэба зрабіць поўнаметражны фільм. Трэба, каб некалькі разоў гэта паўтаралася, каб некалькі розных пар разыгрывалі гэты эпізод. Так атрымаўся сцэнарый поўнаметражнага фільма. Тут ёсць розныя прычыны. У мяне даўно жыве жаданне зрабіць сканструяваныя рэчы, канцэптуальныя. Надакучвае шаблон кшталту сюжэта: ён, яна, нехта трэці, але ў канцы фільма ўсе прыстроены… Я не хачу сказаць, што так трэба рабіць фільм. Існуе бясконцае мноства сюжэтаў, варыянтаў іх адлюстравання. І вось такі спосаб рабіць кіно не адмаўляе ўсім іншым спосабам рабіць кіно.

ПРА ІМПРАВІЗАЦЫЮ

— Што тычыцца імправізацыі, то галоўная імправізацыя тут была ў мантажы. Насамрэч усе ўдзельнікі, усе пары сыгралі ўсе чатыры сцэны, былі заняты ва ўсіх чатырох сцэнах. Але потым выбіраліся тыя эпізоды, дзе яны былі найлепшыя. Эпізоды рытмічна зманціраваныя, дзеля таго, каб яны ўяўлялі сабой нейкую цэльную канцэпцыю, якая сцвярджаецца па нарастаючай. З артыстаў імправізавала тут адна Рэната Літвінава… Рэната, якая на пачатку сваёй кар'еры заўсёды патрабавала: «Трэба ведаць тэкст!..» І да сваіх тэкстаў яна ставіцца вельмі пільна!.. Але ў яе свая асаблівая арганіка, яна свабодна існуе і нічога не баіцца. У параўнанні з акцёрскай масай, яна вельмі вольная ў сваім акцёрскім праяўленні. Мне падабаюцца яе імправізацыі. Але часам яны бываюць празмерныя, і іх даводзіцца прыбіраць. У гэтым выпадку для мяне было важна, каб яна ўпісвалася ў схему, па якой будуецца фільм. Я не люблю папраўляць акцёраў увесь час. Але бывае, што яны часам імкнуцца дагадзіць рэжысёру, а я люблю, каб яны пачуваліся вольна… Для кожнага персанажа, для кожнай пары мы пакінулі нейкую цікавінку або цікавінкі, якіх няма ў іншых. Каб была сіметрыя і асіметрыя. Адзін гаворыць адно маленькае адхіленне, другі — іншае маленькае адхіленне. А потым усё даводзілася да ладу шляхам мантажу. У гэтым фільме галоўны герой — мантаж…

ПРА ЧОРНА-БЕЛАЕ КІНО

— Я заўсёды хацела здымаць толькі чорна-белае кіно. Калі была плёнка, то каб праяўляць стужку тым, хто не працуе з колерам, — трэба было чакаць. Таму што ўсе здымаюць у асноўным на колер, і машына, куды накіроўвалі на праяўку, працуе спачатку з каляровымі стужкамі. Машыну не спыняюць, пакуль не набярэцца нейкая колькасць чорна-белых стужак для праяўкі, з якімі працуе пара рэжысёраў. І толькі тады праяўляюць чорна-белы матэрыял. Ты яго бачыш з вялікім спазненнем… Але чорна-белае кіно — гэта цуд. Чорна-белы матэрыял вельмі драматычны. І адначасова чорна-белае кіно больш пераканаўча-дакументальнае. І таксама яно больш вытанчанае, у ім больш, можа, штучнасці, але і мастацкасці. Вось калі вы шкляныя ўпрыгажэнні хочаце выдаць за дыяменты ў каляровым кіно — не атрымаецца. Яны будуць выглядаць танна, як падробка. А ў чорна-белым — заззяюць як сапраўдныя каштоўнасці. Гэта таямніца… Чорна-белае кіно — гэта прыгожа.

ПРА ЧАСЫ

— Мастак знаходзіцца ў нейкім часе. Мы заўсёды адлюстроўваем той час, у якім жывём. Для яго ствараем. Мы можам адлюстроўваць часткі

гэтага ўсяго ў сваіх фільмах. Вы думаеце, што час — гэта нешта асобнае, што існуе над намі. Але немагчыма аддзяліць сябе ад часу. Я перажыла розныя часы. І не забываю ні пра якія свае фільмы, і пра тыя, што былі знятыя ў савецкі час. Тады было так: я зрабіла фільм — яго паклалі на паліцу. Але чамусьці далі мне здымаць яшчэ адзін фільм. Добра, я згодна: давайце я ўвесь час вам буду так здымаць… І гэтая аптымістычная звычка ў мяне ўвайшла: я раблю, а далей — як хочуць, абы толькі не рэзалі.

Быў час, калі існаваў моцны ціск на тых, хто робіць кіно. Быў час, калі я адчувала сябе рабой. А зараз не адчуваю. Я бедная, але не раба. Для мяне гэта больш істотна. Падчас перабудовы, калі мы ўсе былі зацюканыя і перапалоханыя, але грошы на кіно працягвала даваць дзяржава. І быў момант, калі грошы давалі, а ідэалогіі не было. Гэты прамежак быў райскі.

Зараз іншы час: мне ніхто не дыктуе, што мне рабіць і як. Але я кажу, што я тады была іншай і засталася іншай. Мяне не разумелі і не разумеюць. І я не лічу, што змянілася. Проста зараз магу рабіць тое, што хачу. Толькі грошы патрэбны. Але гэта больш натуральная праблема для кіно…

ПРА СВАЕ ФІЛЬМЫ

— Я не забываю ні пра якія свае фільмы. Але я не сачу за іх далейшым камерцыйным лёсам. Я іх раблю дасканала да канца і адпускаю…

Ларыса ЦІМОШЫК.

СУЧАСНЫ ТАНЕЦ ПРАВІЦЬ БАЛЬ

У Віцебску адкрыўся XXVI Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі.

Ужо не першы год не толькі ў абласным цэнтры можна адкрыць для сябе сучасны танец. У прыватнасці, 17 лістапада ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь гледачы ўбачылі балет-фантазію «Клетка для папугаяў» у выкананні Пермскага дзяржаўнага тэатра «Балет Яўгена Панфілава» і танц-спектакль «Цэрберы» ад ізраільскай «Кампаніі танца «Фрэска». Апошні напярэдадні афіцыйнага старту фестывалю ўбачылі і жыхары Віцебска. Уразілі прафесійнае майстэрства выканаўцаў, а таксама «міні-сцэна» — канструкцыя, якая часта «хаатычна» рухалася па сцэне канцэртнай залы «Віцебск». Публіка пасля спектакля апладзіравала стоячы. А потым упершыню на фэсце тут жа ў зале любы ахвотны мог пагутарыць з акцёрамі.

Сярод «зорных» калектываў, якія бралі ўдзел у афіцыйным адкрыцці фэсту, быў і Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Балет «Шэсць танцаў», пастаўлены Іржы Кіліянам, чэшскім харэографам і танцоўшчыкам, на музыку Моцарта, крытыкі прызналі сусветным шэдэўрам сучаснай харэаграфіі.

Асноўнай падзеяй свята танца стане конкурс беларускай сучаснай харэаграфіі. Больш як дзесяць калектываў бяруць у ім удзел.

Праходзяць на фэсце і майстар-класы вядучых харэографаў і тэарэтыкаў танца свету для беларускіх танцоўшчыкаў.

24 лістапада стануць вядомыя імёны лаўрэатаў конкурсу, а фэст закрыецца, каб зноў адбыцца ў наступным годзе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

Открытое акционерное общество

«МинскСортСемОвощ»

производит выплату дивидендов по итогам работы за 2012 год с 20 ноября 2013 г. по 30 ноября 2013 г.:

- акционерам – работникам Общества – перечислением на счета, открытые для выплаты заработной платы в ОАО «Белагропромбанк»;
- акционерам, неработающим в ОАО «МинскСортСемОвощ», – перечислением на лицевые счета, открытые в отделениях АСБ «Беларусбанк» г. Минска;
- акционерам – юридическим лицам – перечислением на их расчетные счета.

Справки по телефону 222 96 75.

УНН 600052664

Управляющий в деле о банкротстве ЧПУП «ВелесКрафт» (УНП 400083132, г. Калинковичи, дело № 37-8Б\2013 от 02.04.2013 в Хозяйственном Суде Гомельской области) Журов Вячеслав Алексеевич извещает, что свидетельство о государственной регистрации частного производственного унитарного предприятия «ВелесКрафт» **считать недействительным.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА без условий по продаже недвижимого имущества

Адрес объекта и его наименование	**Лот № 1** - здание школы, общей площадью 98,4 м² с инвентарным № 631/С-61407, одноэтажное, деревянное, с пристройкой, колодцем **Начальная цена: 111 017 929 рублей без учета НДС 20%.** Объект расположен по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 56. **Лот № 2** - здание пищеблока, общей площадью 60,5 м² с инвентарным № 631/С-61409, одноэтажное, кирпичное, с двумя саражами, уборной. **Начальная цена: 108 611 348 рублей без учета НДС 20%.** Объект расположен по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 56А. **Лот № 3** - здание сезонного проживания, общей площадью 107,5 м² с инвентарным № 631/С-61408, двухэтажное деревянное. **Начальная цена: 84 408 910 рублей без учета НДС 20%.** Объект расположен по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 54А. Объекты расположены в водоохраной зоне Вилейского водохранилища. Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. Все желающие могут ознакомиться с документацией и объектом в ОАО «Алая заря»
Порядок оплаты	Победитель аукциона возмещает организатору фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации, которые сообщаются участникам до начала аукциона. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 10 календарных дней после проведения аукциона .
Сумма задатка	10% от начальной цены на р/с 3012190930030 в ЦБУ 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»
Продавец	ОАО «Алая заря» Минская обл., Вилейский р-н, Кривосельский с/с, д. Ерхи, ул. Новая, 9 тел.: 8(01771) 7-43-32, 7-43-35, 7-43-33
Организатор аукциона	Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность
Информация по земельным участкам	**Лот № 1** расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000183, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,0843 га, назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения; **Лот № 2** расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000184, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,1039 га, назначение – земельный участок для размещения объектов общественного питания (для обслуживания здания пищеблока); **Лот № 3** расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000181, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,0582 га, назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (обслуживания здания дома сезонного проживания);
Конечный срок и адрес приема заявок	**20.12.2013 до 16⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11, Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20; 8 044 710 74 60
Дата, время и место проведения аукциона	**27.12.2013 в 15⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11, Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»
Условия проведения аукциона	Продавец имеет право отказаться от проведения аукциона не позднее чем за три дня до даты его проведения.

БЕРЕЗИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Березинского района Минской области (далее Продавец)

проводит открытый аукцион по продаже двух земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№	Адрес земельного участка, кадастровый №	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)
1	Земельный участок № 1, Березинский район, д. Снуя, 620480408201000024	0,25 га	Электроснабжение	5590908	3320000	332000
2	Земельный участок № 2, Березинский район, д. Замок, 620480403201000019	0,2159 га	Электроснабжение	5590908	3727298	372700

** Примечание: земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.*

Задаток перечисляется на р/с № 3604060201908 в ЦБУ № 602 филиал № 612 АСБ «Беларусбанк» код 810 УНН 600040856, ОКПО 4431777.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому Лоту).

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 24.12.2013 года в 10.00 по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, д. 39 (зал заседаний).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно (кроме субботы и воскресенья) до 17.00 по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, д. 39 (кабинет управляющего делами). Прием заявлений прекращается за три дня до начала аукциона.

Контактный телефон: (8 017 15) 5 55 81.

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА №№ 0413006, 0440787, 0461304, 0363517; страховой полис по гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР № 2860273; квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ №№ с 3897941 по 3897945, 4106390, 3247721 **считать недействительными.**

УНП 100357923

Утерянный бланк строгой отчетности «1СУо Квитанция о приеме денежных средств по обязательному страхованию строений» серии КО в количестве 1 шт. № 3033869 в представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.**

УНН 600013344

Утерянный бланк строгой отчетности «Страховое свидетельство обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВР, в количестве 1 шт. № 1529053 в представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.**

УНН 600013344

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 декабря 2013 года проводит 17-ый от 12.09.2013, 21-ый от 17.10.2013 и 22-ой повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности на 23-ем аукционе

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи	Сумма задатка (бел. руб.)
407	АЦ-5,5-375 (автоцистерна) с/о 8307075 на Урал-375 ш. 404131 дв. 939896 1983 г. 4 кат. 4 260 км 23,5 м/ч	г. Слуцк, в/ч 01851	40 000 000	4 000 000
449	Грузовой Урал-4320 ш. 018157 дв. 505450 1983 г. 4 кат. 154155 км	г. Борисов, в/ч 20193	45 000 000	4 500 000
451	Грузовой КамАЗ-4310 ш. 0039525 дв. б/н 1987 г. 4 кат. 159398 км	г. Борисов, в/ч 20193	55 000 000	5 500 000
390	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711022Б дв. 064827 1987 г. 4 кат. 4 348 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
391	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711001Б дв. 053749 1987 г. 4 кат. 1 877 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	110 000 000	11 000 000
392	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711024Б дв. 065307 1987 г. 4 кат. 1 864 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	110 000 000	11 000 000
395	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110057087 дв. 488045 1978 г. 4 кат. 606 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
396	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68412208Б дв. 230604 1984 г. 4 кат. 2278 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
398	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110107192 дв. 001023 1979 г. 4 кат. 1387 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
420	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110157084 дв. 492662 1978 г. 4 кат. 3 432 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
421	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711030Б дв. 065158 1987 г. 4 кат. 6 895 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
422	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68410206Б дв. 872352 1984 г. 4 кат. 733 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
423	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711028Б дв. 065080 1987 г. 4 кат. 6 431 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
424	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68907044 дв. 763902 1989 г. 4 кат. 2 550 км КР-2004 г	г. Старые Дороги, в/ч 48668	175 000 000	17 500 000
431	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110608051 дв. 918674 1984 г. 4 кат. 4 409 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
432	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110028084 дв. 089533 1988 г. 4 кат. 2 499 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
433	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68610207Б дв. 06521 1986 г. 4 кат. 4 655 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
435	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110057089 дв. 486747 1978 г. 3 кат. 5 803 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
436	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110127181 дв. 494791 1985 г. 3 кат. 3 074 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
437	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110098084 дв. 089032 1988 г. 4 кат. 2 482 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
438	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. без номера дв. 762554 1987 г. 4 кат. 526 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
468	Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 590412 дв. 053583 1987 г. 4 кат. 35594 км	г. Брест, в/ч 92504	35 000 000	3 500 000
469	Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 599341 дв. 056 1987 г. 4 кат. 45756 км	г. Брест, в/ч 92504	40 000 000	4 000 000
472	Грузовой Урал-43203-1012 ш. 077803 дв. 096289 1987 г. 4 кат. 158140 км	г. Бобруйск, в/ч 20392	40 000 000	4 000 000
474	Мастерская ПМ-2-70 № Н351020 1982 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 078 на ЗИЛ-131 1982 г. ш. 435189 дв. 366460 – МРС-АР № 82091 на ЗИЛ-131 1982 г. ш. 489981 дв. 652140 – ТА-5 № Н351020 на ЗИЛ-131 1982 г. ш. 461786 дв. 506762 с ЭСБ-4ВЗ-1-М1 № СЛ23607147 на пр.1-П-1,5 1982 г. ш. 170337 – АДБ-309У1 № 4761 на пр.1-П-2,5 1981 г. ш. 1234	г. Минск, в/ч 63755 (место нахождения г. Гомель, в/ч 63604)	105 000 000	10 500 000
475	Мастерская ПМ-2-70 № Н351017 1982 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 277 на ЗИЛ-131 1982 г. ш. 506724 дв. 736923 – МРС-АР № 062 на ЗИЛ-131 1985 г. ш. 654449 дв. 464417 – ТА-5 № Н351017 на ЗИЛ-131 1982 г. ш. 476895 дв. 585679 с ЭСБ-4-ВЗ-1-М1 № СЛ23607152 на пр.1-П-1,5 1982 г. ш. 169877 – АДБ-3120У1 № 4578 на пр.1-П-2,5 1982 г. ш. 1493	г. Минск, в/ч 63755 (место нахождения г. Гомель, в/ч 63604)	105 000 000	10 500 000
476	Мастерская ПМ-2-70 № Р35139 1984 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 198 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 541303 дв. 911897 – МРС-АР № 84069 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 575716 дв. 086567 – ТА-5 № Р35139 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 582599 дв. 120532 с ЭСБ-4ВЗ-1-М1 № ТИ23628446 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 201284 – АДБ-3120У1 № Р35139 на пр.1-П-2,5 1984 г. ш. 0695	г. Минск, в/ч 63755 (место нахождения г. Гомель, в/ч 63604)	105 000 000	10 500 000
477	Мастерская МРМ-М1 № 022 на ЗИЛ-131 ш. 820757 дв. 241233 1987 г. 2 кат. 4321 км	г. Минск, в/ч 63755 (место нахождения г. Гомель, в/ч 63604)	72 000 000	7 200 000
478	Грузовой Урал-4320 ш. 068822 дв. 022890 1987 г. 4 кат. 136585 км	г. Гродно, в/ч 05733	40 000 000	4 000 000
479	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 028198 дв. 641040 1984 г. 4 кат. 8761 км	г. Гродно, в/ч 05733	50 000 000	5 000 000
480	Шасси АТС-59Г № 62Т4452БЛ ш. 11330467 дв. 714079Е 1977 г. 3 кат 152 км 30 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
481	Шасси АТС-59Г № 5ВR1268БЛ ш. 1141247 дв. 7АЕ118Е 1985 г. 3 кат 136 км 15,2 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
482	Шасси АТС-59Г № 5ВR1270БЛ ш. 11412419 дв. 7АЕ1161Е 1985 г. 3 кат 167 км 39 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
483	Шасси АТС-59Г № 5ВТ1168БЛ ш. 11412029 дв. 7АЕ1026Е 1985 г. 3 кат 2122 км 305 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
484	Шасси АТС-59Г № КВ0123БЛ ш. 11412431 дв. 7АЕ1227Е 1986 г. 3 кат 128 км 14 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
485	Шасси АТС-59Г № Е08ТБЛ774 ш. 11431431 дв. 7АG0713Е 1987 г. 3 кат 4171 км 199 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
486	Шасси АТС-59Г № Е12ТБЛ1064 ш. 201143228 дв. 7АG10127Е 1987 г. 3 кат 144 км 41,7 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
487	Шасси АТС-59Г № ЕНТБП325 ш. 11432036 дв. 7АG0964Е 1987 г. 3 кат 143 км 500 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
488	Шасси АТС-59Г № 67Т4834БП ш. 11331276 дв. 7W0791Е 1977 г. 3 кат 129 км 30 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
489	Шасси АТС-59Г № Е08ТБЛ789 ш. 11431441 дв. 7АG10725Е 1987 г. 3 кат 32 км 12.8 м/ч	г. Кричев-2, в/ч 33190	70 000 000	7 000 000
490	Шасси АТС-59 ш. 11631228 дв. 7Р1272Е 1974 г. 4 кат 329 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	70 000 000	7 000 000
491	Шасси АТС-59 ш. Е08ТБЛ790 дв. 11431944 1987 г. 4 кат 108 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	70 000 000	7 000 000

Условия и порядок проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 217 от 19 ноября 2013 г.

УНП 101099370

■ Сёння — Сусветны дзень некурэння

РАК ЛЁГКАГА НА РАННЯЙ СТАДЫІ АМАЛЬ НЕ ВЫЯЎЛЯЕЦЦА

Тытунь — самы распаўсюджаны і даказаны канцэраген для чалавека. Тытунёвы дым — гэта звыш 4 тысяч хімічных злучэнняў: канцэрагенаў і злучэнняў, якія спрыяюць фарміраванню канцэрагенаў у арганізме; ядаў (нікацін, мыш'як, сінільная кіслата і інш.); радыеактыўных рэчываў (палоній, свінец, вісмут).

— Моладзь, якая захапляецца жуйным і нюхальным тытунём, нават не здагадваецца, што прывыканне ў такіх выпадках развіваецца хутчэй, чым падчас звычайнага курэння, — расказвае **галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Іван КАНАРАЗАЎ.** — Пры курэнні цыгарэт залежнасць развіваецца на працягу аднаго-двух гадоў, пры ўжыванні жуйных сумесяў — літаральна за 2-3 месяцы. Па-другое, курыльныя сумесі, апрацаваныя наркатычнымі рэчывамі (кшталту спайсу), змяшчаюць у сваім складзе хімічныя рэчывы, якія спрыяюць большаму засваенню шкодных рэчываў. Нарэшце, нярэдка моладзь спрабуе перамагчы адну залежнасць з дапамогай ужывання іншых наркатычных рэчываў. Гэта толькі ўскладняе сітуацыю.

Курэнне дакладна звязана з развіццём розных захворванняў — хранічных абструктыўных захворванняў лёгкіх, сардэчна-сасудзістых захворванняў (ішэмічная хвароба сэрца і артэрыясклероз перыферычных сасудаў), парушэнняў мазгавога кровазвароту (інсульты), злаякасных новаўтварэнняў. Курэнне з'яўляецца асноўным фактарам рызыкі для такіх відаў раку, як рак лёгкага, гартані і ротавай поласці, дапаможным фактарам — для раку насавой поласці, страваводу, страўніка, падстраўнікавай і малочнай залозы, ныркі, мачавога пузыра, шыйкі маткі, кішэчніка.

Паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, 30 працэнтаў усіх пухлін і гібелі ад раку звязаны з курэннем.

Канцэрагенныя фактары найбольш інтэнсіўна дзейнічаюць на лёгкія курца, аднак з макротай і слінай трапляюць у страўнікава-кішачны тракт і ўздзейнічаюць на ўвесь арганізм. Некаторыя крыніцы прыводзяць нават такое параўнанне: выкурванне пачка цыгарэт у дзень адпавядае выкананню 365 рэнтгенаўскіх здымкаў у год!

— Ад раку лёгкага ў свеце паміраe больш людзей, чым ад іншага віду раку, — кажа **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава па хірургіі Віктар КАХНЮК.** — У Беларусі рак лёгкага ў мужчын знаходзіцца на першым месцы ў структуры анкалагічнай захваральнасці. За апошнія 10 гадоў на рак лёгкага захварэлі каля 40 тысяч мужчын. У 35 тысяч з іх прычынай хваробы стаў тытунь. Паступова ў краіне расце і колькасць жанчын, у якіх дыягназ раку абумоўлены курэннем.

На ранніх стадыях рак лёгкага можа ніяк не праяўляцца. Звычайна пацыент звяртаецца са скаргамі да ўрача на тым этапе, калі хвароба ўжо моцна запушчана. Таму, у адрозненне ад некаторых іншых відаў раку, рак лёгкага найчасцей прыводзіць да летальнага зыходу.

Сёння па раку лёгкіх нідзе ў свеце не прымаюцца ніякія спецыяльныя меры, скіраваныя на яго ранняе выяўленне. Проста пакуль дакладна невядома, што менавіта трэба для гэтага рабіць. Пры гэтым вядома, што эфектыўнасць выяўлення раку лёгкага падчас правядзення рэнтгенаграфіі даволі нізкая. Самым інфарматыўным з'яўляецца такі метад абследавання, як камп'ютарная тамаграфія. Аднак гэта не той метад абследавання, які можна рэкамендаваць выконваць з той ці іншай частатой з мэтай прафілактыкі. Звычайна паміж пярвічным зваротам хворага са скаргамі і момантам правядзення вышэйназванага даследавання праходзіць пэўны час, што таксама не на карысць ранняму выяўленню.

— Калі вы не будзеце курыць, ваша жыццё будзе даўжэйшым на 10-20 гадоў, у вас зменшыцца рызыка развіцця шэрагу захворванняў, вашы блізкія будуць дыхаць чыстым паветрам і ў вас будуць здаровыя дзеці, — адзначае **ўчастковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна СКАРАХОД.** — Кансультацыю і спецыялізаваную дапамогу па пазбаўленні нікацінавай залежнасці можна атрымаць у наркалагічных дыспансерах, па тэлефоне даверу 261 02 19. Неабходна ўсведамляць, што нікацін — наркатычнае рэчыва. А значыць, некаторыя курцы падчас спробы адмовіцца ад дрэннай звычкі маюць патрэбу ў спецыяльнай дапамозе — псіхатэрапеўтычных, медыкаментозных сродках.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПРА АНКАМАРКЁРЫ

Штогод колькасць анкалагічных хворых у Беларусі прырастае прыкладна на тысячу. Спецыяльных анкамаркёраў для вызначэння таго ж раку лёгкіх сёння не існуе. Наогул здача аналізу крыві на анкамаркёры раку некаторых відаў лакалізацыі выяўляе ў першую чаргу запаленчы працэс, а не дае канкрэтны адказ на пытанне, ці ёсць у чалавека рак. Высокія значэнні пры такім абследаванні ўказваюць на неабходнасць даабследавання.

ПРА СКРЫНІНГ

У нашай краіне не праводзіцца скрынінг (выяўленне сімптомаў у людзей, якія не маюць ніякіх клінічных праяў) ні па адной лакалізацыі раку. Расходы на такія патрэбы, як правіла, перавышаюць расходы на лячэнне. Сучасныя методыкі прымяняюцца ў рэспубліцы для правядзення толькі пілотных скрынінгавых праектаў (у пэўных рэгіёнах сярод пэўных груп насельніцтва) па выяўленні раку шыйкі маткі, малочнай залозы, прастаты, тоўстага кішэчніка.

■ Футбол

ФРАНЦУЗЫ КАЖУЦЬ УКРАІНЕ «АРЭВУАР»

Вызначылася апошняя чацвёрка еўрапейскіх зборных, якая прэзентуе Стары Свет на чэмпіянаце свету па футболе-2014.

Яшчэ напярэдадні плэй-оф вынікі лёсавання вызначылі зборнай Украіны, напэўна, самага небяспечнага апанента — каманду Францыі. Здавалася, шанцаў на ўдзел у бразільскім першынстве свету ў «жоўта-блакітных» няшмат. Аднак мужныя хлопцы Міхаіла Фаменкі падарылі ўсяму футболу сенсацыю і ўпэўнена перайгралі Францыю дома (2:0). Каб убачыць сонечную Бразілію, нашым паўднёвым суседзям заставалася згуляць паспяхова ў

Зборная Украіны так і не здолела стрымаць французскі напор.

паўторным паядынку, чаго ўкраінцы не зрабілі і саступілі з разгромным лікам 0:3. «Падобныя перамогі і называюць магіяй футбола, — зазначыў пасля сустрэчы Дзідзье Дзешам, галоўны трэнер зборнай Францыі. — Мы саступілі першы матч, але здолелі ўсё паправіць. Футбалісты зрабілі ўсё правільна». Астатнія гульні прынеслі наступныя вынікі: **Харватыя** — Ісландыя — 2:0 (першы матч — 0:0), Швецыя — **Партугалія** — 2:3 (0:1), Румынія — **Грэцыя** — 1:1 (1:3). Лёсаванне фінальнага раўнда першынства свету адбудзецца 6 снежня ў бразільскім гарадку Мата-ды-Сан-Жуан. Адзіным прадстаўніком СНД на турніры будзе зборная Расіі.

Тарас ШЧЫРЫ

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. № 33 (491)

МУРАЯ — ДРЭВА ЯПОНСКІХ ІМПЕРАТАРАЎ

Яго гісторыя ахутана таямніцамі і легендамі. Вядома, што на аснове лісця, кветак і пладоў расліны жрацы рабілі «эліксір жыцця» для егіпецкіх фараонаў. Японскаму імператару дастаткова было кожны дзень удыхаць водар кветак мураі, каб быць здаровым, прыгожым, разумным.

Мурая адносіцца да нешматлікіх раслін, якія круглы год пакрыты духмянымі кветкамі і яркімі пладамі, што доўга не ападаюць. Дрэўца само фарміруе прыгожую крону і не мае патрэбы ў асаблівым доглядзе. Усе часткі расліны валодаюць гаючымі ўласцівасцямі, якія выкарыстоўвае не толькі тыбецкая медыцына, але і сучасная фармацэўтыка.

Мурая — з сямейства рутавых (Rutaceae). Да гэтага ж сямейства адносяцца ўсе вядомыя нам цытрусавыя.

Гэта, мабыць, адна з самых непатрабавальных раслін, здольных цярпліва пераносіць сухое паветра гарадскіх кватэр.

Духмяныя белыя кветкі і дробныя круглыя плады нагадваюць пра сваяцтва з цытрусавымі, але эфектнае глянцавае цёмна-зялёнае перыстае лісце робіць аблічча расліны індывідуальным, запамінальным. А яшчэ ў яго вельмі прыгожая белая кара. У прыродзе або ў зімовым садзе пры спрыяльных умовах расліна можа дасягаць 3 м у вышыню. У пакоях гэта, як правіла, дрэўца вышынёй 1-1,4 м. Характэрная асаблівасць мураі: усе парасткі з бутонамі спыняюць рост да таго часу, пакуль не адрастуць новыя

Мурая мяцёлчатая

галінкі, якія дадуць новыя кветкі. Менавіта таму цвіценне расліны бесперапыннае, а яе крона не мае патрэбы ў абрэзцы і карэкціроўцы. Садовыя нажніцы патрэбны толькі для выдалення выпадкова зламаных галінак. Нават парасткі, з якіх апалі плады, не трэба адразаць: праз некалькі дзён на іх з'явяцца новыя бутоны. Увесь догляд расліны заключаецца ў тым, каб улічыць яе горнае паходжанне.

Мурая не любіць лішняй вільгаці ў глебе, спёкі і прастору для карнёў. Узімку яна выдатна расце на прахалодным падаконніку пры тэмпературы 17—19°С. Улетку добра адчувае сябе на свежым паветры, калі, вядома, яе злёгку прыцяняць ад прамых сонечных прамянёў, якія могуць выклікаць апёкі на лісці. Гаршчок для мураі павінен быць даволі цесны, глеба добра дрэнаваная і не вельмі ўрадлівая, а вільгаці — роўна столькі, каб земляны ком не высах цалкам. Адзінае, што мурая сапраўды любіць, — гэта яркае святло. Але падсветка ёй патрэбна толькі ў працяглы цёмны перыяд, напрыклад, у пахмурным лістападзе.

У еўрапейскіх батанічных садах і ў калекцыях аматараў звычайна вырошчваюцца два віды мураі, хоць у прыродзе вядома каля 20 прадстаўнікоў гэтага роду.

Мурая мяцёлчатая (або чужаземная) — найстарэйшы від, уведзены ў пакаёвую (аранжарэйную) культуру. Менавіта яе і называюць у літаратуры кітайскім міртам, або духмянай мурая. Цвіценне працягlае. На адной расліне адначасова можна бачыць бутоны, кветкі і маладую завязь. Аранжава-чырвоныя ягады, якія спеюць праз 1,5-2 месяцы, ядомыя. На радзіме з іх гатуюць жэле і мармелад. Акрамя ягад, выкарыстоўваюць кару: сцёртая ў парашок, яна служыць пудрай мясцовым модніцам, а з лісця і кветак атрымліваюць духмяны эфірны алей.

Другі папулярны від мураі — мурая Кеніг (Murraya koenigii) — рэдка сустракаецца ў калекцыях аматараў пакаёвых раслін, але вядомы значна шырэй, чым папярэдні. Да-

Мурая Кеніг

статкова вымавіць яго мясцовую назву, каб зразумець прычыну папулярнасці. На радзіме гэтую расліну называюць «дрэвам Кары». Менавіта яе духмянае лісце складае аснову знакамітых рэзкіх сумесяў кары, без якіх у Паўднёва-Усходняй Азіі не абыходзіцца ні адзін абед. Знешне два віды лёгка адрозніць: лісточкі мураі кеніг больш падоўжаныя, плады цёмна-сінія або чорныя.

Размножыць мураю прасцей за ўсё насеннем, займеўшы хоць бы пару плодзікаў, якія змяшчаюць па дзве семачкі. Усходжасць у іх добрая — пры ўмераным паліве праз 25-30 дзён абавязкова з'явяцца парасткі. Можна размнажваць чаранкамі, якія рэжуць з падгадаваных галінак. Чаранок бяруць з 3-4 пупышкамі ранняй вясной (калі расліна знаходзіцца ў стане спакою). Зрэзаць трэба наўскасяк пад пупышкай. Зрэз павінен быць гладкім, без няроўнасцяў. Лісце не выдаляюць, толькі напалову памяншаюць кожны лісточак. Чаранкі адразу, не падсушваючы, змяшчаюць у парнікі з ніжнім падагрэвам у вельмі дробны пясок, дзе і трымаюць да з'яўлення парасткаў. Укаранёныя чаранкі высаджваюць у грунт, які складаецца з 1 часткі пяску, 2 частак лісцявой, 6 частак лёгкадзярновай зямлі, і вырошчваюць з добрым дрэнажом(!), пры добрым паліве і ўмеранай тэмпературы.

Паколькі ў прыродзе мурая сустракаецца ў вільготных субтрапічных лясах Паўднёва-Усходняй Азіі, то ўзімку лепш трымаць яе пры тэмпературы +16 +18 °С і часцей аглядаць лісце, паколькі ў памяшканні на ім часта заводзіцца шчытоўка. Паліў як летам, так і зімой добры, але толькі пасля падсыхання земляного камяка прыкладна на траціну. Ваду з паддона зліваюць адразу ж. Наогул, з-за асаблівасцяў цвіцення мурая не мае патрэбы ў стане спакою.

Зацвітаюць маладыя расліны ўжо праз год-паўтара, але растуць павольна, ва ўзросце дзесяці гадоў ледзь дасягаючы паўметра.

З памылак, якія найбольш часта сустракаюцца пры вырошчванні дрэўца японскіх імператараў, можна назваць заглыбленне каранёвай шыйкі пры перасадцы і занадта часты паліў. Па меры росту каранёвай сістэмы расліны перасаджваюць у крыху большы посуд. Дарэчы, мурая ў Краіне ўзыходзячага сонца лічыцца адной з лепшых раслін для стварэння бансая. І сапраўды, дрэўца, якое пастаянна цвіце і пладаносіць, да таго ж здольна напоўніць непаўторным водарам нават вялікі пакой, выглядае вельмі эфектна.

«ЧАРОЎНЫЯ РЭЧКІ!»

Рэкі і азёры Беларусі ў легендах і паданнях



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Луг. 7. Мелкае. 8. Рака. 9. Свіцязянкі. 12. Мора. 13. Крывое. 14. Плён. 17. Ліпна. 18. Гайна. 19. Доўжа. 20. Дзеяч. 22. Ялік. 23. Эсэіст. 26. Шнур. 27. Каналізнка. 29. Заяц. 30. Эрыдан. 31. Цна.

Па вертыкалі: 2. Улас. 3. Венцер. 4. Памяло. 5. Бяздонка. 6. Крухмал. 10. Крапіўнік. 11. Кляйменне. 15. Радар. 16. Згода. 19. Дзявіча. 21. Чарніца. 24. Стаўры. 25. Святая. 28. Азон.

Па гарызанталі: 1. «Зялёны ..., як скінуць вокам,\\Абрусам пышным і шырокім\\Абапал Нёмна рассцілаўся». (Я.Колас. «Новая зямля»). **7.** Не глыбокае, а ... . Назва возера, якое знаходзіцца ў Бешанковіцкім раёне: паданне апавядае пра бойку ля гэтага возера Бога з д'яблам. **8.** Прыткая ... берагі падрываець (прык.). **9.** Міфічныя насельніцы возера, што ў Карэліцкім раёне: легенда сведчыць, што ў іх ператварыліся жанчыны горада Свіцязь, затопленага вадой. **12.** Герадотава ... . Так называўся вялізны вадаём, які некалі існаваў на месцы сучаснай Прыпяцкай нізіны. **13.** Вялікае возера на Ушаччыне; з такой назвай на Віцебшчыне існуе восем азёр, на Гомельшчыне — пяць і на Магілёўшчыне — тры возеры. **14.** Вынік старанняў, дасягненне. **17.** Возера ў Сенненскім раёне, у басейне ракі Чарнагосніца. **18.** «Чароўныя рэчкі!\\\Іх назвы звіняць і шумяць у вушах:\\І Проня, і ..., і Ольса,\\І Бобр, і Уса, і Уша». (П.Панчанка. «Бярэзінскі запаведнік»). **19.** Возера на Пастаўшчыне; «Мяне цягнула да Пастаў,\\хацелася пабыць ля ...». (Ул. Дубоўка. «І колькі б дзе ні вандраваў»). **20.** Чалавек, які праявіў сябе ў якой-небудзь грамадскай дзейнасці. **22.** Невялікая шлюпка. **23.** Той, хто піша эсэ. **26.** Чарада птушак. **27.** Возера ў Шумілінскім раёне, у басейне р.Обаль; такую ж назву мае пеўчая птушка сямейства ўюрковых. **29.** У паляўнічага часта і ... пудовым бывае (прык.). **30.** Так у Сярэднявеччы называлі Заходнюю Дзвіну. **31.** Рака, левы прыток Прыпяці; недалёка ад упадзення ... ў Прыпяць, на гары, жыў, як сведчаць паданні, старажытнарымскі паэт Авідзій.

Па вертыкалі: 2. Аўлас, або ... . Беларускі святы, апякун статка, прысвятак якога адзначалі ў лютым. **3.** Рыбалоўная сетка ў выглядзе нацягнутага на абручы мяшка. **4.** Венік з сасновых, яловых галінак, надзеты на доўгую палку. **5.** ..., або Бяздоннае. Возера ў Слонімскім раёне; з ім звязана паданне пра лютага пана, які кінуў у возера малое дзіцятка. **6.** Мучністае рэчыва, якога шмат у бульбе. **10.** Зараснік крапівы. **11.** Выпальванне знака на скуры жывёлы. **15.** Легендарны князь, якому паданне прыпісвае ўзнікненне ракі Заходні Буг і пабудову Камянецкай вежы. **16.** Аднадумнасць. **19.** Возера на Полаччыне; паводле падання, у гэтым возеры затанула шмат дзяўчат, якія ехалі па лёдзе на санках на вяселле. **21.** Чорна-сіняя лясная ягада; аналагічна на Міншчыне называюцца тры ракі і па адной на Магілёўшчыне і Гродзеншчыне, а на Віцебшчыне ёсць возера з такой назвай. **24.** ... і Гаўры. У беларускай міфалогіі — два сабакі легендарнага князя Бая, дзякуючы якім узніклі дзве вялікія беларускія рэкі — Дняпро і Дзвіна; паводле падання, ... і Гаўры былі пахаваны на Расоншчыне, ля берага возера Дрыса. **25.** ... Вялікая рака; так некалі называлі ў народзе раку Вілію. **28.** Газ з рэзкім пахам; ужываецца для ачышчэння вады, паветра.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

УСМІХНЕМСЯ

Мастак-абстракцыяніст не памятае, дзе ў яго карціна, а дзе ён пэндзаль выціраў.

— Як называецца рэчыва, падчас прыёму якога мозг атрафіруецца і перастае адказваць за свае дзеянні?

— Семачкі!

Калі жонка выходзіла за мяне замуж, яна паабяцала, што ўсё жыццё будзе кахаць толькі аднаго чалавека. Але потым высветлілася, што гэты чалавек — яе мама.

— Я сыходжу ад цябе: ты вечна падколваеш мяне з-за лішняй вагі!

— Спыніся! Падумай аб нашым дзіцяці!

— Аб якім дзіцяці?

— Дык ты не цяжарная?

Камп'ютар — гэта самае сапраўднае зло! Але калі яго выключыць, тут жа актывізуюцца два новыя — халадзільнік і тэлевізар.

— Вовачка, як называецца свойская жывёла, чыё мяса ты звычайна ясі?

— Соя.

caricatura.ru

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.48	17.02	8.14
Віцебск —	8.43	16.46	8.03
Магілёў —	8.38	16.52	8.14
Гомель —	8.28	16.56	8.28
Гродна —	9.02	17.19	8.17
Брэст —	8.56	17.26	8.30

Месяц

Поўня 17 лістапада. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Міхаіла, Рафаіла.*

К. *Марыі, Рэгіны, Альберта, Кандрата, Яна.*

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +6..+8°C	КІЕЎ +8..+10°C	РЫГА +6..+8°C
ВІЛЬНЮС +8..+10°C	МАСКВА +1..+3°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +4..+6°C

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Даты | **Падзеі** | **Людзі**

Міжнародны дзень адмовы ад курэння. Адзначаецца ў трэці чацвер лістапада ў многіх краінах свету па ініцыятыве Міжнароднага таварыства анколагаў пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Упершыню быў адзначаны Амерыканскім анкалагічным таварыствам у 1977 годзе.

Сусветны дзень тэлебачання. Абвешчаны Генеральнай Асамблеяй ААН 17 снежня 1996 года ў азнаменаванне правядзення першага Сусветнага тэлевізійнага форуму, які адбыўся ў штаб-кватэры ААН 21 лістапада 1996 года.

1831 год — у Лiёне як пратэст супраць паніжэння заробкаў рабочым шаўкаткацкіх фабрык успыхнула паўстанне, на чорным сцягу якога красаваўся знакаміты і сёння лозунг: «Жыць працуючы або памерці змагаючыся» . Нацыянальная гвардыя адмовілася душыць беспарадкі, і праз пару дзён улада ў горадзе перайшла да паўстанцаў. Але праз дзесяць дзён у Лiён увайшлі 36 тысяч салдат, і паўстанне было задушана без якога-небудзь супраціўлення. Гэтае выступленне лiёнскіх ткачоў было кваліфікавана марксістамі як першае ў гісторыі пралетарскае паўстанне, якое, па іх сцвярджэнні, ярка сведчыла пра абуджэнне ў рабочых класавай свядомасці.

1877 год — гэтае вынаходніцтва адкрыла для чалавецтва эру аўдыязапісу. Першы прыбор для запісу і прайгравання гуку — фанограф — быў вынайдзены Томасам Эдысанам у гэты дзень у 1877 годзе. Фанограф уяўляў сабой цыліндр, пакрыты алавянай фольгай. Гук запісваўся на носьбіце ў форме дарожкі. Першае, што ўдалося запісаць з дапамогай такой тэхнікі, былі словы з песенькі «У Мэры быў баранчык». Вынаходства фанографа прынесла Эдысану вядомасць. На працягу амаль 40 гадоў ён неаднаразова вяртаўся да яго, удасканальваў апарат. Пасля фанографа з'явіліся грамафон і патэфон.

1926 год — спектаклем «У былыя часы» І. Бэна ў Віцебску быў адкрыты Другі беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2). Трупу тэатра склалі выпускнікі Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, сярод якіх былі Т. Бандарчык, Л. Мазалеўская, П. Малчанаў, С. Станюта, Л. Шынко і іншыя У 1944 г. тэатру прысвоена імя Якуба Коласа, у 1977-м — званне акадэмічнага. Зараз гэта Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа.

Было сказана

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, публіцыст:

«Аптымізм беларускі ў тым, што, калі мы, нягледзячы на ўвесь песімізм і безнадзейнасць мінулага, усё ж жывём, значыць, у нас ёсць падставы гаварыць аб лепшым будучым».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 4968.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 лістапада 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12